**Кастусь Цвірка**

# Бацькаў свет палявы

Выбраныя вершы і паэмы

Мінск
«Мастацкая літаратура»
1994

ББК 84(4Беи)6
Ц28
УДК 882.6-1

*Прадмова Рыгора Барадуліна*

882060000 — 102
Ц ____________________95—94
М 302( 03 ) — 94
ISBN 5 - 340 - 0135425

© К. Цвірка, 1994
© Прадмова. Р. Барадулін, 1994

# КАБ АРАЛЛЁЮ ПАХЛІ АБЛОКІ...

Жыву каля рэха.
*Кастусь Цвірка*

З малых гадоў гучыць мне песня: «У зялёнай дуброве мы начаваць будзем, а вашае ласкі павек не забудзем». Гэта з цёмным разыходзіцца местачковая ўшацкая бяседа. Ужо два словы самі па сабе шумелі, хмялілі, ахіналі спакоем: зялёная диброва! Ды яшчэ болей уразіла мяне, першакурсніка універсітэта, што на самой справе ёсць канкрэтная вёска на Старадарожчыне і ў ёй нарадзіўся паэт, старэйшы за мяне на курс. І паэт гэты таксама на самой справе паэт, бо ўжо друкаваўся ў паважных выданнях. І спадабаўся мне паэт сваёй таварыскай шчырасцю. На пытанне, як вучыцца ён пісаць, паэт адказаў мне, што чытае рэцэнзіі на паэтычныя зборнікі: што й мне параіў рабіць. Было гэта ў двары інтэрната па вуліцы Бабруйскай, аглухлай ад аб'яў пра рух цягнікоў. Побач быў вакзал. А паэтам, які падзяліўся са мной сакрэтам магчымага поспеху, быў Кастусь Цвірка. 28 сакавіка 1934 года, калі верыць апошнім даведнікам Саюза пісьменнікаў і біяграфічным даведкам у багата якіх зборніках паэзіі, у вёсцы Зялёная Дуброва нарадзіўся Кастусь, Аляксееў сын, Цвірка.

Без маленства няма паэта. Усе паэты родам з маленства. У Кастуся Цвіркі маленства прыпала на пасляваййну. Прыпала фармальна. І сам паэт гэта тлумачыць лепей:

Ўсіх нас, пасляваенны вырай,
Дзяцей палёў з душою шчырай,
Што ў Мінск, бы птушкі ад шпакоўняў,
Зляцеліся ад хат, ад ёўняў,
Якісьці крытык незнарок —
Хоць, можа, ён быў і з сумненнем —
Філалагічным пакаленнем
Па блізарукасці парок.
Нас, на каго з гарматных жэрлаў
Глядзела смерць не раз,
Нас, нас,
Чыё маленства — светлы час —
Вайна з жалезнай пашчай зжэрла.

І вайна напамінала паэту пра сябе. Ці калі пісаў пра аднагодкаў, пра герояў і пра ахвяры, ці калі распавядаў пра маці, якая адна пяцёра гадавала, адна гаравала, ці калі ўспамінаў пра бацьку, які сеяў і зерне, і думы — ўзнёсла праспявана ў паэме «Дуб з бярозай звіўся». Паэма традыцыйна нетрадыцыйная, сагрэтая любоўю і роспаччу, населеная роднымі баравінамі і ўрочышчамі, акрыленая зорнымі думамі сейбіта пра сяўбу, пра зямлю-карміцельку, на малой плошчы дала багаты ўраджай на адгуклівасць чытацкага сэрца.

Былі пра вайну радкі балюча-калючыя, як асколкі, былі й дыдактычна-халаднаватыя. Вайна называлася Вялікай Айчыннай. Партызаны, як і ў бальшыне нашае паэзіі, паказваліся толькі абавязкова дадатна. З гадамі асэнсоўваліся падзеі і дзеі, і назаве ўрэшце паэт вайну па-аратайнаму дакладна: «А ў часе Айчыннай Бяды».

Сталенне паэта, сталенне ягонай паэзіі (сталенне, вядома, не ад слова сталь) ішло на зайздрасць няўхільна. Ужо з-пад першых, так бы мовіць, блочных вершаў, на якія хварэлі ўсе аж да пачатку 60-х гадоў, у Кастуся Цвіркі прабіваліся, прарываліся, як трава, як атожылкі, радкі людскай паэзіі.

Разам выпала нам з Кастусём Цвіркам працаваць у студэнцкім атрадзе на ўборцы цаліннага ўраджаю на Кустанайшчыне. Мяcілі гразь у дажджы, смажыліся на стэпавай патэльні, не спалі начамі, пасля пісалі вершы. Пазней даведаліся, што першы ўраджай, услаўлены не толькі намі, пайшоў не на цалінны каравай, а ў асноўным у бравары, бо зерне прэла, гарэла, бо не было куды яго хаваць. І ў цалінных вершах Кастуся Цвіркі былі па-сялянску канкрэтныя радкі накшталт: «А цаліна — хоць зубамі
грызі». І колькі было маладой абыякавасці, маладога ап'янення ў вершы «Двое ў стэпе»:

Вядзе іх вечны клопат,
Дармо, што згублен стан:
У тым баку — Еўропа,
Там — Ціхі акіян.

Дома, у Зялёнай Дуброве, сустракаючы восень,

...клён, не ведаючы выйсця,
Проста валасы рве на сабе.

Дома вясной:

Не пралез бы нават вуж у грэчцы,
Белая — цвіце яна.

Ішоў час, змяняўся час («як зайца поўсць, мяняюцца часы»), змяняліся тэмы і манеры пісьма ў паэзіі, а Кастусь Цвірка быў верны тэме сваёй. Родныя мясціны, аднавяскоўцы, дзень сённяшні беларускай душы і радавод душы гэтае ў часе і ў прасторы. Самі імёны зборнікаў паэта сведчаць пра тое. Пасля размыта агульнаватых двух першых («Такія сэрцы ў нас», «Бягуць раўчукі») зборнікі маюць імёны наўмысна заземленыя, а значыць, грунтоўныя: «Чарназём», «Каласы», «Сцежка дадому», «Хат вячысты дар», «Зялёная Дуброва». Ад прыблізна класічнага верша паэт ідзе да вольнага верша, да разгайданага верша, да прырыфмаванага там-сям верлібра. Памер верша дыктуюць плуг і каса, барана й аграблі, сякера й рыдлёўка, сяўня й грыбазборны кошык. Зборнік «Чарназём» пачынаецца вершам «Чорная скіба». Далей паэт хоча сказаць канкрэтна добрае слова пра сваіх зялёнадуброўцаў: пра Яся Дубовіка, які скора справіць сваё 80-годдзе, пра старога Галляша, першага грыбніка ў вёсцы, пра Антона Цвірку — вялікага пчаляра, пра Бэрнуся Паўловіча — скрыпача-чараўніка, пра Сымона — конюха-філосафа, пра цётку Хрыстыну — найлепшую з лекарак. Кожнаму знайшоў паэт акрыленую характарыстыку. На чатырох вятрах жыве маці паэтава. Верш з чатырох часцін прысвечаны маці. І называецца ён «Чатыры вятры». За далягляд разам з барознамі кладуцца радкі:

О, як гэта проста —
за плугам ісці баразною.
О, як гэта мудра —
за плугам ісці баразною.

Паўтор ворыва, паўтор разганяння барознаў падказвае паўтор радка. А за баразною — «гракі, як грэкі». Гукапіс падказаў параўнанне. Яго можна апраўдаць.

Паэт арэ, косіць. Але ўжо глядзіць на працу хлебароба, якая падарыла яму цэлы свет, па-іншаму. «Азярына — зборнік аблокаў». «Кожная хата — аповесць». Вока нядаўняга хлебароба ўжо нейкім чынам аблітаратурана. Па-добраму. Па высокай меры. Гэта вока, якое засумавала па ўсім родным, бачыць, як сплаўляюць па звечарэлым Нёмане плыты, а

...дзядзька на спіне
Ляжаў і хроп — між зор відаць быў нос!

Гэта вока ўжо адрываецца ад зямлі на помірг, але бачыць кожную дробязь:

Напінаўся Гнедка, у капыт
Капытом цаляў — не трэба пужка!
І плыла з-пад плуга скібы стужка.
Дымная. Па полю. Пад блакіт.

Гнедка — канкрэтны конь, які й гуляе па волі й цягне воз не ў адным вершы. Не ў адным зборніку. Але не дакучае. Проста й чытач пачынае лічыць яго за свайго. Паэт настойліва называе родныя яму мясціны, й чытач міжволі пачынае ў іх арыентавацца. У самім гучанні слоў і туман даўніны, й карані праславянства: Пагон, Перавалокі, Кадаўбы, Хімры. Бо калі паэт падаваўся ў горад па навуку, яму:

Звінелі косы на Крушні,
Каровы рыкалі за Талам.

І, не баючыся выклікаць гнеў крытыкі за непажаданую, аскомінную тэму, паэт упарта піша пра «маленства тупкія сцежкі», пра сцяжыны дадому. Бо гэта не літаратурныя сцежкі з псеўдазолкімі росамі, а вытаптаныя сваімі нагамі ходнікі ў першавытокі, у маленства, якое ніколі не старэе, дзе паэта чакаюць гракі-хадакі, чабарок-чубарок, брусніца-драмуха, хацінка-бярвянка, альшына-крывуля, харашуня-бяроза. Як у казцы, як у песні народнай. Заўважце, як пачціва вяртае паэт народу вобразы, створаныя на ўзор народных. Паэт любіць дакладнае слова тут, якое, не пытаючыся згоды паэтавай, само рыфмуецца са словам кут. (Хто не памятае коласаўскае: «Мой родны кут...»?!)

Я не госць тут.. Тут — мая зямля.
...Я тут — я.
Тут мае і карані і крона.

І яшчэ раднейшым робіцца слова тут (гэта й грукат капытоў каня, які прывёз дадому гаспадара, гэта й грукат у запасныя дзверы — сын дастаўСя з далёкай дарогі) ад таго, што маці

Тут з краскамі ў прыпол

...збірала сонца.

Тут бацькавыя сны
Ўставалі каласамі...

Тут бацька,

...холаду пусціўшы праз парог,
У ранак белы дзверы расчыніў.

Дарэчы, пра бацьку. У паэзіі Кастуся Цвіркі крыху насуперак нашае паэзіі, дзе звычайна ўся ўвага аддаецца маці, моцны, што называецца, бацькавы пачатак. Сын хлебароба ведае, што маці належыць хата, бацьку — поле, якое трэба араць, засяваць, даглядаць, Вяртаючыся дадому, да працы хлебароба, паэт вяртаецца ў бацькаў свет.

Зноў вярнуўся я ў бацькаў свет палявы —
У першабытнасць дрэў і травы.

Дрэвы садзіў бацька, дрэвы пілаваў бацька, дрэвы траляваў бацька. Траву касіў бацька.

Кола бацькавага воза пакінула след не толькі на зямлі. І сыну блізкі «бацькаўскі свет каляінны», сына вабіць «бацькаў высокі свет». У трох вымярэннях свет. Паэт помніць сваіх зялёнадуброўцаў. Нават не помніць, а жыве сярод іх,— нібыта й не ад'язджаў ніколі з Зялёнае Дубровы. І верыш радкам паэта, калі ён звяртаецца да землякоў:

І пра кожнага з вас,
калі ў мяне толькі хопіць сілы і таленту,
я напішу яшчэ — абавязкова! —
па самай светлай паэме!

І маленькімі толькі памерам паэмамі гучаць вершы «Пра старую Адэлю», «Дзядзька Адам», не кажучы ўжо пра ўласна паэмы «Дзе дуб з бярозай звіўся», «Дома». Калі паэт гаворыць пра роднае, святлеюць словы ў ягоных наўмысна ўпірлівых радках. І сам паэт святлее. Святло перадаецца святлом.

Ад ног рагулі —
о светлы край! —

Пахне салодзенькім жытам.

У родным светлым краі ўсё жывое. І рэчка Пціч (у адным яе імі колькі ціўкату, чыркання, цёхкату, граю!) як маладзіца:

Ля моста жанкі, падаткнуўшы спадніцы,
За хвалі бярудь яе — мыць ручнікі,
Яна ж вырываецца з рук...

Колькі я ведаю Кастуся Цвірку, ён ніколі не быў раздабрэлым, распаўнелым, ленаватым, а толькі — паджарым, падцягнутым, імклівым і напружана роздумным. Гэтая вонкавасць недзе нейкім чынам выяўляе ўнутраную сутнасць, стан душы. Здаецца, паджарасць, напружанасць, натуральная роздумнасць перадалася й вершам Кастуся Цвіркі. Паэзія Кастуся Цвіркі — паэзія думкі, думкі беларускай, думкі нетаропкай.

Пра навуковую дзейнасць, пра падзвіжніцтва ў фалькларыстыцы, у пачэснай працы вяртання ў лона беларушчыны Адама Міцкевіча, Яна Чачота, Уладзіслава Сыракомлі дый шмат каго яшчэ, пра дапытлівасць даследніцкую Кастуся Цвіркі трэба пісаць асобна. І трэба!

Як пра зялёнадуброўскае ўрочышча, піша паэт пра

Архіў дзяржаўны.
Сховішча вякоў.
Мне лашчыць слых
Папер пажоўклых шолах.
Пыл з папкі здзьмухваю
З усіх бакоў
І ціха адхінаю
Часу полаг.

І тут ён ашчадны селянін: пыл з усіх бакоў здзьмухвае. І ў горадзе паэт-селянін. Клопат яго шпурляе «нібы на арфе, зерне», дамоў са службы ён пускаецца «як распрэжаны конь», яго «трымае яшчэ святлафор на прывязі». Толькі аратай можа так спалохацца:

Дзень прапаў у мяне!
Дзень!

Зусім як пра сваіх вяскоўцаў, піша паэт пра беларусаў па крыві й па духу сваім.

Лабаты Зан.
Міцкевіч задумённы.
Жывы рухавы карантыш —
Чачот.
Дамейка. Слізень...

Яны, землякі па зямлі беларускай, кіруюць думкамі й памкненнямі паэта, вучаць дбаць пра хлеб духоўны. Бо ў роднай паэтавай хаце

Хлеб мясілі ў дзяжы,
у печы яго, як добрага князя,
мясцілі.

І сумна паэту зазначаць:

Ад хлебаробаў адно засталося ў нас хіба:
тое, што хлеб, як і некалі,
есці мы ўмеем!

І дбае паэт Кастусь Цвірка пра хлеб надзённы і пра хлеб духоўны, хоча, каб

Аблокі раллёю пахлі.

*Рыгор Барадулін*

# ВЕРШЫ

## ЛІПЕНЬ

Можа, ніцма ўпадзеш ты ў густую траву —
Паслухай,
Мо да дрэва прытуліш на міг галаву —
Паслухай,
Мо на хвалі азёрнай ты ляжаш спіной —
Паслухай,
Можа, ноччу ісці будзеш цёплай раллёй —
Паслухай!
Ты пачуеш:
карэнні п'юць вільгаць з нябачных крыніц,
Ты пачуеш,
як кожны лісточак на дрэве звініць,
Ты пачуеш,
як пчолы снуюць і снуюць у паўдня,
Ты пачуеш,
якая над светам стаіць цішыня!
1957

## ЛЕСАВЫ ХМЕЛЬ

Уся ў карэннях сцежка:
Не пазбіваць бы хоць ног.
Вось першая сыраежка
Легла у кошык, на дно.

І ўжо ты па ценях рабых
Блукаеш паміж камлёў,
Находзішся так, што, мабыць,
Да хаты б і ног не даплёў.

Ды стому сваю кладзеш ты
Ў пярыну мяккую — ў мох,
І цела самлела дарэшты:
Не чутна ні рук, ні ног.

Высокая елка толькі
Недзе шуміць ля хмар,
Цярушачы ціха іголкі

На шыю тваю, на твар.

Расы на траве — ні кроплі,
І, мусіць, ад раніцы тут
Стаіць над верасам цёплым
Бясконцы пчаліны гуд.

Так лёгка у смольных хвойках,
І ты на ўсе грудзі свае
З імхоў і брусніц настойку,
Нагрэтую сонцам, п'еш.

А ўстанеш з зялёнай пасцелі,
Ідзеш — трава не трава.
Ад лесавога хмелю
Кружыцца галава.
1957

## ЖУРАВЫ

У хмарках, далёка ад нівы,
Гурт журавоў растае:
Куды вы, куды вы, куды вы,
Шэрыя птахі мае?

Пад вамі, ўся ў лісці апаўшым,
Хутка зямля плыве
З затокай, дзе гнёзды вашы
Стынуць у цёмнай траве.

Дзе ўсё да апошняй сцяблінкі,
Знаёмае ў гэтым краі...
Цяпер тут дажджы безупынку
Скачуць па шэрым куп'і.

А там, пад паўднёваю зоркай,
І сонца, і ў кветках арык.
Дык што ж вы на шэрыя ўзгоркі
Сумны рассыпалі крык?
1957

* * *

Нават дзень, скажы, пражыць мне як
Рукі склаўшы, калі знаю я:
Кінеш зерне — колас зазвініць,
Слова знойдзеш — песня узляціць,
Пакладзеш цагліны ў мур радком —
Блісне дом на сонцы вокан шклом,
Яблынькі пасадзіш рад у рад —
Па вясне сыпне пялёсткі сад.
А растопіш лёд, сагрэеш дол —
Заквітнее ўся зямля наўкол!
1957

## ЗОЛАТА ДЖЭТЫГАРЫ

За Джэтыгарою стэп бясконцы.
Кажуць, тут — аж пот з рабочых ліў —
Некалі з Расіі прамыслоўцы
Здабывалі золата ў зямлі.
І стаіць, як сведка, ля Табола
Перамытага пяску гара.
Сёння мы з пуцёўкай камсамола
Да цябе прыйшлі, Джэтыгара!
Шчэ не ўсё тут вычарпана з ілу,
Многа тут дабра яшчэ ляжыць.
Вунь пшаніца ў стэпе урадзіла:
Колас к коласу — зямля звініць!
Трэба нам усё сабраць, да зерня.
А характар жа у нас круты:
Зранку столькі збожжа перавернем,
Што да сонца ўзнімуцца бурты.
Як здалёк прыедзе джэтыгорац
І дадому пойдзе праз палі,—
Ён убачыць нечакана горы,
Скажа: — Зноў тут золата знайшлі!
1957

## ПАЛАТКА

Мы ведалі: не будзе тут і блізка
Такога інтэрната, як у Мінску.
На голым месцы расхінулі скатку,
1 сярод стэпу — вырасла палатка.
Хай барабаніць лівень па брызенту,
Мы нібы ў інтэрнаце зноў, студэнты.
Няхай няма у ім шырокіх вокан,
Дык люк адчыніш — бачна ўсё навокал,
Хай замест ложкаў нікельных — бароны!
А пасля працы спім, тут, што бароны!
Калі ж — бывае — ў чамаданах пуста
І на палатку — хлеба пара лустаў,
Дык гэты хлеб нажамі мы бясслоўна
На трыццаць два раты падзелім роўна,
А вечарам, забыўшыея аб скрусе,
Пяём брыгадай, як ляцелі гусі...
Хай стэп кругом, а ўсё ж скажы мне, браце
Ці ж мы не у сапраўдным інтэрнаце?
1957

## ДВОЕ Ў СТЭПЕ

Ім сцежак тут не трэба:
Шырокі стэп — гуляй.
Над імі — ў зорах неба,
Наўкол — маўчыць зямля.

Іх Мінск за белым светам,
Ды добра тут адным.
Ледзь цягне цёплым ветрам
З начное цаліны.

Бы ў сне, паціху крочаць,
І кожнаму відаць,
Як дарагія вочы,
Што светлякі, гарацьі.

Даўно палатка знікла:

Дзе, у якім баку?
Хлапец рукой нязвыкла
Бярэ яе руку.

Вядзе іх вечны клопат,
Дармо, што згублен стан:
У тым баку — Еўропа,
Там — Ціхі акіян!
1957

## ХЛЕБ

Я толькі-толькі з Казахстана,
Спыніць, не знаю, позірк дзе б:
На ўсіх прылаўках ён, духмяны,
З пякарань мінскіх свежы хлеб!

Стаю, гляджу, і дзіўна неяк,
Як проста ўсё, каля латка:
Дастаў руб сорак сем капеек,
І бохан цёплы — у руках!

А мне на памяць раптам прыйдзе
Нядаўні неспакойны лес...
Ці ж не па гэты хлеб аж тыдзень
Мяне цягнік на нарах трос?

Не праз яго ж у стэпе хіба
Каля Табола, у разліў,
Дзень да цэнтральнае сядзібы
Я гразь вясновую мясіў?

А на таку ў гарачым жніўні,
Калі ударыў дождж густы,
Садраўшы з плеч плашчы, ад ліўня
Ўкрывалі цёплыя бурты.

І краўся здрадны сон пад вейкі,
Як мёрз я ў посвісце завей —
Мой хлеб каштуе не капейкі,

О не! Ён значна даражэй!
1957

## ТАКІЯ СЭРЦЫ Ў НАС

Такія, мусіць, косці ў нас —
Нам у пуху не спіцца,
Такія, мусіць, ногі ў нас —
Нідзе нам не сядзіцца,
Такія, мусіць, рукі ў нас —
Ніяк ім не стаміцца.
Ім трэба муляцца, касцям,
У цягніку на дошках,
Ім трэба пыльны стэп, нагам.
Змяраць ушыр і ўдоўжкі,
Ім трэба лёд прабіць, рукам,
Скалу здрабіць на крошкі.
Хай проста ў вочы дождж і гром —
Не змусіш нас згінацца,
Хай раптам цела зморыць сном —
Не будзем мы хістацца,
Хай заінее нават лом —
Мы не расшчэпім пальцаў.
Такія, мусіць, рукі ў нас,
Такія, мусіць, ногі ў нас,
Такія, мусіць, косці ў нас...
Такія сэрцы ў нас!
1957

* * *

Табе, сяброўка, ехаць на вакацыі,
І добра мне яшчэ прайсці з табой,
Ды вось свісток прарэзлівы на станцыі —
І вокны паплылі перада мной.

Лаўлю я позіркам вагоны цёмныя,
Што ўжо ляцяць у срэбраную ноч,

І да драбніц гарэзны твар успомню я
І цеплыню такіх ласкавых воч.

Удаль пабеглі шпалы пад парошаю.
Ты недзе, аглядаючы прасцяг,
Стаіш, напэўна, ля акна, харошая,
Цярэбячы свой шалік на грудзях.

Між хвоек дым апошні расплываецца,
І рэйкі ўздрыгваюць усё цішэй...
Ды гэта толькі поезд аддаляецца,
А ты мне робішся яшчэ бліжэй!
1957

* * *

Павуціны беленькая нітка
На пінжак мне села. Я здымаю
І кладу яе на крылы ветру:
Хай ляціць па нівах, сёлах...
Восень.

Ля варот — чырвонай бульбы горка.
Паўз яе нясуць бульбоўнік дзеці,
І жанкі духмяныя ахапкі
Рэжуць на сячкарні новай...
Восень.

Я іду сялом. На светлых стрэхах
Паласатыя бакі ўграваюць
Гарбузы. За шыбай — памідоры,
Нібы жар, палаюць ярка...
Восень.

Шлях вядзе ў палі. Здаля насустрач
Пылу коціцца клубок. Ды гэта ж
Наш шафёр вязе капусту зградаў —
Кузаў качаноў бялюткіх...
Восень.

Ліст тапчу я. Цёпла — на прылеску.
Я кладуся на сівец, пад сонца,
Што ўжо нейкім дарагім да болю
Стала сёння...
1958

## КАЗКА

Я смяяўся з казкі, чутай змалку:
Нібы ў пушчы ў нас, ля азярца,
Водзіцца дзівосная русалка,
Што людзей чаруе па сіўцах.

Раз між вольхаў, дзе таўкуцца мошкі,
І мяне ўтаптаная, як ток,
Вузкая казіная дарожка
Завяла ў нязнаны той куток.

Расхінуў кусты я, і з асокаў,
Халадок хаваючы ў цяні,
Бліснула ўтануўшае глыбока
Неба невыказнай чысціні.

А наўкол, дзе звон чмялёў напеўны,
Спалі вербы ў завушніцах рос,
І бяроза — белая царэўна —
Распляла ў задуме зелень кос.

Я стаяў, прычараваны цалкам,
Мне здалося: ў казцы я самой
І вось-вось чароўная русалка
Выйдзе з-за алешыны крывой.
1958

## МЯЦЕЛІЦА

Гляджу, гляджу за вокны,
Дзіўлюся, цёмны дзень які:

Мяце зіма садок наш
У сотні белых венікаў.

Хапаючы за вешчы,
Нахабны і раз'юшаны,
Зноў здзекуецца вецер
Там са старое грушы...

А тут, у хаце, грубка —
Ажно гудзе, нагрэтая.
Сядзі ды чай пі з кубка
Да самага да лета...

А я зрываю шалік
Шырокі мой на вешалцы,
А я іду пад хвалі
Вясёлай куралесіцы.

Няхай жа твар халодзіцца,
Няхай жа шчокі студзяцца,
Хай сэрца з ветрам водзіцца,
Няхай са сцюжай дружыцца!
1957

## ЛОДАЧКІ

Хоць было мне і шкада,
Ды абула лодачкі.
Выйшла з хаты — любата:
Аж рыпяць на сходачках.

Пэўна, гляне ўжо не так
На мяне Міхасік мой,
Калі ў клубе тупну ў такт
Тоненькім абцасікам.

А прыйшлося: і ў мой бок
Не глядзіць ніколечкі.
Бачу: выйшаў у садок
З старшынёвай Волечкай...

Дайце ж круг і размах
Мне, малодачкі:
Няхай б'юцца ў пух і ў прах
Мае лодачкі!
1958

* * *

Вы, пэўна, бачылі ў верасні:
Адарваўшыся ад заток,
Далёка-далёка ўверсе
Гусіны плыве шнурок.

Вы, пэўна, бачылі ў верасні:
Па пожнях, спавіўшы сады,
Паўзе да платоў і ў дзверы ўсе
Прапахлы бульбоўнікам дым.

Вы, пэўна, бачылі ў верасні:
Як кураняты, ў бары
Рассыпаліся па верасе
Рыжкі — кашалямі бяры.

Вы, пэўна, бачылі ў верасні:
Не гаснуць, гараць ля сцяжын
Касцянкі ў імжыстай шэразні
Ды чорнае сонца ажын.

Вы, пэўна, бачылі ў верасні:
Азерца ў пярыне мхоў,
Вярба ды стажок пры беразе...

Што мяне цягне дамоў,
Вы, пэўна, бачылі ў верасні.

1959

**ПЦІЧ**

Паўз бераг — зялёнаю хваляй асокі,
Вада нібы сінька — на фарбы пазыч.
Цячэ, пазбіраўшы па свеце аблокі,
Нікім не апетая Пціч.

Не ўбачыш на люстры яе парахода,
Курортны палац не засвеціць з-за ліп.
Варушыць чарот ад усходу да ўсходу,
Люляе, люляе чаўны ля сяліб.

Ля моста жанкі, падаткнуўшы спадніцы,
За хвалю бяруць яе — мыць ручнікі,
Я на ж вырываецца з рук, жартаўніца,
Імчыцца, адносячы пены шматкі.

Ды доўга няма як разгульвацца плыні:
Нясе на спіне за плытамі плыты,
Варочае жорны каменныя ў млыне
Ды сонцы развешвае ўсцяж на драты.

Бяжыць, падбіраючы следам крыніцы,
Дубы падмывае — што						разу дужэй.
Хай песень не чуў я аб ёй, працаўніцы,
Ды мне за ўсё рэкі яна прыгажэй!
1960

* * *

Не сцерці мне з памяці дзень той,
Як выйшаў з маленства ў шлях я.
Быў клён у барву адзеты,
Аблокі раллёю пахлі.
Я нёс у руках, на рэмні,
Блішчастыя першыя боты.
Да станцыі плечы грэў мне
Праз торбу духмяны бохан.
Звінелі косы на Крушні,

Каровы рыкалі за Талам.
А сцежка, дажджом прыцярушаная,
Конікамі стракатала.
Выходзіла сонца з аблокаў,
Гарэў небасхіл пажарам.
І дзесці на дне глыбока
Песня ў сэрцы ляжала.
1960

## СОНЦА

Сонца зайшло за лясы...
Зайшло?
Зірніце на свет дзівосны:
Яно рамонкаў ясных святлом
Ззяе на ўзмежку росным,

Ціха-ціха за шляхам шасціць
Мядзяным калоссем з ветрам,
На дрэве рыпучым, у цёмным лісці,
Ірдзее спелым ранетам.

Яно раўчуком у зялёным яры
Булькоча па цёплым камені,
Варушыць падзол пад травою ў бары
Вузламі жывых карэнняў,

Светлым-светлым струменем звініць
У матчынай гулкай даёнцы
Ды ў сэрцы маім нязгасна гарыць,
Сонца.
1960

* * *

У пору бусловых прылётаў
У лес не ідзі яшчэ босы:
Кальне табе ў пяткі — бойся —

З-пад лісця чорнага лёд там.

Ты не глядзі, што ад пчолаў
Ужо ажылі выжары,
Што промень цёплы абшнарыў
Чарнічнікі ўсе наўкола.

Бярозы там золкія цені
Кладуць на імхі, хоць і скупа;
Між белых камлёў і купін
Сцюдзёныя ходзяць струмені.

У гале, пад сонцам гарачым,
На мяккай траве мурожнай
Задрэмлеш неасцярожна —
Прахопіць цябе як бачыш.

Плыве выпарэнняў цяпло там
З набраклай зямлі у нябёсы...
У лес не ідзі яшчэ босы
У пору бусловых прылётаў.
1960

## МЁД І ЯД

Кажуць,
Нібы ў век дубоў някранутых
Пчолы нашы
Іншымі былі:
Джал і знаць не зналі,
Ў красках з раніцы,
Мірныя,
Бясклопатна гулі.

Толькі й ведалі,
Што з ліп дурманячых,
З дзікіх грэчак,
З верасоў штогод
У дупло да сотаў —
Жоўтых шкляначак —

Зносілі лясное цуда —
Мёд.

Ды аднойчы звер,
Зубамі ляпнуўшы,
Выйшаў з-за куста,
Здабычы рад.
Соты драў,
Таптаў грубымі лапамі...
І тады
Зрабілі пчолы —
Яд!
1961

* * *

Не раз я хадзіў тут на золку, да дня.
Стаяла па раніцах скрозь цішыня.
А гэта ледзь ступіш —
Напевы плывуць:
Сосны пяюць,
Вербы пяюць.
Спявае сцяжынка ў зялёным лянку,
Рачулка спявае ў альховым вянку,
Вузенькія кладкі, што гнуцца дугой,
Іграюць, як струны, пяюць пад нагой;
Спявае ракітнік на ўсе галасы,
Спяваюць званочкі, густыя аўсы,
Спявае зямля ўся,
Свет цэлы пяе:
Я крочу у вёску сваю
Ад Яе.
1961

## ПАЧАТАК ДАРОГІ...

### I

Горад, як мора пасля навальніцы:
Адгаманіў, адшумеў і — прымоўк.
На тратуары — лясньімі званіцамі —
Ліпы расквечаныя ля дамоў.

Пад мнагазор'ем чэрвеньскай ночы
Вуліцай, што да канца відна,—
Локаць да локця, вочы ў вочы,—
Крочылі двое — ты і яна.

На Веранічыны плечы лілася
Хваля густых валасоў паўз шчаку.
Пальцы дзявочыя гладзілі ласкава
Новенькі ромб на тваім пінжаку.

Выплыў насустрач палац беласценны —
Не, ўжо не твой ён, універсітэт:
Быццам растала пяць год летуценных,
І ў кішэні —
    памацай —
    білет.

Моўчкі па скверыку цёмным хадзілі,
Слухалі ноч, і табе, у лісці,
Страшна было паглядзець на гадзіннік:
Стрэлкі ляцелі, бы хто іх круціў.

Толькі прыйшоў гэты час. На пероне
Клункаў і кошыкаў штурхатня.
Думна стаялі вы збоку, пры клёне,
Рукі спляліся — ніяк не разняць.

Раптам бы гром — паравоз загудзеў так.
Бліснулі вейкі сонцам слязы.
Колькі сказаць ёй хацеў, маладзенькай,
Ды як калода зрабіўся язык.

— Гэй, у вагон! Расчапіліся рукі.

Момант — і ўжо ад разгубленых воч
Колы панеслі, панеслі, пагрукваючы,
Недзе за далеч цябе, за ноч...

**II**

Воблакі — гурбамі за Бярозаўкай:
Толькі б і крочыў — хай дзень, хай ноч.
Хвошчык ды карлікавая бярозка,
Як гусяняты, ля ног.

Ты зашчапіў яшчэ цёмначы хату:
«Поле і ўзлесак, я сёння ваш!..»
Воля! Зялёная хвоя — страха тут,
Палавікамі — трава-мурава.

Стань — на слупах правады, як гуслі.
Недзе пабеглі ў туман, за стагі.
З воблакаў голас данесла: мо гусі?
О лістапад, лепш той покліч стаі!

Хіба ж у вырай, да вёсен даўніх
Здольны ляцець чалавек, як птах?
Выгнала годы: ты сёння настаўнік —
Вёска палеская ў балатах...

Быццам папаўшы ў караблекрушэнне,
Хваляй крутой ты ад шыб дарагіх
Раптам занесен — о свету кручэнне! —
На незнаемы бераг другі...
Бегла атаваю сцежка — правей каб...
Стала цвярдзей: узвяла на груды.
За саснячком — бы палотны: гравейка!
Вось ты, маленькая сцежка, куды!

Ногі ступілі на гравій шорсткі.
Ля гарызонту — хмар каламуць:
З ночы да ночы тут шыны-шчоткі
Пыл — на ажыннік — мятуць і мятуць.

О гаваркія гасцінцы ў бярозах!
Думак бунтаўшчыкі!

Хто не насіў к вам — па сцежках, барознах
Сум, і надзею, і боль праз вякі?

Плёнка дарогі — слядоў спрасаванасць.
Каб праявіў яе — па небасхіл,—
Колькі б адкрылася неспадзявана
Ботаў,
        лапцей,
        чаравікаў,
        бахіл!..

**III**

Дробна ў акне калацілася шыба,
Дуб скроб сцяну кіпцюрамі сукоў.
Бабка варочалася за шырмай:
Каб не сарвала вароты з крукоў!

К раніцы сціхла. За сінімі градамі
Нешта шаптала чародка ліп.
Ля сельсавета з «талеркі» радыё
Голас прарваўся — і рып, і хрып.

Дзень нараджаўся. З далёкіх вандровак
Сонца нябачна ішло ў двары:
Дралі ўжо горла — на дахах, на дровах —
Пеўні — адвечныя песняры.

Новы твой дзень... Дзе ты сёння, юнацтва —
Воч сінява у завейных вятрах?..
Будзе за хатай дубок калыхацца,
Рвацца да воблакаў белых вятрак...

Недзе бутону, у травах забытаму,
Трэба святло, каб як след расцвісці...
Смела ж выходзь на крутую арбіту —
Свету свяц!

1957

## ПЕРЛЫ РОДНАЙ ЗЯМЛІ

На беларускай мове… гаворыць каля
10 мільёнаў чалавек; гэта самая багатая і
самая чыстая гаворка, яна ўзнікла даўно
і выдатна распрацавана…
*Адам Міцкевіч, 1842 г.*

Абрус — абцас — азярод — арэлі...
Вясёлка — вырай — вярба — ваўчкі...
Як міла пазвоньваюць, сэрца грэючы,
Чыстых бацькаўскіх слоў ланцужкі!

Зямлі маёй перлы, дзе іх адшукалі?
Спытай у магіл:
Удзень і ўначы
Іх, з бурамі дужаючыся, здабывалі
Людзі простыя — крывічы.

Каб ярка свяцілася перлінка-слова,
Каб людзям зіхцела — на ўсе бакі,
Яго шліфавалі як след, адмыслова
Найлепшыя ў свеце тачылы — вякі.

Ды лезлі чужынцы —
мой край прысвойваць —
І ўсюды (бо трос душы чорныя страх)
Знішчалі агнём беларускае слова,
Палячы геніяў на кастрах.

Але ўратаваў люд мой слова ад згубы
І, гонячы катаў ад родных бяроз,
Праз далеч стагоддзяў сівых —
з губ у губы —
Да нас, незамутненае, данёс.

Як скарб дарагі, перададзены ў спадчыну,
У сэрцы хавае народ мой ад здрад
Праменнае, звонкае слова матчына
Для песень сонечных і балад!
1957

* * *

На той зямлі, дзе ў зорны час
Пакінуты маленства вёслы,
Каторы год без нас, без нас
Па колкіх броўках ходзяць вёсны.
У вольных вольхах зноў і зноў
Цвітуць ясноткі і таўкачыкі.
За табунамі туманоў
У асацэ нясуцца качкі.
Мы —
ці даруюць нам палі? —
Зрасліся з шрадам, як з ценем,
І часта — парасткі зямлі —
Не тое робім, што хацелі б.
Ды помніць сэрца плыт і плуг,
Высокі жнівень, свет пясчаны...
Сячы ж аб дом —
па шклу, па тлу —
Вясновы лівень ачышчальны!
1962

## ТОРНАЯ СКІБА

З-пад плуга твайго — убачыш здалёк
Па полі наўпрост, за сялібай,
Плыве і пакорна кладзецца набок
Чорная скіба.
Чорная скіба! Пара — дымком.
Як хлеб, які на жары быў,
Ляжыць пад воблакам-ручніком
Чорная скіба.
Яшчэ нават продак продка твайго
Варочаў яе і раскідваў.
Зведала безліч і сох, і плугоў
Чорная скіба.
Колькі паэтаў, будаўнікоў,
Вучоных (усіх не злічыў бы),
Як маці, карміла спакон вякоў

Чорная скіба.
Аснова асноў, без яе чалавек
Да зорак дайшоў бы хіба?
Таму і спяваю я песню табе,
Чорная скіба!
1962

* * *

Ужо і зіма — убок,
Не згледзіш — май ля парогу:
Разматваецца патроху
Жыцця майго клубок.
На хустцы нябёс паяснелых —
Сонца і галубы.
Іду, крутаверцю белаю
Засыпаны да галавы.
О кволы пялёстак чысты
На баразне сухой!
О сцежка! О мячык чыйсьці!
О леташні ліст пад нагой!
О будня шматкаляровасць!
Глядзі не міні, не міні
І град, і касьбу за дуброваю,
І лотаць, і камяні.
На ўсё хачу наглядзецца,
Усё спазнаць — хоць калі:
Касой намахацца, напецца,
Наплакацца на зямлі.
Уперадзе — вецер, вецер,
Сонечная паласа.
Блытаецца да вечара
Вецер у валасах!
Іду я — не збіцца б з тропу.
І горыч, і радасць, дальбог:
Разматваецца патроху
Жыцця майго клубок.

1957

* * *

Сёння спаць не пайду, не пайду —
Лепш не кліч, перапёлка.
Ты не бачыш, каго я вяду
Па дарозе з пасёлка.
Хмара чорная валасоў,
Паркалёвая блузка...
Лезе месяц — які тут сон! —
Ёй за шыю, заблуда.

Кажуць вочы: цалуй, цалуй!
Я на рукі бяру, харошую,
Па пшаніцы, як па сялу,
Крочу з радаснай ношаю.
Недзе ўпала прыколка — няхай.
У кішэнь дай мне туфлі.
Неба, неба — рабая страха.
І зара ўсё не тухне.

Твар апёкся — яе валасы!
І — няхай нават згуба —
У гарачыя каласы
Апускаемся — губы ў губы.
Зверху зорка глядзіць на палі —
Агнявыя вейкі.
Абвілі мяне, аплялі
Рукі — яблыні вецці.

Ў сэрцы сонечна — не гавары.
І дармо, што, як совы,
Будуць зырыцца плеткары,
Кідаць колкія словы.
Што ж, няхай. Мы ізноў на зары
Тут прызначым спатканне...
На зямлі, не заходзячы, вечна гары,
Сонца кахання!

1963

## ЧАТЫРЫ ВЯТРЫ

*Маёй маці*

### I

Я абганяю бульбу —
яна пабялела на сонцы.
Плуг, быццам човен у хвалю,
у глебу міжраддзя нырае.
Плыве ў чарназёме лёгка,
чыркае аб камень знянацку
і зноў
у пухкай зямельцы Тоне.
Іду ды іду баразною.
Над соткамі — мроіва поўдня.
Я дома, у мацеры, босы.
Жаўранкі ды зязюлі.
Патузваю толькі лейцы —
каб корч не вывернуць раптам...
Пад майкаю вецер ходзіць,
па зямлі ступае...
О, як гэта проста —
за плугам ісці баразною.
О, як гэта мудра —
за плугам ісці баразною.

### II

Цэлае лета бясконца палі
пясчынкай кожнай
сонца пілі.
Яно ў насенні брадзіла, гуляла,
сонца,
светлымі парасткамі прарастала,
сонца...
Цяпер па зямлі скрозь — зірні — шугае
сонца,
з раніцы людзі гуртом убіраюць
сонца:
сыплецца ў бункер
жыта струменем — сонца,
падае яблык,
увесь у праменні — сонца,

на градах
лісце качаны раскрылі — сонца,
вазы агуркоў,
памідораў скрыні — сонца.
Сонца, сонца, сонца...
Гляджу, як грузяць на грузавікі
сонца,
вязуць на пыльныя бальшакі
сонца.
Хутка запоўніць усе гастраномы
сонца,
яго разбяруць па кватэрах ўмомант,
сонца.

**III**

Заўчора да дня
          над Анцінымі вязамі
гусі праляцелі —
          туды, на Зазер'е.
А сёння сыплецца —
          на дровы, на пералазы
снег —
          белае пер'е.
Маці адставіла ўбок даёнку,
глядзіць на шыбы нямыя:
снег
          накрывае
          марляю тонкаю
гароду
          груды грубыя.
Зіма...
          Няўжо гэта праўда,
што ўжо яна
          на дварышчы?
Во рукі ж гараць яшчэ —
          не даць ім рады
ад асакі ды іржышча.

**IV**

Сакавік, а да соку —далека:
пад бярозай —

сумёт па плот.
Мне ж даводзіць сарокі сокат:
снег не снег ужо,
лёд не лёд.
Цэлы дзень сёння маці ля арфы:
прыадчыніш акно —
гуд і гуд.
Толькі ў поўдзень, ад сонца яркі,
сціхла.
Цокаюць кроплі аб грунт.
Чую крокі ля вокан: маці!
Ледзь у хату — і да вады.
Пылу, пылу на хусце — памацай,—
астануцца пальцаў сляды.
Ёй прылегчы б, ды хіба ж захоча:
палівае расаду,
зноў, зноў,
і расказвае: хутка адскочыць
на балоціне чорнагалоў.
Твар свіціцца.
І нават маршчыны
зніклі некуды, як адна.
З-за нябачаных далячыняў
зноў у вёску прыйшла вясна.
1964

* * *

Ёсць на свеце краіна.
Там думаць аб хлебе — не трэба.
Там — бясконцае сонца,
бясхмарнае неба.
За тваёй баразною —
гракі як грэкі.
Там — малочныя рэкі,
Паўнамоцныя лекі.
Знік навекі там смутак,
як цень іхтыязаўра...
Ёсць такая краіна.

Яна называецца — Заўтра.
Цэлы век мы ідзём туды,
вострачы слова, нястомныя,
Зубрачы перад сесіяй
хіміі і анатоміі.
Мы дарогу туды пракладаем
простай лапатай і грэйдэрам,
Кельмай і культыватарам,
скальпелем белым і пэндзалем.
Прабіраемся на самазвалах,
пеша,
на конях зацугленых —
Да яе, да яе! —
праз дзён непраходныя джунглі.
Вечна рвёмся туды,
нібы да высокага сонца
З нашай будзённай краіны,
якая завецца — Сёння.
Як планеты, блішчаць ліхтары
над дарогаю сонна —
Сёння.
На праспекце ўвесь дзень перамаюць
дожджык-імжак парасоны —
Сёння.
Я маячу ў чарзе шмат'языкай —
даюць апельсіны —
Сёння.
У граду, зямлёю запэцкаўшы рукі,
хаваю, як вырай, насенне —
Сёння...
Ні на міг не спыняемся мы —
гарыце, зоры бяссонныя! —
Ідзём у краіну Заўтра
з краіны працоўнай — Сёння.
Сёння...
А дні, што намі пражыты,—
іх ты не спыніш, не спыніш! —
вагонамі скорага
Імчацца ў другую краіну,
якая завецца — Учора.
Таемным востравам казак

дрэмле там печ на падлозе.
Там скрыпкай шматструннай грае
штодня па сняжку палоззе.
О, як ясна там свецяцца, свецяцца,
не гаснучы,
вочы і губы!
О, як соладка пахне пад месяцам
горкі палын там, за гумнамі!..
За ўсё даражэй я на сэрцу,
краіна Учора
(мусіць, таму, што ніколі
Нам туды ўжо не з'ездзіць...)
Краіна Учора...
Краіна Сёння...
Краіна Заўтра...
Тры краіны на свеце...
1965

* * *

Усё мінаецца, мяняецца:
лясы
ссякаюцца і зноў шумяць, гайдаюцца.
Як зайца поўсць, мяняюцца часы —
унь —
на Зямлі-ваўчку, што не спыняецца.

О, як перад вачамі мільгацяць
эпохі навальнічнай кінакадры!
Мяняюцца часы
Паўз нас ляцяць.
Не спыняць іх ні подкупы, ні кары!

Яны нам трубяць, Новыя часы,
гудуць, гудуць — шырокі горн гранёны.
Пад хіжых дэмагогаў галасы
мы ў сэрцах носім іх як эмбрыёны.

Не ўсе, не ўсе мы ланцугі змялі —

пад сонцам ох як крыўд яшчэ даволі!
Не спі ж, не спі: няхай па ўсёй зямлі
гуляе, меж не ведаючы, Воля!

У гэты свет ідзём мы, як трава,
нясём у жылах новы дзень з сабою.
І часта падаем — зямля, бывай! —
мы у жыцці — бясконцым полі бою.

Ды з зерняў прарастаюць каласы,
над далямі, над днямі нахіляюцца.
Я знаю:
нас глытаючы,
часы,
як ад вятроў зіма,
перарабляюцца.
1965

## ГІМН ЧАРПАКАМ

Зноў і зноў зямля мая — вечна юны свет! —
Распускае ўдалечы раніцы букет.
Толькі хай даруюць зоры ды зязюлі,—
Сёння — да знямогі — буду славіць вас,
Срэбраныя лыжкі,
Чарпакі, каструлі,
Бранзалет залочаны,
Белы унітаз.

О, як цешыць вока водсвет ваш здавён!
О, як лашчыць вуха ваш прывабны звон!
Што там праўды сонца, што нябёсаў струны
Дзеля вас мы родзімся і жывём падчас,
Срэбраныя лыжкі,
Чарпакі, каструлі,
Бранзалет залочаны,
Белы унітаз!

За сталом дырэктарскім — раздабрэлы Сам.
Хоць і Сам, ды кроку ён не ступіць сам.

Вы яму дыктуеце: ці пусціць да вуліц,
Ці рукою пухлай знішчыць песню ўраз,
Срэбраныя лыжкі,
Чарпакі, каструлі,
Бранзалет залочаны,
Белы унітаз.

Ведаў хлопец поле, мову дрэў і пчол;
Сёння ж, прамяняўшы свет на вузкі стол,
Перад гладкай лысінай —
Толькі б як расчуліць —
Гнецца ў тры пагібелі —
Хіба ж не праз вас,
Срэбраныя лыжкі,
Чарпакі, каструлі,
Бранзалет залочаны,
Белы унітаз?

Рвуцца ў свеце бомбы. Гора — акіян.
Людзі ж, як глухія, ідуць пад барабан.
Што ў зямлю чужую іх нясе на кулі?
За што б'юць і паляць?
Так, праз вас, праз вас,
Срэбраныя лыжкі,
Чарпакі, каструлі,
Бранзалет залочаны,
Белы унітаз.

Мала ўсё ж ваюють з вамі песняры:
Колькі перамог у вас, душ уладары!
Пад блакітам неба, дзе арлоў прытулак,
О, як яшчэ ў свеце шмат рабоў у вас,
Срэбраныя лыжкі,
Чарпакі, каструлі,
Бранзалет залочаны,
Белы унітаз!
1966

## ПЕШКІ

*М. Рому — стваральніку кінафільма*
*«Звычайны фашызм»*

Пасля работы (звычайнай, канторскай)
Сяджу, ачмурэлы,
          над шахматнай дошкай.
Усё-такі добра быць каралём
          альбо каралевай:
Хадзі куды хочаш —
          уперад,
          назад,
          направа,
          налева.
Не тое што ў пешак:
          ні ўлева, ні ўправа
Ім хадзіць не дазволена —
          толькі прама.
Хай збоку пагрозліва стане
          варожы ферзь —
Усё роўна не лезь!
Не маеш права:
Трымайся закону адвечнага:
          кроч прама!
І крочаць пешкі
          адна за адной,
Збіваючы іншыя пешкі,
Трапляючы самі «пад бой».
Пешкі... Пешкі...
(Каму не помняцца пешкі,
          якімі нядаўна адзін гуляў у «Mein Kampf»
Мне шкода іх, пешак
          (хоць сябе яны не шкадуюць):
Яны ні пра што не думаюць,
          яны нічога не чуюць,
Ідуць па загаду слепа —
          хай смерць, хай згуба чакае ля сцежкі...
О пешкі!

1966

* * *

Я праўду шукаў
У кнігах трох знаных вучоных.
Браў першага.
У жыццё мае гледзячы,
        нібы ў люстэрка,
Ён на дзвюх сотнях лістоў даводзіў,
        што белае — гэта не белае.
Чытаў я і верыў:
Праўда!
Браў другога.
Ён лаяў першага,
        страляючы па яго довадах,
Перакрыжаваным агнём
        прымавак і цытат!
Чытаў я і верыў:
Праўда!
Браў трэцяга.
Як ён здорава клаў на лапаткі
        і першага, і другога,
Даказваючы,
        што масла — гэта не масла!
Чытаў я і зноў верыў:
Праўда!
Праўда?..
Раздумаўшы,
        шпурнуў тыя «кнігі» у смеццеправод
І, узяўшы білет,
        паехаў да сваёй маці,
У Зялёную Дуброву.
Пры ганку, дзе хрэн зялёны і сонца,
        грэбліся —
        і не зірнуўшы на госця — куры.
Паўз вокны, на слівы сена чапляючы,
        плылі вазы зялёнымі хмарамі.
Мінаючы іх, хлапчук-вадавоз,
        на калёсах прыўстаўшы,
        тарабаніў — адтуль жа, з Балота —
        парожнія бочкі...

І я, знайшоўшы ў застрэшку
 сваю, неразлучную колісь, «васьмёрку»,
 якая гуляла гэтулькі год,
Падаўся туды, за сады мнагалістыя,
 на галасы...
Касіў я з дзядзькамі сівец і малачай,
 белы авёс з васількамі.
У глотку прагную малацілкі
 кідаў я — чорны ад пылу —
 снапы за снапамі.
Я гной сахаром раздзіраў,
 вясну-красну сустракаючы,
На лузе стагі
 проста ў хмары скіроўваў,
Спяваў на радзінах —
 ой, хмелю, хмелю! —
Нашы —
 чыстыя, як сляза,—
Беларускія песні...
І ўсюды —
 нічым не схаваная, не заслоненая
Праўда была перада мною.
Адна, як Сонца.
1966

* * *

Калі над горадам усходжваецца непагода,
 зрываючы з паважных дзядзькоў
 капелюшы —
 гэй, перай""мі там, сябар! —
Калі яна між дамоў шалее,
 дзеркачом завірухі
 змятаючы людзей з тратуараў
 за дэрмацін дзвярэй,
 дзе аж трашчаць ад нагрэву
Трубы цеплацэнтралі,—
Я думаю пра вас, землякі,
зялёнадуброўцы.

(Вы на чорнай — зімою белай — зямлі,
якая адкрыта перад усімі зорамі і вятрамі,
як жылі, жывяце,
беззабаронна й нязрушна,
як дрэвы.)
Бачу Вас, дзядзька Белы.
Які пісец гэтак твар Ваш маршчынамі скрэмзаў?
Па іх, як па пісьмёнах,
Я пра лёс Ваш чытаю.
Вось гэта расказвае пра вайну мікалаеўскую
(колькі асколкаў і куль ляцела на Вас,
каб змяшаць Вас з зямлёю!).
Гэта — як хлеб Вам даваўся
(за пот, што Вы шчодра лілі на палі,
плацілі Вам працаднямі,
пустым!, як абмалочаныя каласы).
Гэта і гэта — пра Вашых сыноў,
Алёшу і Юзіка,
якія ўсё яшчэ не прыйшлі
з 41 года...
Бачу Вас, Ясь Дубовік.
Вы скора справіце сваё 80-годдзе,
а ідзяце яшчэ з віламі на Канаву —
вяршыць стагі свайго чарговага лета.
Колькі Вы скідалі іх за жыццё?
Каб гэта рантам сабраць з усіх лет
Вашы стагі,
быў бы, напэўна,
найвялікшы ў свеце горад стагоў!
Бачу цябе, Аркадзя Азанаў.
Помніш,
ты ўсё мерыўся з'ехаць з Зялёнай Дубровы
(«Не было і не будзе тут парадку!»)?
А зараз, відаць, раздумаў:
куды ні пайдзі, чуваць, як чмыхае
сінім дымком твой трактар,
ад якога цябе не адцягне і жонка,
вячэраць гукаючы...
Бачу Вас, стары Галляш,—
самы першы ў вёсцы грыбнік,
казачнік і сейбіт.

Прыпадаючы на адну нагу,
Вы ідзяце па дымнай раллі, прама на ранняе сонца.
І жменя за жменяй — бераце з лубкі
і сееце, распускаючы залатым веерам перад сабою, жыццё.
Бачу Вас, Антон Цвірка — вялікі пчаляр
(на ўсіх вакольных дубах
звіняць пчоламі Вашы калоды);
Вас, Бэрнусь Паўловіч,— скрыпач-чараўнік
(колькі шчаслівых слёз
выбраў з сэрцаў людскіх Ваш смык!);
Цябе, Сымон, конюх-філосаф
(я цябе вышэй бы паставіў за многіх з тых,
хто выседзеў нават гросбухі
доктарскіх дысертацый);
Вас, цётка Хрыстына,
найлепшая з лекарак, якіх я ведаў
(як рукой здымаюць хваробу ў дзяцей
Вашы незразумелыя і такія ласкавыя словы!)...
Няхай некаторыя з Вас даўно
параць ужо на жоўтым пагосце косці,
але для мяне Вы заўсёды жывыя,
мае землякі.
І пра кожнага з Вас,
калі ў мяне хопіць сілы і таленту,
я напішу яшчэ — абавязкова! —
па самай светлай паэме.
1966

## ЗЯМЛІ ПАТРЭБНЫ ПАЭТЫ...

Зямлю — не ашукаеш:
у складках-скібах яе —
Вякоў незлічоных мудрасць.
Над чорнымі грудамі
лёгкі туман, як кастрыца.
Выслухвае хмаркі зямля,
капілярамі ўсімі адкрытая.
Яна, як дзяўчына,
чакае кагосьці, чакае.

Старая, як свет,
І, як лотаці цвет, маладая.
Нявеста найбагацейшая,
не змераць яе пасагу:
Нязведаны скарб у сховах
замкнула яна да часу.
Не кожнаму толькі рада
Аддаць яна ў рукі ключы
ад запаветных складаў.
Зямлі патрэбны
не трактарысты,
не ўчотчыкі,
не палольшчыкі,
не дырэктары.
Зямлі патрэбны —
паэты,
Якія
ёю жывуць і дыхаюць,
аб ёй, як аб маці, дбаюць,
Якія,
перш чым з плугам прайсці,
думкамі
яе саграваюць.
Яны яшчэ ў снежні снежным,
калі за хатамі свет увесь белы,
У галаве
раўнютка ўзаруць яе
і прабарануюць!
Яны яшчэ ў лютым лютым,
калі замятае снег зоры,
Кожны палетак засеюць
зярнят золатам.
А потым зноў яго перасеюць,
і не раз,
а разоў, можа, дваццаць ці сорак.
І доўга думаць будуць,
дзе жыта пусціць, дзе проса,
куды колас вось гэты
Паставіць звінець...
Адным толькі ім, паэтам
(сапраўдным, не вершаплётам),

рада
Аддаць зямля ў рукі ключы ўсе
ад залатаносных складаў.
Тых жа, хто да яе прыходзіць,
каб выпрацаваць мінімум,
каб не адрэзалі соткі,
каб атрымаць рублі ў касе,
Зямля не прызнае...
1966

## ЦЕЦЕРУКОВА МОВА

Ці чулі вы, пра што каля ракі
Балбочуць нацямку цецерукі?

Вясной, калі на ліпе, як кілішкі,
Зазвоняць хмелю поўныя пупышкі,
Калі старыя пні на расцяробах
Пад сонцам здзенуць ледзяныя робы,
А ў снезе запяюць на ўсе гаі,
Льючыся проста ў сэрца, ручаі,—
Цар-цепярук балбоча звонка:

«Прадам кажух — куплю жонку,
Прадам кажух — куплю жонку...»

Калі ж засвішча ў лесе сівер,
Мароз развесіць іней сівы,
Дарогу сцісне ў груду-храпу,
Балбатуну прыхваціць лапу,
Мяняе мову цецярук:
«Прадам жонку — куплю кажух,
Прадам жонку — куплю кажух...»
1966

## САБАКІ

Паважныя, ляныя, ля двара
Яны снуюць, паснедаўшы нядрэнна.

Палац уласніка-гаспадара
Вартуюць дзень і ноч яны нядрэмна.

Ледзь выйдзе, як яны — ну як мінуць!
Адразу ўсёю зграяю ахвоча
Кідаюцца, каб бот яму лізнуць,
Хвастом вільнуўшы, зазірнуць у вочы.

Ён строп сабакар, іх гаспадар —
Заўсёды верны, паслухмяны будзь ты.
Штодня кідае ім агрызкі ў дар,
Дае за службу ўсім па цёплай будцы.

Дык як жа за яго ім не брахаць?
За костку — дайся толькі ім у знакі! —
Яны любога могуць разарваць...
Ды я не іх віню: яны — сабакі.
1957

* * *

Мова зямлі маёй! Мова бацькаўшчыны!
Пачую твой гук на чужой зямлі,
І — бумкае чмель у гародчыку басам,
Трубяць за возерам жураўлі.

У хаце бярвеннай, ля печы — далёкая —
Ходзіць мацерына чапяла.
На плоце певень — жар-птушка — галёкае,
Збудзіўшыся, бзыкае ў шыбе пчала.

Дарма мне казалі, што ў пальмавым краі
Я нават успомніць цябе не змагу,
Што іншая песня — мелодыяй раю —
З душы маёй выцесніць просты твой гук.

Мова мая!
Для мяне ты заўсёды —
Сонца вясновага цёплы прамень,

Дзіва ляснога поўныя соты,
Рэчка, што асвяжае ў сухмень.
1967

* * *

Зноў вярнуўся я ў бацькаў свет палявы —
У першабытнасць дрэў і травы.
Авяваюць мяне
вольныя крылы радзімы —
Вёсны ды зімы.

О як хораша — толькі з парога — піць
Маладыя настоі раніц!
Аб галінку шыпшыны лясной
(Як матылі, яе кветкі абселі)
палец раніць!

Грае вечную арыю бор —
Я пайду без дарог, як вецер.
Можа, ўбачу, як ладзіць бабёр
Свой прытулак
на гэтай планеце.
Бліснe мне ля тваёй дзеразы
Бліскавіца-яшчарка, лесе.
А мо страну пагляд казы,
Што пасецца ў зялёным лецe?

Там з-за хвой,
дзе сцежка лася,
З-за галін вербалозу, здалёку
Мне, як радасць, адкрыецца ўся
Азярына — зборнік аблокаў.

Будзе плёхаць хваля ў трысці,
Асыпаць пялёсткі каліна...
Гэта шчасце, што ёсць у жыцці
Родны бацькаўскі свет каляінны!
1967

## СЦЕЖКІ МАЛЕНСТВА

Там ліпы як ліпы і вербы як вербы —
Растуць як хочуць пад вольным небам.
А сцежкі тыя, палявыя дарогі
Пратоптваюць самі людскія ногі.
І салавей там не ў клетцы — вольна
Пяе салаўісе ў цёмных вольхах.
У ясным тым свеце — ў нябыт ён не кануў! —
Ніхто не хавае за пазухай камень.
Усё ў вачах там напісана шчыра,
Там два на два — заўсёды чатыры.
Там чорнае — чорнае, рыжае — рыжае,
Слуп ёсць слуп і грыжа ёсць грыжа.
Там з нараджэння жыве ў мяне маці —
Садзіць картоплю, сее макі,
Ідзе («хоць каня брыгадзір калі дасць») у поле:
Кланяецца буракам,
Прарэджваючы ды прапалваючы,
Лён бярэ на загоне, між двух палікаў —
Не зарасла хаця б яе «пайка».
А вечарам дома — толькі ўпраўляйся — працы:
Гарбузнік сячэ для свіней
(«ненажэры, каб на іх пранцы»),
Агуркі палівае, куранят частуе крупою,
Каля печы круціцца з чапялою...
Усе вяскоўцы мае
(хто час ліхалецця не помніць?),
Як шклянку, дзень свой працаю поўняць.
Даўно яны ведаюць, знаюць, як трэба,
Колькі каштуе скарынка хлеба.
Там са стала (не думайце, што з-за грошай!),
Ніколі не скінуць пад ногі крошак.
Па сцежках тых родных так ходзіцца лёгка:
Там хочацца лётаць, з рэхам галёкаць.
Там можаш грому смяяцца вясёла,
Пусціцца па лужынах пад вясёлку.
Там ходзяць — к ночы — туманы нячутна,
Пад ногі сцелецца лістам трыпутнік,
Святляк запальваецца за гародамі

І мак таўкуць камары — на пагоду...
Мы ж сцежкі маленства чамусь забываем,
Сябе ад сябе — дзівакі — адрываем.
Душу нашу губяць з узростам парасты:
З'ядае яе кар'ерызму караста,
Смоўж зайздрасці смокча і смокча штоночы
Ці шашаль нажывы ушчэнт яе точыць.
Сцежкі маленства, сцежкі маленства!
Вы — лекі ад розных людскіх калецтваў.
Па вашай траве, па вашых росах
Часцей бы ступаць нам нагою босай,
Часцей бы да вас нам усім прычашчацца,
Ад бруду ўсялякага ачышчацца.
Лячыцца вашых крыніц чысцінёю
Ды матчынаю слязою святою.
1967

**Я З ТОЙ КРАІНЫ...**

Я з той краіны, дзе рвуцца з долу
Тугія стрэлы хвой карабельных,
Дзе, белагрудыя, над вадою
Стаяць бярозы, як каралевы.

Там пушчы — заблудзішся.
Толькі па зорах,
Па сцежках зубрыных знойдзеш дарогу.
У рэках сонных, у цёплых азёрах
Там ходзяць і сёння акунь ды стронга.

Я з той краіны, дзе ўранні жанчыны
Браць лён ідуць як адна, хаўрусам.
Глядзі ды любуйся: воч золак сіні
Ды рэчкай з-пад хуст — валасы бела-русыя.

А хлопцы там — сокалы.
Дзень у хлопцаў —
На зрубах звонкіх, на дрогкіх машынах,
А вечар — пад ручкі вядуць да варотцаў
Пявучых сябровак сваіх з вечарынак.

Я з той краіны, што ў век беспрасветны
Ясны прамень нарадзіла — Скарыну
І песню для славы дала сусветнай
Адаму Міцкевічу — роднаму сыну.

З краіны, дзе Каліноўскага слова
Лес гнеўных кос на цара ўздымала,
Дзе голасам чыстым у час суровы
Зваў з цемры люд свой Янка Купала.

Я з той краіны, што ворага стрэла
У сорак першым не як рабыня,
Што ўся — ад неба да неба — гарэла,
Бы свечка, тысячаю Хатыняў.

Там месца нідзе не знаходзілі каты
Ад куль партызанскіх і ад гранатаў.
Былі ў партызанах там дрэвы і хаты,
Была ў партызанах сама зямля там.

Я з той краіны, дзе ліпень купае
Зару ўсю ноч у ставах птушыных
І дзе стагоддзі агнёў купалля,
Чырванакрылых, не патушылі,

Дзе песню новую да небакраю
Нясе маладосць па шляхах вясновых
І плешча мора — вечна жывая,
Мая беларуская звонкая мова!
1967

* * *

Мы б'ёмся над рыфмай,
рвём жылы на гонях,
Ідзём — за ўсмешку адну! —
у агонь мы,
Клён садзім,

ляцім у захмар'е znічкаю —
Шукае, шукае душа гармоніі
У свеце негарманічным.
1968

**ДУМКІ**

**1**

Правадыр, павадыр — ёсць яшчэ ў свеце такія.
І гэты, і той — ад слова «вадзіць».
Ім патрэбна кагосьці вадзіць, каб жыць,
Карацей — ім патрэбны сляпыя.

2

Іх куды хочаш гані — не будзе спрэчкі.
У хлеў ці на бойню: бэ-бэ, бягуць пакорна авечкі.
Ну што ж, на тое яны авечкі, бараны —
Не ўмеюць думаць яны.

**3**

Не прапускаць ідэі,
баяцца адкрытай вайны ідэй?
Але ж ад непаразумення
ўсчацца можа вайна людзей!
Што ж лепей, рашайце, людзі, барзджэй:
Вайна ідэй ці вайна людзей!
1968

* * *

Замятае, лісцем замятае
Поплаў, пасекі, раўкі далін.
Завядзі, дарожка залатая,
У краіну вольх і арабін.

Там цвіце — мой сон заўсёдны — верас,
Па нізах віецца дзераза
І бліпчыць расінка раннем шэрым
На травінцы кожнай, як сляза.

Хай бягуць за голлямі аблокі...

Годы уцякаюць — не лічы...
Глянь, над елкай — рыжык крутабокі
Ды баравікі, нібы карчы,

Ды ў агні нягаснучым асіны —
Не атушаць іх і туманы —
Сняць свае, зялёныя і сінія,
Чэрвеньскія ночы, як чаўны...
1968

**ЖУРАЎЛІНЫЯ ЯГАДЫ**

За лесам сінім, на градцы нязнанай
Спялілі ягады журавы.
А ўвосень сабралі і ўсім караванам
Панеслі ў кошыках да сінявы.

Хацелі данесці да цёплага поўдня
Роднага краю дары.
Ды свіснула бура і з дзюбаў раптоўна
Сарвала кошыкі ўсе ўгары.

Як сонцы маленькія, на імшары
Скаціліся ягады з вышыні.
Ад той пары журавы і зараз
Шукаюць, шукаюць іх дзень пры дні.

Знайшлі іх і людзі, аблюбавалі,
І вось, калі загарацца кляны,
Ідуць на балота і, нібы каралі,
Збіраюць у кошыкі ды ў збаны
Чырвоныя ягады жураўліныя —
Журавіны.
1968

* * *

Як анямеўшы,

стаялі тады мы
Пад талеркамі радыё...
Гараць гарады...
Градам
Білі словы па нас.
Як жа так дапусцілі?
Дзе мы былі дагэтуль?
Гарбелі спіны,
урасталі ў плечы берэты.
Дзе мы былі дагэтуль?
Дзе мы былі дагэтуль?
Так, мы былі ў сябе
(о як мы забывалі на свет,
што рассцілаўся за вокнамі
ў мачтах і кветках!).
Так, мы былі у сябе —
у сваіх кватэрах-клетках,
у цэхах-клетках,
у кабінетах-клетках.
Так, у сябе —
у сваіх рэбраў
клетках.
О як нас кармілі ідэйнай бурдою
тут, у клетках.
О як нас паілі — не сырадоем! —
тут, у клетках!
І мы —
былі п'яныя,
п'яныя
Славай чалюскінцаў
і вадап'янавых,
П'яныя —
мы гэтак п'янелі хутка! —
Ад крутых дыяграм,
ад лічбаў, нядутых і дутых,
Мы былі п'яныя —
ад нашага росту працэнтаў,
Ад урачыстых партрэтаў,
ад бурных апладысментаў,
Ад шуму-грому,
ад электразварак радуг,

Ад велічных одаў
і ад парадаў.
П'янелі мы,
і нябачныя хвалі —
Вышэй і вышэй —
нас усіх уздымалі.
Мы былі ўжо на небе —
мы не бачылі нават,
што робіцца ў нас пад носам,
Так, мы дзесьці луналі ў аблоках
мы верылі плёткам,
даносам.
Мы нават
не зналі.
Саміх сябе
каму
давяралі.
У сеці ружовай маны,
быццам рыбы,
былі мы загнаныя.
Так верылі мы усяму прастадушна,
маною той п'яныя!..
І вось —
па галаве, як прутам жалезным:
Вайна!
Вайна, вайна —
горкі наш,
жорсткі наш
Выцвярэзнік.
Не спіце ж, не спіце, не спіце цяпер —
на галовы, на рукі, на вочы,
на дзіцячую даверлівасць душ —
Бомбавы душ!
Бомбавы душ!
Маўклівым,
мы надзявалі бушлаты,
Плугі свае і станкі пакідалі,
на плечы ўскідвалі
аўтаматы.
Ішлі —
заладзіць-забіць пралом

(ад Чорнага да Балтыйскага мора
ў граніцах і ў сэрцах пралом,
праз які ляцелі агонь, жалеза і смерць).
Чатыры гады (без аднаго месяца)
мы заладжвалі
гэты пралом.
Не бярвеннямі, не жалезам,
не бетонам, не гравіем,
не цэглаю, не зямлёй —
Самімі сабой!
Самімі сабой!
Дваццаць мільёнаў (гэта ўсяго па статыстыцы)
Легла, як скалаў, нас,
Каб заладзіць
Гэты пралом.
1957

* * *

Аднекуль з-пад воблачка —
любуйся любы! —
Злятаюць на мой падаконнік
птахі нябёс — галубы.
Чысцяць дзюбамі пер'е — вур, вур.
Абадкамі вачэй
ловяць раніцы сіняву.
Галубы, галубы —
Яны ніколі не вешаюць галавы.
Яны сумаваць не ўмеюць,
галубяцца
любою
парою.
Натрапяць на хлеба скарынку —
падзеляць заўсёды
пароўну.
Я ніколі не бачыў,
каб біліся яны між сабою
За ежу ці месца
для гнёздаў сваіх пад страхою.

У жыцці для іх
многа не трэба:
Адно
блакітнае неба!
Жывуць у ім, купаюцца ў ім.
Калі ж адпачыць захочуць,
Злятаюць на мой падаконнік
І — ціха вуркочуць.
Вуркачыце ж сабе,
вуркачыце —
Людзей жыць
вучыце.
1968

* * *

Скрозь вуліц і двароў хітрасспляценні
Давай збяжым з табою нацямку
Туды, дзе танканогія алені
Пужліва п'юць азёры ў лазняку,

Дзе вецер — за .лістком лісток — гартае,
Як кнігу, крону белую вярбы
І голас свой прарэзлівы, гартанны
Бяруць у рыжым хмызе журавы...

З пастоў здымае раніца туманы
І сонцам адчыняе далячынь.
Хутчэй абмый расою твар заспаны,
Бяжым, бяжым — у дарагую сінь!

Хай голле лоз зялёных б'е па твары,
Дубцамі елак колкіх хвошча — што ж!
У дальняй далі, пад грамоў удары —
Не плач пра плашч — нас прапалошча дождж.

О ясны май, зялёны і люстраны!
О сполахі высокія камет!
Ці ж рамкай вузенькай тэлеэкрана

Для нас сышоўся неабдымны свет?

Нам трэба спеў прастораў чуць заўсёды,
Пад вольным небам бачыць — не ў кіно —
Рачулак паясы і сонца ўсходы,
Маланак пугі і лугоў радно.

Карціны лепніай не знайсці за тую,
Што на самой зямлі вясна няўзнак
Вясёлкавымі фарбамі малюе.
Які зраўняцца можа з ёй мастак?

Туды, дзе ў дрэвах ходзяць светацені,
Дзе не змаўкае вечнае ку-ку,
Давай збяжым з табою нацямку
Скрозь вуліц і двароў хітраспляценні.
1968

* * *

Далёка ад азяродаў,
там, дзе між хмарамі-марамі
зоркі ледзь-ледзь мігцяць,
Гусі — га-га! — ляцяць.
Над прыгорбленымі стрэхамі
што маўчаць
каля ліп нерухомых),
Над гразёю — аж дрыжыкі! — вуліц,
над бліштачстых лужын холадам,
Над гарадамі-сотамі
(дзе ў светлых ад электрыкі вокнах
снуюць людзі
ў піжамах бяссонна),
Над соткамі
(якія хавае змроку заслона),
Над нрыазёрнымі чаратамі,
над маякамі,
над вякамі,
Як гуслі —

Гусі.
У вырай, у вырай, у вырай —
Гусі ляцяць.
Ізноў ім, ізноў ім, ізноў ім
за далячыняю далячынь
Звонкім ключом адмыкаць.
Будуць пад імі плысці
рэк паясы
і ветрам абсвістаныя даліны
Украіны.
Са сваёй вышыні
яны павітаюцца
З аграмадай Эльбрусам
пад белым абрусам.
Пройдзе паціху
Над крыламі іхнімі,
Як Зямлі блакітная латка,
Адрыятыка.
А там —
мурожнай саванай-выганам —
гэй, прапусці,
маладая вясёлка-арка! —
Афрыка...
Далёка ад азяродаў —
што ім дарогі і межы,
што ім граніцы дзяржаў! —
Гусі ляцяць.
Дзікія гусі ляцяць,
1969

**ГЕРЦЭН**

Ляціць вазок. Раўніны снегавыя.
Бывай, мой край, бывай, бывай, Расія!
Бяру з сабой смуту тваю і зоры,
Твае бары, прасёлкі, тваё гора.
Няхай слупы мільгаюць верставыя —
Я не ўцякаю ад цябе, Расія.
Я не цябе, Расія, накідаю —
Кідаю бенкендорфаў, мікалаяў,

Казармы ды —
        забойцаў светлай мары
Вас, вас, літаратурныя жандары!
О як яны цябе ўсе акруцілі,
Аблыталі, Расія, аглушылі!
Так моцна спіш ты ў снягах.
Паслухаць:
Ад мора і да мора —
        глуха, глуха.
А голас хто падасць —
        жандараў зграя
Ўміг рот заткне тут, аплюе, аблае.
Расія, я не здраднік твой, я воін,
Я еду зброю гартаваць да бою.
Так, еду, ды з табою я да скону,
Я стану, знай, Расія, тваім звонам,
Праўдзівым, непадкупным і магутным,
Каб быў ва ўсёй імперыі ён чутны,
Каб цар дрыжаў, пачуўшы гэты звон,
Каб рухнуў вобзем самаўладдзя трон
1 на абломках тых, пад небам сінім,
Нарэшце ўстала Новая Расія.
1957

## КАЛІНОЎСКІ — АПОШНЯЕ СЛОВА

Бывай здаровы, мужыцкі народзе.
*Яська-гаспадар з-пад Вільні*

Такі іскрысты сёння снег!
Такія белыя аблокі!
Тут, на зямлі,— не ў сне, не ў сне! —
Апошнія лічу я крокі.

Да перакладзін чорных тых
(Чаму бялеюць іх сукі?)
Ўсе дваццаць шэсць гадоў маіх
Вядуць сталёвыя штыкі.

Даруй мне, тата, і бывай:

Я не вярнуся ў нашу хату.
Больш не адчуць рукою, знай,
Тваёй далоні вузлаватай.

Даруй, Марыська, родны птах,
Я і цяпер, нібы дарункі,
На збітым твары, на губах
Нясу твае ўсе пацалункі.

Даруй, даруй: б'е час разлукі
І тую шыю, што твае
Так моцна абвівалі рукі,
Вяроўка сёння абаўе.

Даруйце мне, што ў час юначы
Сябе я гэтак не бярог.
Паверце вы: я жыць іначай
Не мог, не мог, не мог, не мог.

Вы знаеце: ні канакрадам,
Ні казнакрадам я не быў
І казытлівы пах улады,
Паверце, ў ноздры мне не біў.

Я не таму йду паміраць:
Мне напляваць на тья троны,
На каралёў усіх кароны,
На крык іх скарбаў — напляваць!

Пячэ мне сэрца боль другі:
Як ластаўку, на згубу
Няшчасны край мой дарагі
Дзярэ арол двухдзюбы!

Мужык, у крук сагнуты, тут —
Ці спёка, ці разводдзе —
Валочыць паншчыны хамут
З стагоддзя у стагоддзе.

Цар толькі прывід волі даў:
Па ўсіх палях наўкольных

Адзін бізун, як і гуляў,
Ізноў гуляе вольна.

Ды што цару народа енк,
Што слёзы паланянкі:
Абы ён толькі піў ды еў
Ды ладзіў пагулянкі.

Цары ж са смакам хочуць жыць,
Жыць з сэнсам і без сэнсу!
Народ ім трэба, каб давіць,
Народ ім трэба, каб даіць,
Каб, нібы па масту, хадзіць
Ім па касцях і сэрцах!

Ну, а каб лёгка клаўся ён
Пад царскія падэшвы,
Вылазяць зграі халуёў
Для «апрацоўкі грэшных».

О, я вас знаю, халуі,
Пасобнікі разбою!
Адна ў вас мара — на чаі
Вам кінулі б паболей.

Перад дваром вы — бараны,
Угоднікі, маўчальнікі —
Вам хоць бы выбіцца ў чыны,
Пралезлі б у начальнікі.

Што праўда вам, што вам народ,
Што Бацькаўшчыны гора!
Вам свой напхаць бы толькі рот,
Сваё здаволіць горла б.

Вы ўміг тупы цара дзкрэт
«Правесці ў жысць» гатовы.
З усіх амвонаў і газет
Нам «чысціце» галовы.

А пікні вам — як чорны зброд,

Вы ўсіх распяць ахвочы.
Заткнулі вы народу рот
І завязалі вочы.

О так!
З народа можна ўсё рабіць:
Маеты масціць, вяроўкі віць,
Гнуць дугі, круціць атосы,
Калі ён нямы, безгалосы!

Вось так, народ, ты ланцугі
І цягнеш век, нябога.
Табе убілі у мазгі,
Што гэта ўсё ад Бога.

Ты за цара ў агонь прывык
Ісці, хлуснёй аглушаны,
А цар тваёй рукой, мужык,
Цябе ж самога й душыць...

Калі на край мой крумкачы
Ляцелі хіжым роем,
Вучыў ты, бацька: лепш маўчы
Ды беражы здароўе.
Я не паслухаў, выбачай:
Безабаронны, клікаў край.

І я пайшоў у навальніцу,
У бой зацяты — нож на нож.
«Мужыцкай праўды» бліскавіцай
Я рассякаў нямую ноч...

Цяпер — бывай, бывай, народ.
Даруй за мой канец такі.
Зрабіў я ўсё — на эшафот
Вядуць сталёвыя штыкі.

Усё маўчыць, за небакраем —
Палёў заснежаных абрус.
Мая прыгнутая, глухая,
Мая льняная Беларусь.

Там да сяўбы — мне добра бачна —
Ўжо ладзяць новы я плугі.
Ты знай, жандар: не ўсё ў нас страчана
У далях спее бой другі.

На скатаванае зямлі
Збірай жа, люд мой, новы гром.
Я знаю: прыйдзе час, калі
Тут станеш ты гаспадаром.

*Бывай, здаровы мужыцкі народзе,*
*Жыві у шчасці, жыві у свабодзе*
*І часам спамяні пра Ясысу свайго,*
*Што загінуў за праўду для дабра твайго.*
1969

* * *

Так кожнаму наканавала
Доля — міл ці не міл:
Усе мы адыдзем памалу
За небасхіл.

Ды ў сонечным свеце, за брамай,—
Залётная каня, крычы! —
Будуць цвісці гэтаксама
Яблыні і касачы.

Белай сям'ёю крылатай —
Новага лета паслы —
Будуць на поплаў за хатай
Зноў апускацца буслы.
Я зноў іх убачу! Ахвоча
На свет гэты, тут і там,
Будуць глядзець мае вочы,
Што ўнукам я перадам.
1957

* * *

Усё паўтараецца з веку ў век:
Ад зары да зары
птушкі пяюць бесклапотна на дрэвах,
А ўначы засынаюць спакойна
на голлі між роснага лісця.
Спяць і, мусібыць, сняць,
як і ўсё на зямлі, пра шчасце,
Нават і блізка не падазраваючы,
Што ў гэты час прачынаюцца іншыя птушкі — совы,
(Хаця якія гэта птушкі —
яны ж і спяваць не ўмеюць!),
Лётаючы ад дрэва да дрэва,
яны свае прагавітыя кіпцюры
упускаюць у птушак сонных —
І гіне за песняй песня.
Раніцай зноў прачынаюцца ўцалелыя птушкі
І, не заўважыўшы нават,
што гэта ж няма іх сябровак,
ізноў бесклапотна пяюць, на дрэвах.
Птушкі, як вам сказаць пра небяспеку?
1969

**МУРАШКА**

Ад цямна да цямна —
на нагах мурашка.
Сук, большы ў сем раз за сябе,
схапіла і бяжыць: не цяжка!
І выхадных ёй не трэба,
снуе і снуе ля свайго палаца.
Што значыць —
любая праца!
1978

* * *

Мае землякі —
людзі негаваркія.
Здаўна пра іх кажуць:
на словы скупыя.
Ды мне яны
шмат пра сябе гавораць
Сваімі жытамі,
якім не ўстаіцца ніяк ля небасхілаў Асінава
(каласоў шматгаловае веча!);
Волатамі-стагамі,
што да вясны наваколле духмяняць
(сабралі ў іх косы ўвесь луг казяльцовы!);
Слуцкімі бэрамі срэбралістымі,
дзе сонца збірае мёд
у пладоў яснабокіх скарбонкі;
Дамамі з узорнымі ліштвамі,
дзе, вылецеўшы з-пад разца гаспадара,
паселі навечна — дзюба да дзюбы —
галубоў неразлучныя пары.
Расказваюць мне землякі
пра сябе красамоўна
Вяргінямі ды півонямі,
што ўсё лета гараць пад акном
на высокіх сцяблінах (што паходні!);
Ахапкамі маю,
якім харошаць на свята ганкі і вуліцы
(пахне ўся вёска тады бярозкамі ды аерам).
Пра сябе землякі
мне вельмі шмат гавораць
Нават тады, як маўчаць,
Ідучы, прыгорбіўшы плечы,
За труною свайго вяскоўца,
З якім увесь век аралі і сеялі,
Гулялі ўлазіны і вяселлі,
Спявалі і плакалі...
1978

* * *

Былі тады — ноч,
ты ў слабенькім паркаліку, арэшнік
Ды я, грэшнік.
А зоркі ўсе стаялі, як адна,
У возеры расчыненым, без дна.
А ў беразе праз сон (ці ад савіных лап?) з адчаем
Крычала чайка.
І вабна слалася нам да сцяжыны
Квяцістаю пярынай — канюшына.
І ў шчасця свет вяла (так блізка блузка!)
Конікаў язычніцкая музыка.
1970

**ЗАКОН ВАДЫ**

З дарогі! Вада лёд прарвала!
Бачыце, бачыце,
як яна рынулася на волю —
вал за валам!
Хутчэй, разявака:
лёд
вада прарвала!
О як яна загаварыла,
запела,
забушавала!
А ўсю ж зіму пад лёдам,
як лінь, стаяла.
І не было цішэй вады...
А гэта —
вада лёд прарвала!
Бяжыць,
абганяючы самую сябе,
зрываючы палі, платы,
Спяшае
запоўніць нізы ўсе і ямы да краю!
Такі — закон вады:
вада пустаты не трывае...
1976

* * *

У мяне ёсць мара глыбінная:
Здаць мясцкому ўсе ключы
І з сталіцы, як з лабірынта,
У лясныя нетры ўцячы.

Пасяліцца ля песні чыстай —
Нетаропкага ручая,
У сядзібе зялёналістай
Бестурботніка — салаўя.

Ды пакуль пачакайце,
Лясныя нетры,
Ручаёк булькатлівы,
Баравое паветра.

Яшчэ маю сяброў,
Без якіх
　　　мне нідзе
　　　не ўсядзіцца, не ўспіцца,

Яшчэ недругаў маю,
З якімі
　　　ніяк не магу
　　　не счапіцца!
1971

## Я ПРЫЙШОЎ ДА ВАС

Я прыйшоў да вас, каб сказаць,
Што за горадам ноч, як дзень:
Каля рэчак вербы не спяць,
Ясны месяц стаіць у вадзе.

Там, пры сцежцы, ажыны цвітуць,
Май шугае праз берагі.
Там дзве пары слядоў вядуць
У някошаныя мурагі.

Я прыйшоў да вас, каб сказаць,
Што не раз можна ў свеце кахаць:
Гэта ўсё хлусня, ўсё мана,
Што любоў на зямлі адна.

Хай замерла зямля, як струна,
Хай замоўкла ў палоне сноў,
Цёплым крыллем махне вясна —
Расцвітаюць яблыні зноў.

Я прыйшоў да вас, каб сказаць,
Што няма на зямлі небыцця:
Будзе вечна пад сонцам граць
Залатое кола жыцця.

Як заманліва ўсё наўкол!
Правады на слупах гудуць.
Недзе рэжа сінь ледакол,
Электрычкі па свеце бягуць.

Я прыйшоў да вас, каб сказаць,
Што для нас гэта зоры гараць,
Што не згасне ў крыві маладосць
І што шчасце на свеце ёсць!
1971

* * *

Ты пакрывіў душой —
сказаў не тое, што думаў:
Меркаваў, што ілжывае слова тваё —
толькі кропля маленькая ў моры зла.
А што, калі кожны гэтак жа сама,
змаладушнічаўшы,
пакрывіць хоць раз у жыцці душой?
З маленькіх кропелек гэтых
утворыцца новае мора,
якое — на колькі яшчэ стагоддзяў? —

Перакрые дарогу
да праўды.
1976

* * *

Ідзём мы проста
ў свой час світальны.
Не збіцца б толькі —
О век асляпляльны!
Нас слепіць сонца,
нас слепяць горы,
Сляпні нас слепяць
І слепіць гора.
Ідзём, ідзём мы
праз рыфы, рыфмы,
Нас слепяць міфы,
нас слепяць німфы.
І пот нас слепіць —
нам жыць бы лепей!
Нас думка аб хлебе
маланкаю слепіць.
Ды я не жадаю
быць асляплёным.
З вачэй здзіраю
святла заслону.
Хай наша зорка
зіхціць выразна.
Нам трэба зоркасць,
нам трэба яснасць!
1971

## ІНТЭРНАТ

Нашто нам сваркі, людзі!
На планеце
Народ народу — друг,
таварыш, брат.

Хай свеціцца між зорак у сусвеце
Зямля —
людскі наш інтэрнат.
1976

**НА ПЕНСІЮ**

Такі закон жыцця ўжо ёсць:
Ледзь прыйдзе старасць, нібы госць,
Табе ўжо ў плечы весела
Лакцём штурхае маладосць:
На пенсію! На пенсію!
І мы, былыя дзеячы,
З абжытых месц устаючы,
Са скрыпам хто, хто з песняю —
Здаём другім свае ключы —
На пенсію! На пенсію!
І мроіцца нам ціхі рай:
Гурочкі сей, грыбкі збірай,
Павуджвай рыбку прэсную
Альбо ад суму памірай —
На пенсію! На пенсію!
Чуў свет, як выступаў спявак,
Быў ён цудоўнейшы мастак,
Ды час прыйшоў, і спеўся ён.
Што ж, адпачні, браток, раз так —
На пенсію! На пенсію!
А гэты Заг так крэсла ўгрэў,
Так да яго ён прыкарэў,
Так ля яго раз'еўся ён,
Што — не пытай — хутчэй памрэ,
Чым пойдзе сам на пенсію!
Яму, такому таўсцяку,
Што толькі спіць у халадку,
Гукнём: зарос ты плесняю!
Аддай старно маладняку —
На пенсію! На пенсію!
Амаладжаецца жыццё,
Нібы на дрэве тым лісцё!
1972

## ХАДЫКА

*A w lesie między mszarem jest wysepka dzika,*
*Na niej ogromny pszczelnik — pasieka nie lada —*
*A naryd o tej wyspie dziwy rozpowiada,*
*A ten pszczelnik od wiekyw nazwno „Chodyko"[1].*
*Władysław Syrokomla, 1847 r.*

Вёска Хадыка (Нова-Цярушкаўскі сельсавет Салігорскага раёна), якая ўзнікла на месцы легенцарнага ўрочышча, у час вайны была разам з людзьмі спалена нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Дубы ды сосны. Хвошч ды вязель.
Жывіцы выстаялай хмель.
Я думаў: стрэне, даўгавязы,
Над звонкай студняй журавель.

Я думаў: сонечную казку
Раскажуць ліштвы, а ў акне
Адчыняць вейкі — кал і ласка —
Блакіт нябесны ў сэрца мне.

Я думаў: ля прысад рабінавых,
На вуліцы, дзе мурава,
Акружыць стайкай вераб'інай
Мяне вясковая дзятва...

Дарэмна: у вянку яловым —
Вуглі ды некалькі цаглін.
Дыміць на печышчах вясковых
Расліна горкая — палын.

Той чорны дзень — як цень далёкі,
Ды ўсё запомніў гэты кут.
Па сёння — ледзь ступі — сарокі

---

[1]А ў лесе сярод імшары ёсць астравок дзікі,
На ім вялізны пчальнік — ладная пасека.
Народ аб гэтым востраве апавядае дзівы,
А той пчальнік здаўна завуць «Хадыка».
Уладзіслаў Сыракомля, 1847 г.

Спалохана стракочуць тут.
1972

### ПЕСНЯ ПАРТЫЗАНА

Ты думаў, фашыст,
што, кінуўшы голае цела мае ў лёд сцен,
Ты ўсё ў мяне адабраў:
кашулю, якая ад смерці халоднай ратуе;
край мой,
што буслам клякоча над галінастай вярбою;
мову маю беларускую,
што звеку крыніцай у хатах цурчыць, не сціхаючы;
волю, што крылы дае для самых высокіх палётаў.
Ды ты пралічыўся:
забыў ты пра песню,
якая ў сэрцы маім засталася.
І гэтая песня вярнула мне ўсё:
кашулю, якая ад смерці халоднай ратуе;
край мой,
што буслам клякоча над галінастай вярбою;
мову маю беларускую,
што звеку крыніцай у хатах цурчыць, не сціхаючы;
волю,
што крылы дае для самых высокіх палётаў!
1972

* * *

Згубіў цябе. Куды ж пайсці?
Ні адраса, ні тэлефона.
Як промень воч тваіх знайсці
У горадзе мільённым?

Я без цябе — аглухлы грот,
Пусты, без пчолаў, вулей.
Ізноў, ізноў — каторы год! —
Кірую ў джунглі вуліц.

Мо між людзей твая мільгне
Касынка выпадкова?
Мо дзе ўзляцяць насустрач мне
Дзве ластавачкі броваў?

А за вясной — кіпіць вясна,
Не згледзіш — час асенні.
Тапчу, тапчу асфальт звідна,
Шукаю голку ў сене.
1972

**САНЦАХОД**

Быў нада мною Заг.
Да неба нос задзіраўся
        у бюракрата Зага.
О, як пільна сачылі
Загавы вочы-шылы,
Каб хадзіў я
        толькі па яго інструкцыях,
Без зігзагаў,
Каб слова яго
        (гаворачы, ён глядзеў
        з высокай сваёй вышыні)
        я лавіў на ляту,
Каб моўчкі, ківаючы галавою —
        але, але! —
        выслухоўваў я любую яго лухту,
Каб я забываў на сябе,
        каб рабіў толькі так і так,
Каб перад ім —
        о, ён вялікі ў гэтым свеце! —
        поўзаў я, як чарвяк.
Ды я не думаў яму паддавацца,
Выкручвацца і згінацца.
Я нёс — мае права! —
Яму ў зубы заяву.
Пытальнікам вылупіў вочы.
        Так, я штатнае месца

па ўласнай ахвоце
вызваліць мушу.
У павучыную сетку вачэй
хай ловіць іншую муху!
Нада мною ж будзе ад сёння
Справядлівейшы самы загадчык —
Сонца.
За яго настроем
толькі і буду сачыць
дзень за днём,
як сланечнік.
Аднаму яму
буду я падпарадкавацца
вечна.
Зялёная Дуброва — яго абход.
Сонца ніколі яе не мінае.
Тут будуць маімі —
кожны яго узыход і заход,
яго лясы і ўраджаі,
Яго — пад Ласінай балоцінай — клік,
яго арахі за Падліп'ем,
Яго раўкі,
Яго метлюкі,
яго салавей у ліпе...
Тут буду я жыць.
Жураведь — у зары.
Старыя засаўкі ў лопуху.
Тут некуды ў зоры
гадоў вятры
нясуць нашу хату, як лодку.
Даўно нас выветрыла з яе,
не знаю, якой залевай.
Як птушкі з гнязда — хто куды —
разляцеліся мы
па голлях жыццёвага дрэва.
У стане маці.
Месяца грай.
Клятчастымі коўдрамі
ложкі засцелены.
Дзеці! Дзеці!
Гукай не гукай —

толькі вецер за сценамі.
Сышлі
(цяпер адно пісем чакай).
Што ж, не было тут дзецям разгону.
Пайшлі па свеце шукаць свой хлеб,
сышлі з дому.
У вушах — галасы, галасы.
(Пяцярых, без бацькі —
бацьку забрала вайна —
нас выхавала маці.)
У кожнага зараз галінка свая —
абжывай ды мацней трымайся.

З далёкай вандроўкі
(Вы калі-небудзь бачылі,
Як ходзяць Гончыя Псы, Андрамеда і Рыбы?)
Вярнулася сёння Сонца
да лагоў Зялёнай Дубровы.
Яго прачакаліся тут.
Захапіў без яго усе землі Мароз —
акупант гэты люты,
Зачыніў прыроду на свае замкі,
спыніў усяго жывога токі.
Жахнулася Сонца:
як апусцелі яго,
багатыя на раслінны сць,
надзелы!
Дзе падзяваліся птушкі?
Куды пазнікалі мядзведзі,
вавёркі і вожыкі?

Працёршы воблакам твар
(начавала Сонца за Гальм Балотам),
узялося яно за працу.
Небам, небам — пайшло адмыкаць
(якія светлыя і бездакорныя ў яго ключы!)
зямлю-маладу са срэбнай цямніцы.
Выпусціла — ну ж і вясёлы лес! —
лісце бяроз і калін
з цесных пупышак-каморак,
Вольную волю дала траве-мураве,

крапіве — ля платоў,
дурнап'яну, чабору.
Дачуліся птушкі ў сваёй эміграцыі
пра высокае шэсце Сонца,
Ляцяць — паспрабуй спыні тыя крылы! —
да мілых бацькоўскіх дуплянак,
да купін сваіх і соснаў.
Злятаюцца (колькі крыку і гаму!)
жаваранкі і шпакі,
удоды, гусі, заранкі,
Ластаўкі, качкі, зязюлі, буслы.
кані і канаплянкі...
Дадому! Дадому!
Да тумановага краю!
Хаджу я пад небам — нашай сіняй страхою,
і — вырай за выраем —
іх сустракаю.
Бо і сам я — гэткая ж птушка.
Правільней, я не ведаю, хто я.
Завяла мяне сцежка-вілюшка
У няведамыя травастоі.

Што за вербачкі там, ля даліны?
Ці не вы гэта, Пераваловкі?
О як ціха! У гуле чмяліным —
Толькі я ды аблокі.

Тут усё душу маю гоіць.
Гай — хвоі вечным спакоем
і карою сіняй асін —
гоіць;
Караністая сцежка
(унь прабягае па ёй мурашка
з рыжай хваёвай іголкай)
гоіць;
Божая кароўка, што з неба ўпала
мне на рукаў,
(андрэйка, андрэйка,
пень ці калода,
дождж ці пагода?)
гоіць;

Бяссмертнікаў і павояў лапінка
на леташняй пасадцы сасны
(тут рай матылям і яшчаркам)
гоіць;
Трыпутнік і лебяда,
васілёк і зялёнае жыта
над глухой баразною
гоіць.
Поле маё — гоіць,
Дарога — гоіць,
Неба — гоіць.
(На душы маёй — раны, раны.
Мусіць, таму,
што дала мне маці душу,
танчэй ад мембраны.
О, хто яе не чапаў,
не рваў яе абцугамі!
Он, хто яе не таптаў,
не лазіў па ёй з нагамі!)
Сёння ўсё, нават паветра маёй Зялёнай Дубровы,
душу маю
гоіць.
А найлепей за ўсё
самы стары і самы выдатны на свеце доктар —
праца любая —
гоіць.

Я — успомніў сябе.
Я ж — сялянскі дзяцюк.
Якая моцная ў мяне рука!
Ляціць па вёсцы — цюк, цюк! —
Стук майго малатка.

Як гуляю, раблю. Праца — дар.
(А здавалася, што ўжо зусім я ў паперах зачах.)
Як хораша жыць. Я — гаспадар.
Я сам расту ў сябе ў вачах.

Потым ускіну на плечы касу —
У траву, у расу
Панясу.

Сілай мераючыся,
Стану з дзядзькамі вясковымі ў рад,
Рад.
Недзе там, за Канаваю,
Не затоптаны мо, як след,
Стыне мой след.
Колькі там пабывала вятроў,
Праляцела снягоў!
(Наспрабуй злічыць!)
Толькі радасць дзядоў,
Што свой хлеб
Мазалём здабывалі,
Я не здолеў забыць.
За шмат год не прыжыўся
(мо гэткі падвой?)
Я на глебе другой.
Што рабіў я,
не ведаў,
нашто я раблю.
Я любіў
і не ведаў,
ці праўда люблю.
Галава ўжо была
у мяне — не мая,
І рука мая —
        не мая.
Я не ведаў,
        дзе я,
Дзе —
        не я.
Павуціну,
        што, быццам бы кокан,
        мяне пачала аплятаць,
Я рашыў разарваць!
Абдзіманчык, святі,
        ліст, спявай на вярбе —
Я вяртаюся
        да сябе!

Намянташу касу,
        абатру расой

І пайду —
адхінайся, шырокі мой луг! —
Паласой, паласой.
Буду кідаць, як вежы, стагі,
буду поле, што пахне дажджамі,
араць.
Буду кожны свой дзень
(што нясуць жаўрукі),
нібы свята,
страчаць.
Тут, пад Сонцам маім,
у вялікай сяўбе,
Адшукаю сябе!
1978

**ЛІСЦЕ**

На дрэве — лісце. Добра ў небе сінім.
Пра вечнасць сні...
Але раптоўна — сівер,
І ліст за лістам — у траву, у прах.
А мы?
Не, мы — не лісце на вятрах!
1972

**ОДА ОДАМ**

Не заводам,
Не параходам,
Не гарадам,
Не гародам —
Складаю я оду
Одам.
Якія ў іх стройныя строфы!
Якія ў іх трапныя тропы!
Як лоўка
яны пад цябе падплываюць,
стругі!
Як вытанчана перабіраюць

душы тваёй струны!
Як дух узвышаюць заўсёды!
О оды!
Оды сталіцам,
Оды дварам,
Оды феліцам,
Оды царам.
Быў цар — чалавек.
          Былі і ў яго хібы.
          Як і ўсіх, браў яго одум.
Ды вось аддалі цара
          одам.
Слоў агняцветных рэкамі,
          морам алею і мёду
Затапілі цара оды.
О як умелі хвалу пець оды!
Галаве — оды,
звілінам розным яе — оды,
вачам,
якім за трыста гадоў наперад відаць,— оды,
Рукам,
якім дадзена сонца найкруг рассяваць,— оды,
брывам — оды,
вусам — оды,
вушам — оды...
Так услаўлялі оды цара,
          так узвышалі,
          так малявалі,
Аж паз ні калі ў яго
          ўсе бародаўкі, шрамы,
Вуглаватасці і радзімыя плямы,
Пайшло расці тулава ў неба,
          ушырыню — плечы,
Запоўніўся лоб
          мудрасцю нечалавечай...
Вось так з чалавека —
          ні мала ні многа —
Оды рабілі
          Бога.
Шумелі оды,
Шалелі оды,

Ды на зямлю ўжо даўно прыляцелі
Інакшыя годы.
Ходзяць, скісшы,
Одапісцы:
Няма ўжо моды
На оды.
Няма і не будзе.
Хай людзьмі застаюцца людзі!
1973

* * *

Вось ізноў — праз безліч гадоў! —
у руках маіх простая пуга сырцовая:
я пасвіць каровы ганю
(Што ж з таго, што на імя маё
навешана тытулаў розных вучоных).
Сонца яшчэ не прыйшло на зямлю.
Але яно недзе ўжо блізка:
пабялела на ўсходзе унь неба,
вераб'і прачнуліся ў бэзе,
І певень, першы саскочыўшы з седала,
шукае курам на двары пачастунак.
Каровы, вытураныя жаночымі кухталямі за брамы,
стаяць сярод вуліцы, выцягнуўшы ўперад
галовы,
І сонна жуюць сваю жвачку.
Я доўга хаджу ад ад ной да ад ной,
пакуль не скранаю нарэшце іх з месца.
Цячэ па вуліцы статка рака.
На выгане яна разліваецца ва ўсе бакі.
Цяпер на планеце адзін толькі гук —
скубуць каровы расяную мураву!
(І што я рабіў дагэтуль?
Для чаго разменьваў свой, і без таго скупы, век?)
Булькоча ручай недзе на дне зарослай канавы
(Мусіць, трапіўся камень яму на шляху),
Зялёная жабка, скокнуўшы неўпапад,
застыла ў мяне ля нагі

(думае, што я не бачу яе між травы),
Разгалісты дуб, не надта стары,
але з чорным дуплом унізе,
(і ў каго падымаецца рука тут класці агонь?)
Яшчэ зусім не прачнуўся:
не зварухнецца на ім нават ліст.
А ў небе, узляцеўшы з зялёнага цёплага жыта
і ля хмаркі суняўшыся, як верталёцік,
Запеў — такую старую, знаёмую і такую новую песню
жаўранак —
шэрая птушачка палявая.
А мо гэта зусім не жаўраНак?
Мо гэта сэрца само
песню бацькоўскаму краю спявае?
1973

**ПЕРШЫ КРЫК**

Ау, айкумена[1]!
Каметай
рассек я сцяну нематы.
Ад бабчыных пальцаў вось гэтых
і да нябёс яснаты —
зычны мой крык.
Гэта —
продкаў
спрасованыя галасы.
Ау, айкумена!
Глотка
мая перапоўнена
(«сын!»).
За вокнамі — ходзяць вёдры...
Рыпяць па сяле жураўлі...
І дзядзька ў белай кашулі
(ён вёз паўз платы канюшыну з Альхоўкі)
каня ля акна прыпыніў...
Я — з самага ціхага краю
(замарудзілі й рэкі там бег).

[1] Айкумена — населеная частка Зямлі.

Ау, айкумена!
Гукаю
галасамі радзімы табе!
1973

### СІТА

Калі прасяюць праз сіта мліва,
адкідаюцца ўсе шалупінкі і крупкі,
што не ўзялі камяні жорнаў —
застаецца адна, мяккая, як пух, мука.
А што, калі прасейваюць думкі?
Адкідаюцца, як непатрэбшчына, думкі —
застаецца адна, мяккая, як пух, мука.
1973

* * *

Бываем мы часам,
    што пушчы, запушчаныя,
Ідзём па свеце,
    як невідушчыя.
Нават ад чорнага белае
Не заўсёды адрознім смела.
Мы блытаем, блытаем
    вечна
Авечку з воўкам у шкуры авечай.
І часта —
    ад роспачы як не крыкну! —
Прымаем за чыстую праўду
    крыўду.
Ля сэрца нават
    яе хаваем,
Яе гадуем,
    яе люляем,
Покуль яна —
    крыўда ёсць крыўда! —
Нам жа пад сэрца

нож не ўсадзіць
крыва.

1973

## ПРА МАЙСТЭРСТВА

Ён, кажаш, майстар сваёй справы?
Ён, кажаш, варт высокай славы?
Прабач, а можа, не спяшаць
Нам з пахвальбой такой? Спярша
Я знаць хацеў бы, знаць яскрава:
Якой усё ж ён майстар справы?
Ён — ураджаяў слаўных майстра
Ці майстра «браць» з чужое кайстры?
Ён — майстар гадаваць сады,
Да сонца ўзносіць гарады
Ці майстар бомб, якімі недзе
Махаюць над людзямі нелюдзі?
А! Майстар слова адмысловы!
Тады скажы, якога слова?
Таго, хто вочы раскрывае
На хараство і славу краю?
Што, як пражэктар дальнабачны,
У заўтра нам дарогу значыць?
Ці мо таго, што хоча ночы,
Што нам усё кадзіць у вочы
Салодкім ладанам падману —
Пабольш бы напусціць туману?..
«Ён знаны майстар...» Тым нічога
Ты не сказаў пра майстра тога!

1973

## САКСАУЛ

Слаўлю саксаул я:
і ў пустыні,
Дзе вятроў раз'юшаных разгул,
Ён прабіўся скрозь пяскі крутыя
І цвіце па-свойму,

саксаул.

1973

## ДЗЯДЗЬКА АДАМ

У вёсачцы нашай некалі жыў дзядзька Адам.
Казалі, і птушкі ніколі не зачапіў дзядзька Адам,
Касіў, поле араў, баранаваў дзядзька Адам,
Сыноў і дачушак малых гадаваў дзядзька Адам.
Век прахадзіў між знаёмых палёў і лясоў
дзядзька Адам,
А паміраць аж за трыдзевяць земляў пайшоў
дзядзька Адам.

1973

## «ГАПОН» В. ДУШНА-МАРЦІНКЕВІЧА Ў МІНСКАЙ КНІГАРШ, 1855 ГОД

— Ці бачыла, пані Альжбета:
кніжка, пісаная беларускаю мовай! Ха-ха!..

— Як?! Гэтай хамскай, мужычаю,
пастуховай? Хі-хі!..

— Мо і пісалі для хама,
што возіцца з гноем няспынна? Ха-ха!..

— Што спіць у бруднай халупе сваёй
са скацінай! Хі-хі!..

— Мо пан аўтар зрабіць мужыка
грамацеем мяркуе? Ха-ха!..

— Чаго добрага, кіне пугу хам'ё
ды ў школу яшчэ пашыбуе! Хі-хі!..

— Стане вучоным мужык,
будзе пісаць трактаты! Ха-ха!..

— На асамблеі ў сталіцы
будзе сядзець дэпутатам! Хі-хі!..

— А можа, ў міністры
паперціся ў лапцях захоча? Ха-ха!..

— На трон каралеўскі
у шарачку заскочыць! Хі-хі!..

— Кіраваць яшчэ ўздумае
намі, панамі! Ха-ха!..

— З зямлі гэтай нас прагнаць зажадае
нашымі ж бізунамі! Хі-хі!..

— Ха-ха!..
— Хі-хі!..
1974

## ДЗЕКАБРЫСТЫ

Вірам — плошча Сенацкая:
мы паўсталі —
Сцяну векавую маўчання
узарвалі.

О як шчыра ляпілі цары
(што аж праглі народ ашчасліваць)
гэту сцяну!
Як яе мацавалі,
сцераглі, пільнавалі,
гэту сцяну!

Шабля жандара
кроіла крыва краіну — сцяна,
Свісталі бізун ды нагайка па спінах —
сцяна.

Ці ж не даволі

праўды шукаць у двары мужыкам — сцяна,
Жыць на Русі толькі добра
цівунам ды шпікам — сцяна.

Край навылёт пранізалі
іх вочы-пікі —сцяна,
Шчыліны ўсе абляпілі
чуйныя вушы без ліку — сцяна...

О, за гэтай сцяною глухою,
людскою бядой мураванаю,
Было як у Бога за пазухай
Дому Раманавых.

Думкамі голаў цары не забівалі
у светлым раі:
Пра ўсё за іх дбалі
іхнія халуі.

Рукамі тых халуёў
грэблі яны
з душ падданых даніну,

Рукамі тых халуёў
з дзіцячых ратоў
выдзірапі яны
хлеба скарыну.

Трэба ж былі царам
з золата толькі палацы,
Трэба ж былі царам
сабакары ды паяцы.

О як апявалі яны цароў, халуі,
О як у ладкі пляскалі з усіх бакоў, халуі
(Вы думаеце, гэта нішто — ладкі?
На гэтых ладках, бяздумных ладках,
растуць тыраны, як на аладках).

А як таленавіта
лікі цароў

халуі малявалі —
сонцы нібы!
Якія ясныя вокал галоў
выводзілі німбы!

Як перад тронам падалі на калені,
як білі чалом у зале!
З якой шчаслівай усмешкай
яго вялікасці
боты лізалі!

Таго ж, хто не ўмеў боты лізаць,
халуі навучыць кляліся,
Прысягалі царам: усіх, як ёсць, закілзаць —
ліся, золата, ліся!

Так, і кілзалі, кілзалі, кілзалі,
Рукі і ногі «няверным» вязалі,
Вучылі шпіцрутэнамі, штыкамі,
Лютымі нерчынскімі руднікамі.

Таўклі ў мазгі ўсім — год за годам,
Што цары — гэта слугі народа,
Хоць было зусім наадварот:
Не цары былі для народа,
Для іх быў народ.

Спрадвеку раджаліся ўсе і жылі — для цара,
На смерць, не думаючы, ішлі — за цара,
Малілі,
каб Бог зберагаў (шмат зім і лет) — цара,
Думалі, скончыцца свет — без цара.

Ды падданых сваіх
цар ясналікі
Нават не бачыў з трона —
быў занадта вялікі.

Для яго людзі ўсе — мухі:
Якія ў іх могуць быць мукі?
Яны толькі пешкі ў царскіх забавах — войнах,

Людскіх недарэчнейшых бойнях.
Імі, бязмоўнымі мужыкамі,
Біцца можна з другімі царамі,
Біцца, як бітамі, як шарамі,
Біцца галовамі іх,
            ілбамі.

Усё роўна не скажуць яны ні слова:
На тое ж аднята ў іх мова.
Можна смела іх кідаць у бой,
Гнаіць у акопах...
Не!
Хопіць!

Гулкім грукам па бруку — боты:
На плошчу, на плошчу, паўстанцкія роты!
Локаць да локця (духам слабыя, прэч!)
Строяцца, строяцца роты ў карэ.

Досыць маўчаць —
            у бой з пракаветным горам!
Мы выйшлі на плошчу,
            мы сёння гаворым!

Мы кажам:
            род царскі — тыранскі,
            пад корань яго, да семя!
Каб і ў вяках не было яму
            уваскрасення!

Хай тыя, што сеюць, што веюць,
            што жнуць, што аруць, што будуюць,
Краінай і доляй уласнай
            кіруюць.

У іх ёсць свой розум —
            ну, хіба ж яны калекі?
Яны ані ў кога
            не просяць апекі...

Мы на плошчы Сенацкай.

За ёю — прасторы, прасторы...
Мы доўга маўчалі,
мы сёння гаворым!

О як ад той мовы трон скаланула —
крывавае катаў крэсла!
О як ад той мовы прачулай
дробна каленькі ў цара затрэсла!

Апекуна-цара ратаваць
выбеглі ўсе лізаблюды
(О як ірвуцца яны паказаць
сваю адданасць усюды!).

Трымацца, паўстанцы: між здрадніцкіх плеч
цар артылерыю коціць!
Акружана плошча.., і вось карцеч
нас косіць, нас косіць, нас косіць.

Ды голас высокі наш — не заглушыць
гулам гармат грымотным!
Ён да краю зямлі даляціць,
мур часу праб'е, несмяротны!

Хай ведае свет: на цара з гайнёй
меч помсты смела ўзнялі мы.
Мы выйшлі вайной, мы выйшлі вайной
на рабства — гора радзімы.

...Меч Расіі
аголены, чысты —
Дзекабрысты.
1976

* * *

І рыбе ёсць што сказаць, і рыба
Шмат што паведала б свету
(У яе ж таксама бывае

І гора, і боль, і свая радасць!),
Але сцяну нематы прыроднай
Прабіць яна анічым не можа.
Нават калі з вады яе вырвуць
І ёй трэба крычаць на чым свет,
Яна толькі рот разяўляе нема...
Як часта і я сябе чую
          той рыбай!
1975

* * *

Не, не кажыце мне — вайна
Не пахавана ў сорак пятым,
Усё яшчэ курыць яна
У свеце, як струна, нанятым.

Ад галасоў эфір гудзе,
Ляцяць газеты ў свет гайнёю.
Не на жыццё, на смерць ідзе
Вайна між праўдай і манюю.

Памалу топіць лёд вясна,
Ды шчэ далёка да парадаў.
О як жа часта шчэ мана
Усё-ткі верх бярэ над праўдай!

Дык ці ж сядзець байцу ў баку
Ад бітваў ярасных стагоддзя?
На фронце мы з табой, пакуль
Пад сінім небам крыўда ходзіць!
1977

* * *

Ты мне казала:
          — Без цябе дайду дадому, адыдзі!
А вочы гаварылі:

— Праўдзі...
Ты мне казала:
— Ну! Без рук! Пусці хутчэй!
А твае рукі:
— Прыгарні яшчэ!
Ты мне казала:
— Не цалуй мяне, благі!
А губы зноў шапталі:
— Дарагі...
Ты мне казала:
— Што ты! Нельга! Цвёрда кажу я!
А сэрца стукала:
— Твая, твая...
І добра ўсё ж, што ў часе залатым
Паверыў я зусім не словам тым,
А твайму сэрцу,
трапяткім губам,
Рукам гарачым,
маладым вачам!
1975

**ЛЕГЕНДА ПРА ВУЛЛЯНУ**

Што чуў, раскажу я. Не знаю —
праўда гэта ці казка.
...Млелі пагоркі пад небам
у белых і жоўтых красках.

А ўверсе кудысь аблачыны
плылі — гарбатыя стругі,—
і пчолы ў дарозе да борцяў
званілі ў нябачныя струны.

Па разнатраўі ў сукенцы
ля кургановў, што заснулі,
бегла лёгка Вулляна,
гнуткая, бы казуля.

Даўгая каса Вулляны
нібы з ручаёў была звіта,

сінела ў касе дзявочай
валошка простая з жыта.

Там, за пагоркам лабатым,
пад галінастым дубам
чакаў у рамонках хмельных
яе Сцяпан светлачубы.

Хоць ён бядняк, хоць са зрэб'я
у Сцяпана кашуля,
ды што ні вечар ляцела
ў рукі яго казуля.

А потым па вуліцы вёскі —
няўжо ж угледзяць аконцы? —
на белых плячах насіла
яго пацалункаў сонцы!..

І вось да яго зноў імчала,
і ёй — па лытках, па лытках —
галоўкамі шлёгалі смолкі,
шчаўе ды хвосткая снітка.

І раптам — дзяўчына не знала,
як атрымалася гэта,—
ледзь яе з ног не збіла
праезджага пана карэта.

— Тпру! — нацягнуліся лейцы,
і з карэты багатай
скочыў на дол травяністы
пан той, круглы, вусаты.

Штосьці сказаць хацеў ён,
ды з паўадкрытым ротам
так і застыў на месцы —
бы мову яму адняло тут.

Красы такой аніколі
не бачыў ён і за морам:
тварык — як месяц ясны,

а вочы яе — азёры.

Апамятаўшыся неяк,
загаварыў з Вулянай,
што палахліва глядзела
на незнаёмага пана.

— Калі ты і праўда ява,
а не сон і не казка,
будзь жонкай маёй ад сёння,—
сказаў ён дзяўчыне з ласкай.—

Я — князь, і за мною таксама
станеш сама ты княгіняй,
у крышталёвых палацах
будзеш ты гаспадыняй.

Я ўсё табе дам, ты будзеш
жыць без турбот, як галубка.
Будзеш віно залатое
піць з сярэбраных кубкаў.

Ад ласкавых слоў тых Вуляна
уся расцвіла, як вяргіня —
якая ж паненка, скажыце,
не марыла б стаць княгіняй!

Есці смачныя стравы,
у шаўкі апранацца!..
У думках была ўжо Вуляна
ў сонечных тых палацах.

Ды ўспомніла тут дзяўчына
мілую ўсмешку Сцяпана...
Як жа яна прамяняе
каханне сваё на пана?

— Не,— аглядзела Вуляна
панскі ўбор асцярожна,—
я не магу даць згоды,
князю яснавяльможны...

Ты мне даруй за гэта
і не судзі мяне строга:
пайсці б за цябе я рада,
ды... я кахаю другога.

— Хто ж ён? Якога звання? —
нахмурыўся твар у пана.
— Кравец ён, Сцяпанам клічуць,—
горда ў адказ Вуляна.

— Што? Ты смяешся з князя? —
падскочыў пан, як ад джала.—
Я не дарую! — І віхрам
карэта з тым князем памчала.

Нідзе дасюль і ніколі
не ведаў князь перашкоды:
прывык ён, што б ні надумаў,
свайго дабівацца заўсёды.

Не думаў і тут адступаць ён,
разгневаны не на жарты.
— Ты будзеш маёй, ганарліўка! —
сказаў сабе князь упарта.

Была падуладна князю
не толькі гэта зямля ўся,
але і нябёсы: ён нават
з самім усявышнім знаўся!

Князь да яго і пастукаў
у нябесныя дзверцы.
На чорную справу ўсявышні
даў згоду — не меў, пэўна, сэрца.

На крыллях сваіх нябачных
памчаў туды, дзе на грудзе
сядзеў Сцяпан каля дуба,
адзенне шыючы людзям.

Сыпнуў на Сцяпана чароўным
зеллем з нязнаных гародаў,
і хлопец светлавалосы
каменем стаў назаўсёды.

Прымчала Вулляна птушкай
на стрэчу чаканую з любым,
ды замест хлопца сустрэла
камень немы пад дубам.

Падбегла туды і з плачам,
што трос яе плечы рыўкамі,
акамянелага хлопца
абхапіла рукамі.

А князь той ужо Вулляну
чакаў ля зялёных пагоркаў,
ды, не прычакаўшы, пад'ехаў
к дзяўчыне, што плакала горка.

— Не плач дарэмна, Вулляна,—
крануў яе князь нецярпліва,—
пакінь гэты камень — ты станеш
у свеце самай шчаслівай.

Ды князя нават і слухаць
Вулляна не пажадала —
да сэрца тулячы камень,
яшчэ мацней зарыдала.

Так плакала несуцешна,
што ад слёз яе горкіх
між незабудак і братак
пабег ручаёк з пагорка.

А потым у полі зялёным
пад зарою калянай
сама слязамі сышла ўся
і стала ракою Вулляна.

Па сёння цячэ між красак

яна беларускай зямлёю.
Па сёння й завецца Вуллянай,
Віліяю, Вяллёю.
1975

**ДАРОГІ**

Я слаўлю дарогі.
Яны прыйшлі на зямлю
з чалавекам:
дарог у звяроў няма.
Ад дыма да дыма,
ад дзядзінца і да дзядзінца
пратоптвалі
нястрымныя ногі людскія
дарогі.
Вялі заўсёды дарогі туды,
дзе дабрыня вачэй,
усмешак сонцы,
гаворкі людской пералівы —
ці ж чалавек без гэтага
быў бы шчаслівы?
(Гэта ж воўк толькі можа
сядзець у сваім лагве
ды выць у зоры.)
Валіла людзей бясхлебіца
(як страшна закатваліся ў іх вочы,
гледзячы ў свет бялкамі!),
але, як жывая вада,
зноў ставілі іх на ногі
дарогі.
Яны развейвалі ўмомант бяду,
прыносячы людзям
жытняга хлеба скарынкі,
парад людскіх падарункі найдаражэйшыя,
песні
ды сэрцаў шчодрых іскрынкі.
(Не віна дарог,
што на іх выпаўзала так часта
страшыдла з пашчаю крыважэрнай —

вайна.)
Дарогі —
найвыдатнейшыя помнікі чалавецтва.
Але на іх не трэба вешаць таблічкі
са словамі: «Ахоўваецца дзяржавай» —
дарогі будуць датуль,
пакуль будуць людзі.
1976

* * *

Чалавек — гэта свет.
*З кніг*

Памёр чалавек —
Самкнуліся вейкі...
Свет, што ў вачах яго
граў і іскрыўся,
зачыніўся навекі.
Якія сонцы і сосны,
Аазісы і вясёлкі,
Якія ружы і руны,
Сэрца найтонкія струны
былі ў гэтым свеце абжытым!
Памёр чалавек
і з сабою ў зямлю
свет свой панёс,
Свет, які так і застаўся
нікім не адкрыты...
1975

* * *

Пакуль маё сэрца замкнёна было
на цяжкі, як наледзь, замок няве р'я,
Яно здавалася мне з кулачок, не большым.
А гэта ж у ім —
рэкі шырока плывуць,
хвалямі плёскаючы аб берагі,

А вясновыя зіхацяць
золатам лотацi,
незабудак блакітам,
Вятры паднябесныя граюць
на карабельных мачтах нанятых,
Сонца гуляе,
гараць прамяніста планеты і зоры сусвету.
Вось якім стала сэрца маё неабдымным,
Калі ты адамкнула яго
Ключом свайго чарадзейнага слова:
«Кахаю...»
1976

* * *

Рассыпала ноч алмазы
Па дахах дамоў, па рамах.
Блішчаць усе яны разам
У мілых вачах таксама.

Збірайце ж вы іх, збірайце,
Збірайце, пакуль маладыя,
І ў сэрцы сваім зберагайце
Алмазы найдарагія.

Дарога жыцця — немалая,
На ёй будуць церні і цені,
І часам аслепіць — бывае! —
Вам вочы чорная цемень.

Ды вы любыя запруды
Адолееце адразу,
Калі асвятляць вам будуць
Дарогу тыя алмазы!
1976

* * *

І дабрата і прыгажосць —
Гляджу: такое спалучэнне!
А можа, гэта ўсё і ёсць
Душы высокае свячэнне?

Прамень твайго святла і я
Злавіў вачмі ў паглядзе шыбкім,
І адгукнулася мая
Душа на промень той, як скрыпка.

Імчала электрычка нас,
За шклом мільгалі святлафоры
І неба немае, дзе — час! —
Збіраўся зор высокі форум.

Дзесь ля Ушы, нібы рака,
Вагон запоўніла вяселле,
І ўжо віхуру гапака
Панеслі колы між аселіц.

Нас грэў вясёлы танец той,
І падпяваў паціху кожны:
Ты —
ява казкі залатой,
І я —
вандроўнік спадарожны.

На развітанне з цеплынёй
Ты пасміхнулася мне ветла,
І ў чорнай цемені начной
Мне раптам стала гэтак светла!

Ішоў я, повен мараў-сноў,
Асенняй вуліцаю хліпкай,
І пела, пела, пела зноў
У сэрцы сонечная скрыпка.
1976

* * *

Хто месяца жарыну
Ў надбор'е запусціў?
О як ён азярыну
Начную асвяціў!

Паслаў — каму пад ножку? —
Жывую, з серабра
Нябесную дарожку
Па хвалях і вірах!

Пайшла яна — успышкамі —
Па беразе ў расе,
По голках хвой, па шышках,
Па верасе.

Хто месяца жарыну
Ў надбор'е запусціў?
І чый там, у ажынніку,
Гарачы шэпт: «Пусці!»
1976

## КАЗІМІР ЛЫШЧЫНСКІ[1]

...Таму прадстаўляю перад вашай каралеўскай вялікасцю ворага божага, страшную пачвару і хімеру, ніколі дагэтуль не бачаную — Казіміра Лышчынскага, брэсцкага падсудка. Я абвінавачваю яго ў тым, што ён асмеліўся на 265 лістах не толькі паказаць пана Бога як неіснуючае тварэнне фантазіі, сляпую выпадковасць і зрынуць яго з недасяжнай вышыні, але і асмеліўся прыпісаць уладу і кіраванне зямлёй і небам натуральнай прыродзе...
*З прамовы Сымона Куровіча, інсцігатара Вялікага княства Літоўскага, па справе атэіста Казіміра Лышчынскага, брэсцкага падсудка, на Варшускім сейме 15 лютага 1689 г.*

[1] Казімір Лышчынскі — беларускі філосаф, які за свае атэістычныя погляды, выкладзеныя ў трактаце «Аб неіснаванні Бога», быў па прыгавору сеймавага суда ў Варшаве спалены на агні.

Я — гару!
Агонь мае ногі ліжа,
Скача — на грудзі, на грудзі! —
раз'ятраным лісам.
Я — гару!
Патушыце мяне, патушыце!
Людзі!!!
Што ж вы маўчыце?!

Што ж ад мяне адвярнулі —
такія лядовыя! — твары?
А, гэта ж і вам я —
«пачвара»!
Вам, каму расказаць
гэтак прагнуў,
Як, хіжыя,
укралі ксяндзы ў вас праўду.

Душы вашы прыдбаўшы,
заслаўшы кадзілам вочы,
Вякамі водзяць зладзеі
вас сярод ночы.

Водзяць, водзяць,
нібы авечак па пасту,
Вас —
сляпую паству!

Я прыйшоў да вас, каб скрануць
замшэлы валун іх догмаў.
Як кінуліся ксяндзы на мяне!
Люцей за догаў!

Хаця ж бы ад ерасі-яду
ўратаваць вашу веру —
У агонь, у агонь
хімеру!..

Я — гару! Я — гару!
Тры стагоддзі гару —
З вамі ўсё

гавару...
1976

* * *

Каташкі на вольхах, каташкі...
Нібы залатымі кутаскамі,
Зноў паабчапляліся ляскі
Ля маёй Дубровы каташкамі.

Край бацькоўскі! Я ізноў жыву!
Тыя ж хмаркі белыя ў блакіце,
Так жа каня падае ў траву,
І жаўцее лотаць у ракіце.

Ля дарогі рупны трактарок
Ходзіць полем з жаваранкам спеўным.
Там — пастух ля статка: хто — здалёк
Не пазнаць, ды ён дуброўскі ж, пэўна.

Падыду да дзядзькі. Пастаім
Ля дымка ягонай папяроскі.
Як вядзецца, пагамонім з ім
Пра жыццё, пра ўсе навіны вёскі.

Я не госць тут. Тут — мая зямля.
І свой край я не аддам нікому!
Забрыду за свет хай, дый здаля
Сцежка прывядзе мяне дадому.

Азярко сінее між куп'я,
У стае зара — зямлі карона —
Над вясёлым жытам. Я тут — я.
Тут мае і карані і крона.
1976

* * *

Ізноў я прачынаюся на сене...
Ка мне ў адрыну,
дзе сонца напрацягвала праз шчыт
ружовых паскаў,
Збягаюцца ўсе гукі раніцы.

Вось бразнула вядро ля студні
і журавель свой рып пацёг уніз,
пасля ізноў уверсе расскрыпеўся...

Залапатаў на прыгуменні Віцеў трактарок —
нядарам жа празвалі яго дзеці «лапатунчык»:
малы, а гуку — на ўсю акругу...

З двара шафера Ромы
(вясной ён жонку яснавокую
прывёз з-пад Слуцка)
Рассыпаўся сярэбраным пясочкам
грудны і звонкі голас: «Ціп-ціп-ціп!»

Тут нашы рыпнулі варотцы:
«Цётка Надзя!!— голас брыгадзіркі.—
Пойдзеце наранкі на сянаж!»
(Так, гэта — мацеры нарад:
сягоння за яе
Я з віламі пайду раўняць зялёны бурт.)

Праз дзірку ў даху ластавачка пырхнула
(не, я яго перасцялю ўсё ж руберойдам
за водпуск),
Залопаў крыллем певень за сцяною,
цялё рыкнула недзе...

Бягуць, бягуць, крыжуючыся, гукі маёй раніцы
(ну, хоць збірай іх у гербарый,
засушваючы на паперы ў літары!).
Цяпер ізноў усе яны — мае:
Я — дома.
1976

## РЫЖКІ

Я ўжо знайсці іх і не марыў:
За дзень бадзяння па гаях
З дзесятак бабак і свінарак
У кошык свой і ўкінуў я.

І вось пад елачкамі — неруш:
Яны, рыжманыя кружкі!
І тут і там — вачам не веру —
Па травяным лужку — рыжкі!

На крохкіх ножках-карацельках —
Няйначай, зверанят сям'я —
У зелянавых жылках ценькіх
Застылі ў страху між куп'я.

Я не спяшаў іх рэзаць, рыжых,
Хадзіў ля іх, паўз той лужок.
А калі браў, падоўгу слізгаў
У пальцах, як жывы, рыжок.
1976

## ВАСІЛЬКІ

Я зноў пра вас спяваю, васількі,—
Як хараша сінееце вы ў жыце!
Над вамі спраку веку жаўрукі
Высока заліваюцца ў блакіце.

З блакітам, з неба яснай сінявой
Я вашы параўноўваю пялёсткі.
Пераздавалі шчодра колер свой
Вы дзетвары беЛагаловай вёскі.

На тое ж, што ад вашай сінявы
Пазбавіліся б сейбіты ахвоча,
Бо як-ніяк, а пустазелле вы,—
Чамусьці зноў заплюшчваю я вочы.
1976

* * *

Зграбаем сена.
Па купінах бегаюць граблі,
Збіраюць — у копы, у копы —
Чэрвень чмяліны між грабамі.

Вал зялёнага сўшава
Качаем па галіне колкай
(Эх, лезуць за шыю сяніны,
Казычуць пад ліпкай саколкай!).

Між частай асочкі-кусачкі
Мільгаюць дзятлавіны галоўкі,
Бліскае сподам ліста падбел,
Маркоўнік выпнуўся ломкі.
І ўсё гэта — граблямі, граблямі —
У пераборы
(Ну ж і дзякаваць будзе зімою —
За лета падараванае —
Падласка ў аборы!).

Што? Сонца за гай завярнула?
Не, хай пачакаюць смажэнікі ў печы!
Даграбём!
Чым на дажджах мокнуць сену,
Лепш яшчэ памакрэюць хай плечы!
1976

* * *

Жыву каля рэха.
Вечарам, калі за акном лесніч оўкі
ўлягуцца ў нагах хвой
баранчыкі хваляў азёрных,
Прыходзяць ка мне
ласі ды зоры.
Далёка ўбаку
(нібы на другой планеце)

застаўся свет мой штодзённы, прывычны,
які даўно ўкруціў мяне ў свае колы:
Я ўцёк ад яго —
на цэлы месяц —
у гэта зацішша.
Думаў, тут адпачну без яго.
Ды толькі дарэмна:
усе мае паўсядзённыя клопаты,
якія я дома пакінуў,
Знайшлі і ў пушчы глыбокай мяне,
прымчаліся ўсе, як адзін!
І вось раяцца ў маёй галаве,
варочаюць начамі мяне з боку на бок,
кідаюць у сне.
Не, тут нішто іх не перапыніць —
ні звон трамвая,
ні грукат бабы чыгуннай
аб непадатны асфальт,
ні крык дзіцяці за мембранай-сцяной...
Колькі ж змагу я пабыць
сам-насам з вечнасцю?
1976

## БАЛАДА ПРА МАЦІ

Кіёк у руцэ, за спіной хатулёк,
Запылена хуста —
Прасёлкам, здалёк,
Сівая, як голуб, ішла яна.
Звінела жаўранкамі вясна.
— Куды гэта, бабка, вы, дайце адказ,
Што зрушыла з дому, старэнькую, вас?
Шасцеў пры канаве зялёны трыснік...
— Я, дзеткі, да сына іду, на Палік...
— А сам што ж да вас не прыедзе ваш сын?
Няўжо так зазнаўся? Які ў яго чын?
— Зазнаўся? Ды не, яшчэ змалку ён быў
Ласкавым і чулым і матку любіў.
Бывала, не дбаў аб гульні, як усе:
Цялушку напасвіць і дроў прынясе.

Калі ж ён падрос, пачалася вайна,
Пазвала яго ў партызаны яна.
Пайшоў ён да возера Паліка —
Там, кажуць, балоты: чарот, асака.
Там вельмі цяжкая блакада была —
Ад бомбаў нямецкіх зямля ўся гула.
Адтуль не вярнуўся ён — на Паліку
Так і астаўся. У тым унь баку.
Адзін у мяне ён, к яму я іду —
А можа, дзе-небудзь яго там знайду?..
Кіёк у руцэ, за спіной хатулёк,
Запылена хуста,—
Прасёлкам, здалёк,
Сівая, як голуб, ішла яна.
Звінела жаўранкамі вясна.
1977

* * *

На тое ж у нас
галава на плячах —
Каб думаць.
На тое ж у нас
галава на плячах,
Каб разабрацца,
дзе золата,
дзе гніль блішчыць на карчах.
На тое ж у нас
на плячах галава,
Каб на кручок хлусні
не брацца,
Каб палічыць хаця б,
што два на два —
Чатыры,
а не дваццаць.
На тое ж у нас
галава на плячах —
Каб — без завалаў, ясны —
у Заўтра пракласці шлях.
1977

* * *

О дай мне, доля,
пастаянства дрэва,
О дай мне, доля,
цвёрдасць скалы,
О дай мне, доля,
ураўнаважанасць каменя,
О дай мне, доля,
гарэнне агню!

Не давай толькі мне
пакорлівасць дрэва,
Не давай толькі мне
раўнадушнасць скалы,
Не давай толькі мне
чэрствасць каменя,
Не давай толькі мне
бяздумнасць агню!
1977

* * *

Лодку долі сваей
Смела кіруй па жыцця рацэ.
Хай рыпяць і рыпяць
Вёслы ў кожнай руцэ.

Ведай: выпусціш з рук
Іх, і той жа парой
Стане трэскай на хвалі
Лодка долі тваёй!
1977

* * *

Калі на голаў чарада няўдач
Табе — адкуль? — пасыплецца, як з рога,
Ну што ж, ну што ж — не горбі плеч, не плач,

Хай пад падэшвай зноў курыць дарога.

Яшчэ, напэўна ж, не прабіў твой час,
І не знайшла зара тваё аконца.
Нясі ў вачах далей агню запас
І ў сэрцы — нерастрачанае сонца.

За небасхіл дарогу церабі,
Не саступай да зманлівых абочын,
Як кропля, толькі ў адну кропку бі —
Хай ліўня цьма, хай ноч рагоча ў вочы.

Ідзі хадою простаю ў вякі,
Ідзі, ідзі, і ад цябе, няйначай,
Як уначы ад смельчака ваўкі,
Адступяць, адбягуць усе няўдачы!
1978

* * *

Зноў — сівец, і хвойкі, і дымок,
Як калісь, над станам Пастуховым.
Я тут гэтаксама недзе мок
Пад шумлівай сховаю альховай.

Добры дзень, далёкая смуга!
Добры дзень, маіх узлескаў лісце!
Тут расой крутой мая нага
Апяклася, босая, калісьці.

Вунь і ты, чысцюткі ручаёк!
Як я рад, што ў пераплёт маліны
З той пары замглёнай ты не ўцёк,
Што вярнуў мае гады малыя!

Хутка мой раскручваецца век,
І вясны жыцця хіба не шкода:
Чалавек таму і чалавек,
Што Учора ў ім жыве заўсёды.

Нарадзіў мяне вось гэты край,
Крылы ў вырай тыя хаты далі:
Хто я, вам раскажа той вунь гай,
Тых палёў падсіненыя далі.

Лог і луг, крынічная бруя,
Сцежак ласка, халадок дасвецця,
Людзі нашы, мова — гэта я,
І без іх мяне не зразумець вам.
1977

* * *

На падмурку хлусні
Ты будуеш дом свайго шчасця?
Абклейваеш гэты падмурак паперай,
на якой з такім майстэрствам
ён намаляваны —
на выгляд, і праўда, як з цэглы!
Адно: трэба заўсёды
яго падмалёўваць і падмалёўваць,
бо, не давядзі Бог, заўважаць,
на чым стаіць дом твайго шчасця.
Гэта ж любы можа тады падысці
        і ткнуць у падмурак пальцам —
Рухне вобзем адразу ж
        дом твайго шчасця.
1977

* * *

Няхай табе даўно за сорак,
Ці ж варта аб гадах тужыць?
Адно: пад водбліск рэк і зорак
Цяпер паўней спяшаеш жыць.

Ды жураўлінай чарадою

Ляцяць пад воблакамі дні.
Схапі іх паспрабуй рукою,
Ты паспрабуй іх супыні.

Я час прыточваць не бяруся
І перад доляй не дрыжу,
Ды кожным днём, што зноў прачнуўся,
Як падарункам, даражу.

У звоне пчол, шматкаляровы,
Ідзе ён — далі расчыняць...
Баюся толькі: выпадкова
Падараваны дзень праспаць.

У кожным дні — свой бой, свой вецер,
Свае вясёлкі, горан свой...
грайце ж, дні мае, у свеце,
Раскручвайся, жыцця сувой!
1977

**СТАРАДАРОЖСКІ**
**РАЁН**

На карце хай загнаны ў рог,
Ды не ўбаку ні трошкі
Ад новых пуцявін-дарог
Раён Старадарожскі!

Ля ўсіх пасёлкаў і шляхоў
Тут пад смыкамі ветру
Пяюць штодня ў руках слупоў
Драты — цымбалы веку.

А колісь пушча скрозь гула,
Калі ішла віхура.
І дзесь Алелькава страла
Тут наганяла тура.

Тут «сакуны» жылі ў лясах
З мядзведзямі сам-насам.

Гаворка й сёння ў нас на «са»:
«Намаяўса», «суняўса».

Матычыў ляды хлебароб,
А трэ было, дык добра
Касіў у сечы — лоб у лоб —
Татар ды обраў орды!

Быў і фашысту ў нас не дом —
Сядзеў, ад страху сівы.
Наш партызанскі грозны гром
Трос прыхадняў, як слівы.

Вёў мсціўцаў па барах старых
Крапак мажны, як шула,
Цудоўны баявы камбрыг
Хірург раённы Шуба.

Змёў час чужынцаў след з зямлі,
Іржа паела каскі.
У лузе чэрвеньскім чмялі
Апанавалі краскі...

Тут ёсць куточкі — проста рай!
Як прыпар — ты начальства
У кабінеце не шукай —
На возеры Скачальскім!

А трэба на баравікі
Напасці з кашалямі,
Кіруй адразу пад Ляўкі —
Ўвесь Мінск там з «Жыгулямі»!

Заўсёды ў працы мой раён,
Работнік цягавіты.
Здаўна славуты ў свеце ён
Ліповым мёдам, жытам,

Ільноў нябесная сінявой,
Сасною, звонкай, гонкай,
Ну і вядомай за Масквой...

Старадарожскай горкай.

Будуе, косіць, сталь куе,
Арэ — ушыр і ўдоўжкі —
І песню новую пяе
Раён Старадарожскі!
1977

**ФРАНЦЫСК, СКАРЫНІН СЫН**

Блукаў па свеце пілігрым —
Развеяў столькі лет і зім!
Цяпер ад тых чужых дымоў
Спяшыць Скарынін сын дамоў.

Паўз балаты — далёкі шлях! —
Ляціць кібітка, нібы птах.
Як плешча возера ў лазе!
Як блешча сонца ў полазе!

Як пахнуць вязелем лугі,
Дзе кнігаўчыныя кругі!
А вунь і першы йдзе зямляк!
Хто ж гэта?
З торбаю жабрак!

А там хто — нейкія крукі?
Ды гэта ж полюць лён жанкі,
Сагнуўшы спіны.
Стаўбуном
Цівун над імі з бізуном!..

Ляціць кібітка. Паўз бакі
Мільгаюць хаткі-катушкі,
Дзе вечны чад, дзе вечны бруд,
Дзе слепне ў цемры родны люд...

Ляціць кібітка ўдаль,
ляціць,
Спяшае доктар Русь лячыць —

Ад нематы,
ад глухаты,
Ад пракавечнай цемнаты.
1978

**КВЕТКІ ЧАРНЫШЭЎСКАМУ**

Як квэцалі ўшыр і ўдоўжкі
(пабольш каламазі на швабры!)
Таго эшафота дошкі,
куды вялі яго шаблі!

Закасвалі рукі каты
і — на вачах у Расіі —
Да слупа прыкоўвалі клятага
яе найвялікшага сына.

Стаяў ён, з журбою на твары,
і, ланцугом бразгочучы,
За частаколам жандараў
людскія шукаў вочы.

Ды стулена, уся ў парасонах —
няўжо гэтак дождж палошча? —
Маўчала ўперадзе сомам,
вады ў рот набраўшы, плошча.

Маўчала... Ні голасу... Чайкай
білася сэрца аб грудзі:
Усё ж злавілі — крычаць бы! —
ў сіло хлусні вас, людзі?

Прыспалі ўсё ж калыханкамі
злачынцы, што гэтак царуюць,
Што кінулі Русь у ахранку
і чацвяртуюць?

Змірыліся як, што каты —
трэба ж гэтак злаўчыцца! —
Краіны усёй адваката
запісваюць у злачынцы?

А можа, сябе, як паходню,
у свет выносіў дарэмна?
Няўжо ж і не ўстане, уходаны,
агромністы край пад'ярэмны?..

Грымеў прысуд над вухам,
ды падалі словы трухою:
Біла яго абухам
маўчанне людское.

І вось — як узнагарода,
як выбух пад небам імглістым,
У ногі... яму... калодніку —
ружаў букет агністы!

Ад плошчы абуджанай рэха
ляцела майскім абшарам:
У мёртвай цішы прарэху
ужо не залатаць жандарам!

Яснеў небасхіл за палеткамі,
зноў вочы глядзелі ўперад...
Пісаць бы паэму пра кветкі,
што ўратавалі веру!

Былі потым лёду годы,
але і ў вілюйскія сцюжы
Грэлі яго заўсёды
тыя ясныя ружы.
1978

**ПРА СТАРУЮ АДЭЛЮ**

На душы ў яе сёння —
нядзеля:
Ладзіць градкі
старая Адэля.
Пускае ў разорку з пальцаў,
як жывое, насенне —

Буракоў ды гуркоў
сем'і.
А казала ж мне ўвосень
(сядзела з кійком яна каля хаткі),
Што не трэба ўжо будуць
ёй градкі.
З усім яна разлічылася
тут, на свеце,—
Работу ўсю парабіла,
дарогу дала дзецям.
Даўно сабралася
ў найдалёкую Адэля дарогу:
Восем дзесяткаў на свеце —
ні мала ні многа.
У куфры ўсё ўжо да смерці
ў Адэлі падрыхтавана:
І сарочка, і андарак, і хуста,
і грошы на пахаванне.
Толькі смерць затрымалася нешта
за небасхілам —
Зноў не прыйшла па Адэлю,
зноў на яе забыла.
Зноў, нібы падарунак —
вясна ля прыселля...
Ладзіць градкі
старая Адэля.
Раўняе граблямі іх,
разоркі значыць рукою,
Як і гэта зямля,
счарнелай такою.

*

Нідзе не была ў свеце Адэля,
цягніка не бачыла нават —
Тут, у сяле,
ішоў яе век:
на тым унь грудку за канавай.
Як дрэва, на месцы адным
расла і старэла
ў дзён завірусе.

Тут, у тумане,
усе яе вёсны —
як гусі.
Цэлы век свой Адэля
толькі і знала,
што ў зямлі гэтай корпалася:
садзіла, палола, жала.
Як пчала, шчыравала
ад рання да цёмначы,
рукамі сваімі парэпанымі
хлеб здабывала надзённы.
Так, не была яна ў свеце,
ды толькі хлеб яе гэты,
Як жывы, абышоў
мо паўсвету.
Так, мала хто ведаў Адэлю,
(а сёй-той нават
знацца б з ёй грэбаваў),
А вось хлеб яе добра ўсе ведалі,
ніхто яго ад сябе не адгрэбваў.
На хлебе Адэліным тым
раслі і вышыні свае бралі
мантажнікі і вышыннікі,
акадэмікі і адміралы.
Утрымліваліся на ім,
працуючы бесперабойна,
міністэрствы і ведамствы,
фабрыкі і філармоніі.
Хадзілі станкі ўверх-уніз з ляскам —
Адэлін хлеб,
Пісалі ракеты космасу казку —
Адэлін хлеб.
Як пупышка вясной,
на Адэліным хлебе
развівалася —
пад гром авацый —
Цывілізацыя.
Калі, звар'яцеўшы,
круціў пад небам
віхар вайны пякельны,
І тады не сышла з бацькоўскай зямлі

(утрымалася ж неяк!)
Адэля.
Не, не была партызанкай Адэля,
але без Адэлі
Што б яны, партызаны,
елі?
Усе брыгады, усе злучэнні
(якія пра іх складаюць паданні!)
Былі
на яе ўтрыманні.
А пасля вызвалення
яна з тых жорсткіх руінаў
Уздымала з усімі
краіну.
Недаядала сама,
ды на хлебе сваім
дзяржала
Адэля
дзяржаву.

*

Дажываюць свой век
жанчыны нялёгкае долі,
Даручыўшы работу сваю
трактарам ды камбайнам у полі.
Самі ж на градках капаюцца
ці — да пенсіі сціплай даробак —
Падмятаюць вуліцы ў горадзе,
выстойваюць у гардэробах.
Убачыш іх — пакланіся,
з павагаю распытай
пра вялікі іх шлях за плячыма,
што супадаў са шляхам цэлага краю:
Яны —
гісторыя наша жывая.
1978

## ІСЛАЧ

Яшчэ ў жыцці адкрыцце — Іслач:
Як яшчарка, сярод травы
Пад шчырым сном вярбы навіслай
Па камяньках — струмень жывы.

Між двух бароў, паўз сосны-промні —
Лужкоў прырэчных дываны.
У калідор шырокі поймы
Заходзяць ранкам туманы.

Праз бор-гусцёр неспадзявана
Малая сцежачка з сяла
У гэта стойбішча туманаў
Мяне таксама прывяла.

Над рэчкаю з вярбой-гарбулькай
Стаю і ў прозалаці дня
Лаўлю, як ласку, ціхі булькат
Пад нізам дзесь, у каранях.
1978

* * *

Гляджу:
другімі сталі берагі —
Павялі, парыжэлі
сітнягі,
Вяз агаліўся,
ссохла асака...

Адна яна,
нястрымная рака,
Як бегла
між карэння ды куп'я,
Так і бяжыць,
нястрымная бруя...

А ў нас, людзей,
скажыце, ці ж не так:
Мы, што ні год,
мяняемся няўзнак.
Сівеем мы, цяжэем,
і ў свой час
Змяняюць нашы дзеці
ў свеце нас...

Бясконцая
крыві нашай рака
Цячэ ў вяках,
цячэ ў вяках!
1977

* * *

Радзіма...
Маленства тупкія сцежачкі
Пад белым крылом туманаў
(То з лісцем клейкім трыпутніку,
што так лагодна халодзіць ногі,
То з чабарком-чубарком,
які да санцаўсходу яшчэ
заняўся наўкол сінявата-ружовым агнём,
То з мохам лясным зелянцовым,
абсыпаным рыжым шыпульнікам-гліцай
і паабкіданым жывымі ўзорамі сонца,
То з нізенькай дзятлавінкай белагаловай —
як прыпадаў да яе некалі наш Гнедка,
бацька даваў мне адвесці на луг,
То з верасам,
што так прутка шлёгае аб калашыну
квяцістай галінкай-мяцёлкай
з ублытанай там пчалой,
То з куп'істым сіўцом,
што тапырыцца ўвосень рыжкамі —
як голыя птушаняты, тояцца там яны).
Радзіма...

На камяністым падзоле скупым
Тут бацька шчасця шукаў.
Уставала яно — часцей у сне, чым наяве —
Жытам сцяблістым
(як у сабор,
страшнавата ўяго ўвайсці),
Грэчкай кусцістаю, шумнай
(ляж між чырванаватых сцяблін
у звоне пчаліным
і дыхай на поўныя грудзі
дзіўным дарам зямлі),
Грымучым гарохам
(ён так і страляе, сухі,
калі месціш яго ў драбіны),
Вастравусым ячменем, аўсом.
Бульбы чырвонымі горкамі.
Гадуючы шчасце сваё,
заўсёды браў сабе бацька ў памочнікі
сонца і вецер.
Радзіма...
Кузаў галасу і смеху
Вязе грузавік праз сяло —
едуць вяскоўцы на сена.
На хаду ўхапіўшыся чэпка за борт,
да іх перакідваюся і я.
Як журкатлівая рэчка,
мне проста ў сэрца цячэ
наша, такая знаёмая змалку, мова.
Чуецца ў ёй мне
ручая прыдарожнага булькат,
ветру пошум у бэзавым лісці
ды — пад шляхамі белых аблокаў —
каласоў несціханыя руны...
Радзіма...
За беразнячком акалічным
(якія там мясцінкі грыбныя!)
наліваецца чырванню новы дзень.
Першым пачуў яго
агнякрылы дваровы пявун:
выціснуўся з куратніка,
пацягнуўся,

адставіўшы ўбок адну, потым другую
нагу,
і з шумам ускочыў на засаўкі —
свету ўсяму паведаць хутчэй
радасць...
З поля ідуць каровы —
паважна, ківаючы ўверх-уніз галовамі,
нясуць дамоў сырадою поўныя вымі;
сустракаюць іх гаспадыні каля варот
разам з малымі ўнукамі-гараджанамі,
што ўжо здалёк пазнаюць
«сваю» Сыботу ці Краску...
Чую гоман на вуліцы —
гэта кіёчак вывеў з двара старую Грышчыху:
сагнутая ў крук (што ж,
за работай спіны не разгінала век),
ідзе-валюхаецца яна — ніжай платоў,—
даганяючы рабую свінню,
і ўсё нешта гаворыць-гаворыць...
Разварочваецца ля нашых акон,
шаляснуўшы па адвіслым голлі вяза
(хаця ж бы не вывернуў шула ў варотах),
аграмадзіна камбайн.
Гляджу: у кабіне... Адамішын Вова!
А здаецца ж, учора
бегаў ён тут, па вуліцы, босы
(ногі — хоць рэпу сей),
ганяючы драцяным прутом кацёлку —
іржавы абручык з вобада...
Радзіма...
1978

## ЯЦВЯГІ[1]

Хто ўкраў сёння сонца з неба,
пераплёў шляхі каранямі?
Хоць крычы: дзень, як луг у цэбры,—
затапіла свет туманамі.

Недзе пікамі далеч ашчэрыў
вораг —
што ж, аб крыжацкія лбы
памацуем нашы сякеры:
мы — яцвягі,
мы — не рабы.

Дзеці лесу, мы воляй гордыя —
вiся, восеньскіх лісцяў рой!
Колькі раз чужацкія орды
край капыцілі пад зарой!

Нам багоў сваіх неслі і ёрмы,
ды праз вываратні і равы
гналі прэч іх ад нашых зор мы:
мы — яцвягі,
мы — не рабы!

Сойкі сокат ускрай дарогі...
Граюць сосны па-над трудом...
Пушчы звонкія, пералогі —
гэта наша радзіма, наш дом.

І яго мы, яго мы, яго мы,
покуль жывы — ведай любы! —

[1] Ятвязь — такую назву носяць некалькі вёсак на Гродзеншчыне. Ёсць там і рэчка Ятвязь, на якой стаіць сяло Ятвеск. Гэтыя назвы — ад яцвягаў, колішніх насельнікаў краю, паходжанне якіх канчаткова не высветлена. Рускі гісторык XIX ст. С. М. Салаўёў, адзначаючы смеласць і непакорлівасць гэтага «загадкавага народа», пісаў, што «яцвягі ў бітвах ніколі не ўцякалі і не здаваліся ў палон, а гінулі разам з жонкамі». Яцвягі былі амаль поўнасцю знішчаны ў няроўных бойках з іншаземцамі. С. М. Салаўёў даводзіць, што рэшткі яцвягаў быццам бы заставаліся яшчэ ў яго час на Скідальшчыне: «Яны рэзка адрозніваюцца ад беларусаў і літоўцаў смуглым тварам,чорнай вопраткай, норавамі і звычаямі, хаця ўсе ўжо гавораць на беларускай мове з літоўскім акцэнтам».

адабраць не дадзім нікому:
мы — яцвягі,
мы — не рабы!

Неба чорным услана дымам,
нашы хаты гарацць і ёўні:
у цісках чужынцаў радзіма,
вораг хіжы лютуе сёння.

Асталася нас жменька толькі
ад крывавае малацьбы,
ды ізноў мы шукаем бойкі:
мы — яцвягі,
мы — не рабы!

Край зрабіўся суцэльнай магілай,
крык дзіцячы ў хвоях растаў,—
як атаву, смерць нас касіла,
ды ніхто на калені не стаў.

Рвіце, коні, глей капытамі!
Стан варожы!
Няма ў нас слабых —
мужна зложым галовы там мы:
мы — яцвягі,
мы — не рабы!

Станем зорамі.
Як паходні,
будзем з неба свяціць заўжды.
Ад Драгічына да Гародні
пашукайце нашы сляды!

Завірыць хай завея над імі,
ды ў вякі панясуць,
сцяг нібы,
рэкі чыстыя наша імя:
мы — яцвягі,
мы — не рабы!
1978

* * *

*Янку Сіпакову*

Ці ж ведаў хлапчук,
на якую раду
Тату з мамай пагналі
ад ганка прыклады?

Толькі гэтак калола
нязвыклае слова — гестапа!
...Двое добрых людзей
да нелюдзяў трапілі ў лапы.

О, як іх дапытвалі ўмела —
з падмогай навукі!
Жалезам хітрым выкручвалі
іх сялянскія рукі.

Рукі, што ведалі толькі
тронкі плуга ды граблі.
Што над пасцелькай дзіцячай
снавалі, як гралі!..

І вось да сцяны іх паставілі —
крычы не крычы пад вачэй гэтых лёдам...
І ўпалі яны — бывайце, няспраўджаныя надзеі!
У тым лёху,
Глухім,
голым...

Ды ў свеце застаўся
іх голас.
1976

* * *

Трасе, трасе планету праз гады,
І ходзім мы па ёй, як па плытах.
Трывожна ў сэрцы: можа, сапраўды

Трымаецца зямля на трох кітах?

Кіты, кіты, я знаю, цяжка вам:
Ад складаў бомб трашчыць наш шар зямны.
О як бы памагчы мне тым кітам,
Кіты — хаця б не падвялі яны!
1978

* * *

Зары запозненай каснік
Хто ў ціхі час згубіў за пожняй?
На момант выслізнуў і знік
За хмаркаю, як прывід, поўнік.

Ты не прыйшла... Клён пацямнеў.
Зямлі шматфарбнасць гасіць вечар.
І холад нізавы мяне
Патроху ўжо бярэ за плечы.

Ты не прыйшла... Мо твой цягнік
Сышоў на перагоне з рэек?
Ці недзе сон, як чараўнік,
Скаваў няўзнак праменні веек?

Ты не прыйшла... Што без цябе
Мне гэты свет — яго б не браў я!
Што мне на ўзгоркавым гарбе
Шалёны водар разнатраўя!
1978

* * *

Палессе...
Рэха правадоў сустрэчных.
Ваюе наш аўтобусік з пяском.
Пад вечар —
песня ціхая —

Славечна
Дарогу перайшла нам пад мастком.

Куды ляцім,
этнографы?
Ля песні
Палатку ўскінем —
Пачакае час!
Тут, пад зарой,
Калі камар не з'есць нас,
Палесся нораў вывучым мы ўраз!
Якая ціш!
Чуваць крынічкі мова —
Хто кінуў нітку срэбную са стром?
А звечарэла —
З чарнаты альховай
На ўсё Палессе —
Салаўіны гром!..

Зялёнакрылы край славян —
Славечна...
Дзесь скрыпнуў граб —
Ці мо чумацкі воз?..
Стаю і слухаю самую вечнасць,
Што захавалі
Голлі вербалоз.
1979

* * *

Не шкадуйце добрых слоў жанчыне.
Стрэўшыся,
кажыце ёй часцей
Аб яе красе,
аб дабраце,
Аб вачах яе,
чароўных, сініх.
З ружай параўноўвайце,
з вяргіняй —

І яна, як кветка, расцвіце!
1979

* * *

Жыцця нястрымны ход!
Не згледзеў: бы пірога,
Яшчэ адзін во год
Адчаліў ад парога.

Ён толькі ж што званіў,
Нібы званамі, днямі,
А ўжо — глядзі — з агнямі
Паплыў, паплыў, паплыў.

Не павярнуць назад
Яго ніякай сілай:
Уміг яго ў свой спрат
Гісторыя ўмясціла.

Падлічваю, чым год,
Мне дадзены, я поўніў:
Ці мо не варт таго,
Каб я яго запомніў?

Не, год змаганцам той
Усё ж быў: зацяжную
З адвечнай цемнатой
Упарта вёў вайну ён.

Пабач: з эпох сляпых
Дайшоўшы нейкім шляхам,
Сядзяць шчэ, як струпы,
Ў людзей на шыях шахі.

Ды цёмныя з вякоў
Народы ўваскрэслі:
Хапуг-гвалтаўнікоў
Страсаюць з тронаў-крэслаў.

Світае на зямлі.
Ды ўсход такі чырвоны:
Хто ж без крыві калі
Зрываў з сябе карону?

Свет кабалы — на злом!
Мацнее рэха боя:
У барацьбе са злом
Хай не ржавее зброя!

З няпраўдаю вайна
Кіпіць у нас у кожным:
Ці ж быць у свеце нам
Староннімі ў ёй можна?

Ты што, скажы, зрабіў,
Каб час прыблізіць зорны?
Ці дарам пратрубіў
Год, гэткі непаўторны?
1979

* * *

А ўсё-такі Розум —
        наш, не электронны —
Айсбергі догмаў
        у свеце тараніць,
І падаюць — чую —
        з наседжаных тронаў,
Як пераспелыя грушы,
        тыраны.

А гэтак жа шчыра,
        а гэтак жа чэпка
За троны трымаліся —
        рук не расчэпіш!
Тыраны над тронам!
        трэсліся трасцай —

Не адарваў бы ад тронаў іх
трактар!

А як жа старанна —
з розумам, з толкам —
Сябе ўцэментоўвалі —
утрымацца б толькі!
У кожным скверы маленькім,
бонзы,
Свой лік адлівалі
ў бетон ды ў бронзу!

У зубы гісторыі
ўкладвалі цуглі,
На мову людскую
вешалі пломбы —
Хадзілі ля іх толькі
еўнухі цугам,
Фіміям ім курылі
паэтаў плоймы!..

Званчэюць у свеце
свабоды бомы,
Маўчанне людское
ўзрываецца бомбай,
І падаюць з тронаў
каму патуралі),
Як пераспелыя грушы,
тыраны.
1979

* * *

Такую падзею
мы прагледзелі:
Шпакі прыляцелі!
Дазнаўся пра гэта я ў дрогкім трамваі
ад дзвюх, з бітончыкамі малака ў руках цётак.
От як!

Дзеці зямлі, гэта ж — дзіва! —
жывём мы ўжо
Без перасвісту шпакоў,
што некалі першымі нам абвяшчалі вясну,
Без крыгалому чаканага на рацэ,
што досвіткам белатуманным
будзіў увесь свет
самаю мірнаю з кананад,
Без паху раскрытай плугам раллі,
якую,
зляцеўшы з усяго наваколля,
абходжвалі шумна гракі,
Без рос на траве
(ці помнім хоць мы,
калі ступалі па іх апошні раз
босай нагой?),
Без празрыстасці бярозавіка
(як гулялі ў ім сонечныя зайчыкі,
калі мы неслі яго ў слоіках
з бязлістага ўзлеску!),
Без перапёлчыных ранкаў,
Ясных заранкаў,
Без красавання жытоў на зямлі,
Без налівання,
Без светлага мігу таго,
калі, вылезшы пагрэцца на сонцы,
абсядаюць усе лазнякі ваколіц
такія рахманыя коцікі,
калі выпырхваюць раптам з пупышак бяроз
вясёлыя вырaі лісця,
калі зацвітаюць на волі пралескі,
сон,
святаяннік,
крушына...
Што з намі робіцца?
1979

**СПАДЧЫНА**

Напінаўся Гнедка, у капыт

Капытом цаляў — не трэба пужка!
І плыла з-пад плуга скібы стужка.
Дымная. Па полі. Пад блакіт.

Сонца не ўзышло яшчэ.
Ды ярка
Занялася ўжо яго агнём
Там, над лесу чорным грабянём,
Над зацененай зямлёю хмарка.

І звінеў, звінеў каля Стажар
У праменні сонечным сустрэчным
Ён — ратая спадарожнік вечны —
Шэры жаўранак —
Палёў пясняр.

Баразной за плугам — дуж, няўломак,
У красе гадоў — ішоў мой дзед.
Як гуляў, араў: бывала, дзень
Мог ён рук не адрываць ад тронак.

Дзеду гэта шэрая зямля
Дасталася некалі не танна:
У балотнай цаліны дрыгвянай,
У карчоў, у чэпкага галля

Лазнякоў
Ён ломам ды рыдлёўкай
Адваёўваў — па шматку на год —
Поле,
Рыючыся, нібы крот,
Па калені у гразі той глёўкай...

Як ён шанаваў зямлю, мой дзед!
Клаўся спаць і ўжо чакаў світання,
Каб ізноў прыйсці к ёй на спатканне —
Тут жа быў
Ягонай мары свет.

Да цямна, бывала,
Акрылёны,

Шчыраваў ён на зямлі штодня.
Грудку кожную на ёй раўняў,
Жытам засяваў зямлю і лёнам.

І, дагледжаную —
Ў ценях хмар,
У сяйве туманаў,—
З рук у рукі
Перадаў вось нам,
Сынам,
Унукам —
Самы дарагі на свеце дар!
1980

* * *

З вёскі далёкай лясной
(ці ж мала зведала Тэкля там гора?)
Забраў яе сын да сябе, у горад
(на колькі гектараў зямлі ён —
у гаме і громе —
разгорнут?).
Не ў хаце драўлянай жыве цяпер Тэкля:
у доме каменным высотным —
Акон там,
што ў рамцы з пчалінага вулля
сотаў.
У рай, ды і толькі, трапіла Тэкля:
якія тут люстры! А вазы!
Аж ззяе ўсё і зіхціць тут —
ад ручкі дзвярной да ўнітаза!..
Жыць бы ды жыць тут.
Вось толькі
няма дзе рук дзець Тэклі,
Рук,
што ўвесь век свой
грэблі зямлю дзень пры дні,
сечку свінням секлі,
Бралі лён
(як ён пазвоньваў пры гэтым,

рыжагаловы!),
Граблямі луг
у копы збіралі
пад ляскат пуг перуновых,
Жыта святлянае, многагалосае
(што разлівалася да небасхілу)
за хваляю хвалю
У сцірты
ўкладалі,
Хлеб мясілі ў дзяжы,
у печы яго, як добрага князя,
мясцілі,
А трэба было —
за пілу ды сякеру браліся,
малацілі, аралі, касілі...
Тупае, тупае Тэкля
з пакою ў пакой,
у пакой з пакою —
Шукае
спакою.
А ў галаве думак тых —
сотні:
Няма ёй спакою, няма спакою
у раі гэтым высотным.
1980

## ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ

...— Ты што — супраць НТР?
- Хто можа быць супраць прагрэсу жыватворнага абнаўлення вёскі! Я толькі за тое, каб аддаць ёй належнае, старой вёсцы, якая падрыхтавала сённяшнюю цывілізацыю і якая цяпер аджывае свой век, за тое, каб помніць яе нялёгкую тысячагадовую гісторыю...

*З падслуханай, як той казаў, размовы*

Памерла вёска...
Зданямі белымі коміны
вугольчыкі зорак у небе шукаюць,
З-пад брам і студняў-завалаў
(над адной журавель унь схіліўся

і ўсё не выцягне шыю)
палыны — іх воля — шугаюць.
Памерла вёска...
Раскіданы хаты.
А якія ж былі ў іх сценах бярвёны!
Як водсвет полымя з печы скакаў
па гэтых бярвёнах барвова!

Там ранкамі стукалі бёрды,
набіліцы біліся —
Палотнаў рэкі цяклі,
праплывалі лугі з бакасамі
праз тыя набіліцы!

А як у тых хатах драўляных
гармонікі гралі вяселлі!
Ад песень — іх ужо сцены не месцілі —
тонкія шыбы ў рамах трымцелі!

Люляла сны галубіныя нашы
пляцёнка-калыска пад бэлькай.
Чорны, як жук, бычок
(свяціўся на лбе толькі маладзічок)
на сене пад прыпекам бэкаў.

А ў вечар асенні, глухі,
песню сваю, нескончоную, вечную,
На скрыпачцы ценькай пілікаў
(і дзе толькі ён прымясціўся?)
цвыркуночак запечны.

Там — пад ручнікоў вясёлкамі —
разьбяныя лавы
сыходзіліся на покуці —
Дзядоў, што па шчасце прыходзілі
ў гэты свет,
прыстанак апошні.

Кожная хата — аповесць.
Усяго было ў ёй даволі:
Там гора ў ступах таўклі,

бяду ў жорнах малолі...

Памерла вёска...
Пайшлі сяльчане ў палацы...
Адны засталіся дворышчы...
Толькі вецер гуляе па пляцы...

Памерла вёска —
як чалавек памірае.
Зноў і зноў тут спыняецца сонца,
праменняў цёплымі пальцамі
цэглу бітую перабірае.

Над вёскай былою стаю —
вецер мне валасы пашавельвае доўга.
...Знікаюць вёскі, знікаюць вёскі —
песень нашых гняздоўі.
1980

* * *

Мы ўжо не аром, гараджане,
не жнём і не веем...
Ад хлебаробаў адно засталося ў нас, хіба:
тое, што хлеб, як і некалі,
есці мы ўмеем!
Не ўскідваемся мы сярод ночы
у сне-неспакоі:
вясны не праспаць бы дыхання!
Не падымае нас з ложкаў
шэрага, нібы зайцава поўсць,
рання
гранне!
Красавіком ясназорым,
калі дураслівец-прамень
ружовай рукою здымае з зямлі
тумановў коўдру,
Калі жаўрук-неўгамоннік
(і дзе начаваў ён, рабы?)

над галавой разбівае дашчэнту
цішыні колбу,
Не ідзём, як калісь, за плугамі
у акружэнні гракоў-хадакоў,
што па раллі — упадлёт, упадбежку,
Не вядзём —
туды, на самае сонца
(што выслізнула толькі з абдымкаў воблака),
баразну — у заўтра ясную сцежку.
З сеялак, поўных зярнят,
мы, былыя вяскоўцы,
па полі не сеем
На добрае заўтра
надзею.
Да яе, да надзеі
(Мо рунню ўзялася?
Мо круціцца ў трубкі?
Ці колас выкінула?
Закрасавала?)
Так і цягнулі нас ногі —
якая б стома нас не згінала,
з якой ні ішлі б мы дарогі!
1980

**КАМЕННЫЯ БАБЫ**

Каменныя бабы...
Язычнікаў ідалы...
І сёння па стэпе яны —
бачыў я —
там-сям параскіданы.
Валяюцца ў пыле яны пад нагамі —
то бокам,
то ўніз тварам грозным.
Спакойненька птушкі садзяцца на іх,
пасуцца побач каровы ды козы.
А некалі ж тут
на люд навакольны
унь які страх яны наганялі!
Да іх, як у Меку,

ішлі з караванамі,
дары перад імі складалі,
Малітвы ім, модным, шапталі,
Каменныя ногі іх цалавалі,
Слязьмі аблівалі...
О як выдатна тыранам
        яны памагалі
Людзей трымаць на павадку!
1979

**ПЕРАДЗІМ'Е**

Ад лета — ні духу.
        За во раны ржэўнік.
Узмежкі на ўзлеску —
        у лісцях зрыжэлых.

Навіслае неба
        дастанеш рукою —
Сее, і сее, і сее
        Імжою.

Даўно адцвіло ўсё наўкол,
        адгалёкала —
Ды мне яна люба ўсё ж,
        восень глыбокая...

Ледзь з ночы абдымкаў
        змутнелы дзень выслізне,
Вядзе мяне сцежка
        за сад наш бязлісты.

Глухою няўтульнасцю
        вее ад гаю:
Астуджаны ўвесь ён
        ад краю да краю.

Бы смерч пракаціўся які тут,
        сваёю
Мятлою ўсё змёўшы —

бязлюддзе, бязмоўе.

Але ён жывы,
гэты лес перадзімны —
Ці чуеш, якія
гучаць у ім гімны!

У ясных асінах,
бярозах высокіх
Як тонка струменяць
бяссонныя сокі!

Як голае голле
(было наваселле?)
Пупышак высокія сем'і
абселі!

Там — толькі прыслухацца —
тонкае ціньканне:
Сінічкі!
Як грэе ў пару гэту песня іх ціхая!

Далей, за раўком,
за ляшчэўнікам рабым
Хто раптам сыпнуў
гулкім градам па грабу?

Ён, дзяцел!
Сабе адшукаў сухадрэвіну
І шчыра малоціць,
Бог лесу нядрэмны.

Ля ног —дзераза:
пад ялін паднавесам
Не зблякла —
паўзе паміж купін і верасу.

А побач, як радасць
(аб тлене не слухай!)
Асколачкам сонца —
брусніца-драмуха!..

Хаджу па куп'і ды хаджу
          без прыгодаў:
Спакой і суладнасць —
          заснула прырода.

На вочы насунула
          шапку аблокаў,
Спіць пасля лета шумлівага —
          моцна, глыбока.
1981

**ПАЧАТАК ГОДА**
*З календара хлебароба*

Сёння свята ў мяне...
          Я падняўся на досвітку —
Па-над ліпай суседскаю
зорка стаяла яшчэ,
на платы заглядзеўшыся.
Дзверы ў стайню я адшчапіў —
там атаву губамі перабіраў
мой Гнедка
(Ён коратка заіржаў,
галаву да мяне павярнуўшы
і не перастаючы жаваць).
Я рукою па аксамітнай шыі правёў,
прытуліў да шчакі
вастраватую пысу,
А калі аброць уздзяваў,
ён даверліва торкаўся мне
пад паху,
усё яшчэ жуючы.
Як крануў лейчыну —
          і ён адразу ж патупаў за мною.
Колькі хвілін —
і загуменнай дарогай глухой
засакаталі, рэха збудзіўшы, калёсы.
На ўскрайку яснага беразнячку,
што стыў, анямелы,

у рэдкім тумане,
Я Гнедку суняў
і, адпрогшы, з аглабель яго вывеў...
І вось у зямлю,
што ляжала аблогай,
я плуг упусціў.
Бы ручай,
пацякла з-пад яго зямля —
такі ў яе водар п'янлівы!
Скіба да скібы, скіба да скібы —
Усё адступала аблога.
І хоць нацёртыя рукі
гарэлі агнём,
хоць да плячэй кашуля
прыліпла ад поту,
Ішоў і ішоў я за плугам,
гнаў і гнаў баразну
пад небам.
Нада мною сонца ў хмарках плыло,
расчынялася чыстая далеч шырока...

Сёння свята ў мяне —
распачаў я свой год хлебаробскі.
1981

* * *

Ты пакліч мяне, пазаві —
Мы заблудзімся ў спелым леце.
*Яўгенія Янішчыц*

І мне б заблудзіцца
ў расквечаным леце,
Забыцца, згубіцца
між сосен у лесе.

Сляпенькая сцежка —
як другу ёй верыш —
Заманіць за свет,
у няведамы верас.

І там,
бы сапфір у пярсцёнку,
жывое,
Здалёк заяснее
азерца
у хвоях.

Пры самай вадзе,
дзе прычалы світанняў —
Хацінка-бярвенка:
як быццам з падання.

І лесавіком
на парозе старожкі
Устане дзядок —
пільны позірк сцярожкі.

На камені-ганку
пад клёнікам гонкім
Прысядзем —
запалім агеньчык гамонкі.

Як голуб, сівы,
мне раскажа дзядуля
Пра пушчу —
дзяржаву ласёў ды казуляў,

Пра песню глушца
на птушыным вяселлі,
Пра траўку зуброўку —
чароўнае зелле...

Ля хвалі азёрнай
у хаце смалёвай
Застацца ў дзядка
я згаджуся без слова.

У сне чаратоў,
у затоках наноў я
Адкрыю

грамоў і вясёлак гняздоўі.

Нібы першабытнасць,
адкрыю, адкрыю
І раніц пявучасць,
і холад расы я...

А ў час, калі раптам
па даху, па лопуху
Там дождж залапоча,
памчыцца ў галопу,

Танклявай казуляю гнуткай
на ганак,
Бы з песні,
дзяўчына ўзбяжыць нечакана.

Сукенка ў абліпку,
апырсканы лыткі.
Ды ёй не бяда,
што прамокла да ніткі!

Змахне з валасоў,
смеючыся, дажджынкі,
І бліснуць з вачэй
мне насустрач іскрынкі...

Як шчасця мяжа —
заблудзіцца б у леце,
Забыцца, згубіцца
між сосен у лесе.

Ды толькі заўсёды —
дзе вы, мае маі? —
На месцы абжытым
нас штосьці трымае.

У лес ціхі вырвацца нам,
да бяроз тых,
З шумлівага лесу людзей
так не проста!

...На вуліцы раніца.
Звоняць трамваі.
Затор на дарозе!
Ды — хто ж утрывае! —

Люд сыпле з вагонаў:
дабрацца б да працы!
У руху ўвесь горад —
і вуліцы, й пляцы.

І я гэтаксама —
тут мроі мае ўсе —
Згубіўся ў натоўпе людскім,
нібы ў лесе.

Без гэтага вечнага лесу,
скажыце,
Ці ж мог бы
хоць хвілю на свеце пражыць я?

Без добрых людзей,
іх вачэй, іх усмешак,
Іх вокан, іх песень,
дарог іх і сцежак?

Мы лес, ды не дзікі:
свет гэты бяссонны
Прыйшлі мы сагрэць
дабрыні нашай сонцам.

Прырода мы, так.
Ды не тая, не тая,
Якая да болю людскога
глухая!

Як трэба ад бруду маны,
ад калецтва
Яго берагчы ўсім —
наш лес чалавецтва!

Яго ахаваць
ад разбэшчаных бонзаў,
Ачысціць ад яду іх злосці,
іх бомбаў.

Каб можна было
заблудзіцца у леце,
Забыцца, згубіцца
між сосен у лесе.
1981

* * *

Ледзь толькі раніца асвеціць вокны,
з кватэры, што заведзены, лячу я —
Як пыласос, у кругаверць сваю
уцягвае мяне вялікі горад.
Пылінку дробную,
шпурляюць мяне з вуліцы на вуліцу тралейбусы
Утрамбоўваючы ў салоне,
Гайдаючы і тузаючы на паваротах,
Утрэсваючы,
нібы на арфе зерне.
Пасля на ўвесь белы дзень (ад дзевяці да шасці)
я да службовага крэсла свайго прыкіпаю;
Яно, як ахвяру прывычную, мяне пры сябе трымае,
мой штодзённы цівун, мой самадзержац,
які толькі смяецца з маіх высокіх памкненняў
(яму абсалютна ўсё роўна, што я раблю —
ад мяне яму трэба адно:
каб я цёр яго сваім азадкам).
Калі ж, як распрэжаны конь,
пускаюся я дамоў,
Мяне падчэплівае раптам хвост чаргі,
ад якой я ўжо і адарвацца баюся —
нават каб глянуць, што там «даюць».
Потым прапахлы выхлапнымі газамі прыпынак
надоўга стаўляе мяне стаўбуном сярод тратуара.
Покуль ізноў не ўхопіць мяне

ў сваю, да адказу набітую глотку,
тралейбус —
разам з сеткаю памідораў здабытых
(добра, што пад канец давалі
хоць па два кілаграмы).
Перад домам жа мяне, як спружыну напятую,
гатовую вось-вось сарвацца,
Трымае яшчэ святлафор на прывязі: чакай.
Нарэшце — ух! — мой пад'езд:
я — дома!
Але і тут, як рыбу, у сетку сваю
ловяць мяне такія патрэбныя хатнія абавязкі.
Выбавіўшыся з іх
і рашуча мінаючы «залу»,
дзе мяне падсцерагае яшчэ тэлевізар,
Дабіраюся ўсё ж да свайго пісьмовага стала,
каб сабраць там як-небудзь самога сябе,
раскіданага па частачках немаведама дзе.
Пазнаходзіўшы іх (я не ўпэўнены,
ці ўсе вярнуў да сябе),
Я, пакуль не ўзяў мяне ў свае мяккія лапы сон,
Паспяваю вывесці на паперы хоць гэты во лозунг:
«Паэт, будзь героем — не згубі ў жалезным коле абставін сябе».
1981

* * *

Шкадую тых, хто не бачыў
Золата санцаўсходу,
Не чуў хвояў руны,
Сімфонію жыта зроду.

Шкадую тых, што ніколі
Не сеялі, не касілі,
На глебу патрэсканую —
хоць кроплю
У неба дажджу не прасілі.

Не палівалі ні разу

Потам уласным палетак,
Не грэблі зямлю рукамі,
Каб выпусціць зоры лета.

Тых, што не ўзгадавалі
І жмені зярнят — хоць надзіва,
Што за жыццё нават дрэўца
На свеце не пасадзілі.

Шкадую тых, што век свой
Паміж зямлёю і небам
Стракозамі мітусяцца,
Цаны не ведаюць хлеба.
1982

* * *

Баюся тых, хто не знае
Да гора людскога спагады,
Не ведае, як нялёгка
Даецца ў жыцці гэтым радасць.

Тых, хто не ведаў любові,
Хто на руках не гушкаў
І не насіў на гаршках
Дзяцей — чужых ці дачушку.

Баюся тых, хто ні роду,
Ні племя свайго не помняць,
Што дастаўленнем звышмоднай
Анучы жыццё сваё поўняць,

Якім памяняць радзіму,
Народ свой гэтак жа сама,
Як замяніць —
        што ж такога! —
Пінжак на плячах
        ці піжаму.
1982

## Я СЕЮ ЖЫТА

Час паваенны! Не багата
Тады, ў бясхлеб'е, меў я святаў.
Адно па сёння не забыта:
Я
сею
жыта.

Малому — гэтакі давер мне!
Уздзела маці лубку з зернем,
І вось у полі, пад блакітам
Я
сею
жыта.

Тут ліха колькі год гуляла,
Па мхах-карчэўях нас ганяла,
Вясне зямля цяпер адкрыта:
Я
сею
жыта.

Не елі хай як след даўно мы,
Хай ні скарынкі хлеба дома,
Ды будзем жыць, як і жылі тут:
Я
сею
жыта.

У халадок зярнят нырае
Рука штораз, і, залатая,
Вясёлка гіырскае з рукі так:
Я
сею
жыта.

Іду сабе ды йду з сяўнёю,
І пахне хораша зямлёю,
І сонцам цэлы свет заліты:
Я

сею
жыта.
1983

* * *

Як сон, азярко далёкае —
Нябесная чысціня.
За асаковай затокай
Тры хаты між ліп. Цішыня.

Сюды, у клёкат бусліны,
У свет васількоў і стракоз —
Па песні і казкі — закінуў
Мяне вандроўніцкі лёс.

У хатку да бабкі Аўдолі
Завёў мяне брыгадзір.
Старэнькая печ, пры столі
Палаткі — прыстанак дзіў!

Нікольki тут не гуляе
Мой сябра — магнітафон.
Паданні і сказы краю
Бярэ поўнай мераю ён.

Не, ціхі закутак тэты
Не быў у баку ад дарог.
Усе віхуры планеты
Білі аб той вунь парог.

Шумела пушча разгневана,
Як вораг лез у наш дом.
Стралялі кулямі дрэвы,
Хадзіў пералогамі гром.

Да самых дробязей помніць
Старая суровы час.
А трэба — капцы дапоўняць

Бабкі Аўдолі расказ.

Цяпер толькі сойкі сокат
Абудзіць тут лес сярод дня...
За асаковай затокай
Тры хаты між ліп. Цішыня.
1983

* * *

Зноў забралі цябе шляхі,
Засланілі агні і ліўні.
Скверык рэдкі. Тапчу сухі
Ліст рабінавы — покліч жніўня.

Хай далёка ты, у акне
У тваім хай вятрыстая Поўнач,
Ты ўсё роўна са мной, ты ўва мне,
Я да краю табою поўны.

Празваніў за Нямігай трамвай...
Мы ідзём, як раней, па алеі...
Гэтак хораша!.. Нібы май
Затрубіў зноў у рог алені.

Рукі цёплыя. Зноў бяру
Іх у пальцы свае: ці можна?
Мне насустрач вачэй зару
Ускідаеш — трошкі трывожна.

Што ж ты гэтак? Ну, хіба ж змагу
Хоць чым-небудзь пакрыўдзіць цябе
Я ад бед цябе ўсіх зберагу,
Засланю ад любых завеяў!
1979

**У ЯЛЦЕ**

У краіне светлай, дзе я ўміраю,

У белым доме, ля сіняй бухты,
Я не самотны...
*Максім Багдановіч,*
*май, 1917 год*

Ізноў тут — сонца,
магнолій чары,
Ад мора пырскі
ляцяць на брук тут.
Вясна ўжо іншая
квеціць бульвары
Ў краіне светлай,
ля сіняй бухты.
Так плынь людская
тут калабродзіць!
Усіх прымае
краіна-казка.
Здалёк і зблізку
сюды прыходзяць
Па зоры поўдня,
па мая ласку.
А я па вулках,
забытых сходах,
Па ўсіх каньёнах —
крычы-галёкай —
Госць той краіны,
адкуль ён родам,
Шукаю рэха
вясны далёкай.
...Быў час віхурны.
Арол залётны
Тут прызямліўся —
набрацца сілы.
Пляскала мора
ля ног пяшчотна,
На ўсё забыцца
яго прасіла.
Ды як забыцца,
ды як забыцца
На край імглісты
хвой ды куколю,

На край, дзе марам
так цяжка збыцца,
Той край знябыты,
дзе ўкралі долю?
У снах і ў мроях
ён быў, забраны,
Край ціхі матчын —
ці ж з ім самотна?
Ён клікаў каняю
скрозь туманы,
Па ім так сэрца
балела моцна! —
Народ выходзіў
на бітву-веча!
Пяро не спала
ні днём, ні ноччу,
На маладыя
худыя плечы
Ускінуў хлопец
цяжкую ношу!
І падарваўся...
Зламаў тут крылы
Арол-падранак...
Ды, быццам гусі,
Лятункі-думы
праз небасхілы
Ляцелі ў вырай
да Белай Русі...
Ізноў тут — сонца,
магнолій чары,
Ад мора пыркі
ляцяць на брук тут
Вясна другая
квеціць бульвары
Ў краіне светлай,
ля сіняй бухты.
1983

**МОСТ ДРУЖБЫ**

Хацеў бы збудаваць
У свеце гэткі мост я,
Каб мог ён, мост, звязаць
Краіны ўсе папросту.

Захочацца — па ім
Ідзі любы, па мосце,
Араб, француз ці фін —
Заходзь ка мне у госці.

Мы разам пасядзім,
Усё, як ёсць, разважым,
Любы развеем дым,
Усе вузлы развяжам.

Хіба ж тады б мана
Надзела тогу праўды?
Варожасці сцяна
Між намі легла б прахам!

Якая ягамосць
Стаілася ў бетоне
І ў склепах копіць злосць
На цэлы свет сягоння?

Мы павука таго,
Што тчэ ўсім сеці згубы,
Ўсе разам —
качаргой
За шкірку б з-пад падрубы!

Гуртом любы пажар
Згасілі на карні б мы,
З багоў —
глядзіце ў твар! —
Усе сарвалі б німбы.

Няхай наўкол цвітуць,
Бы кветкі, ўсмешкі ў свеце,

У садзік свой бягуць
Вясёлым ранкам дзеці,

Ды грае сок буйны
У вінаграднай гронцы...
Сагрэлі б шар зямны
Мы нашай дружбы сонцам!
1983

## СПАРТАК

Коней ржанне ў сінечы
Разарванай начы.
Не, мяне у той сечы
Не пасеклі мячы!

Смерць навек я адолеў
Хіжым красам на страх:
Вы нідзе і ніколі
Мой не знойдзеце прах!

Конь аб дол капытамі
Зноў татахкае ў такт —
Гэта я пралятаю
Па планеце,
Спартак.

Сонца ўсходзіць, заходзіць —
Па карчах, чаратах
Са стагоддзя ў стагоддзе
Я лячу, нібы птах.

Гэй, чые там па полі
У пакоры гарбы?
Досыць гнуцца ў няволі!
Людзі, вы —
Не рабы!

У расяным прыволлі
(Свет як песня — наўсцяж)

Мы народжаны доляй
Несці радасці сцяг.

Спіны ўсе разгінайце —
Знікні, рабства арба!
У сябе забівайце
Палахліўца-раба!

Ды зрывайце без страху
Ланцугі —
З ног і з душ:
Лепей легчы на плаху,
Чым звівацца,
Бы вуж!

Мчу туды, дзе ў нядолі
Люд зняволены спіць.
Там, дзе я —
Сонца волі
Над зямлёй зіхаціць.

Баль канчай, рабаўласнік!
З трону злазь, злы тыран!
Адчыняй свет для шчасця,
Ўсенародны ўраган!..

Самаўладства кароны,
Здрадных рызаў рыззё —
Гэй, пад ногі шматконныя,
Пад гісторыі
Палаззё!

Зноў аб дол капытамі
Конь татахкае ў такт —
Гэта я пралятаю
Па планеце,
Спартак!
1984

**ПРЫВЫКАЕМ...**

«Ну й што ж, што нялюбы?
З галавы, дачка, гэта выкінь!
Пажывеш з ім —
прывыкнеш!» —

Так маці дачку,
выпадкова я чуў,
павучала.
«Звыкнецца — злюбіцца»,—
гэтак казала.

І звыклася ж, пэўне,
доля, кажуць, такая...
Да чаго толькі мы
так во
не прывыкаем!

О як нас узносілі некалі
на крылах юнацтва —
туды, у захмары,
Найвысокія
мары!

А сёння —
і што гэта з намі
навала гадоў нарабіла? —
Нам добра хадзіць па зямлі ўжо —
прывыклі! —
без крылаў.

Да мяккага крэсла свайго —
яго нам падсунуў выпадак —
мы так прыліпаем!
Да папяровага ілжэжыцця
прывыкаем...

Мы ўсе прывыкаем
жыць без лясоў
і без росаў,

Без песні дразда ў грабняку,
          без расчыненых насцеж нябёсаў!

Да ціхага цмока сучаснага —
смога,
што нас дзень за днём
памаленьку з'ядае,
Мы прывыкаем!
Да шуму,
Да тлуму,
Да глуму,
Да валтузні бытавой,
у якой
з галавой
патанаем —
Мы прывыкаем.

А яшчэ прывыкаем, бывае,
да бяды,
да жуды,
да нястрыманай подласці,
пошласці,
Да ілжы, як іржы,
          яе пошасці!

Бы селядцамі бочка,
бомбамі свет наш набіты
мы, голаў стуліўшы,
запалкі толькі чакаем:
Разам са смерцю ўжо
          жыць прывыкаем!
1984

**ДАМОКЛАЎ МЕЧ**

Ні ў лес, ні ў стэп, ні ў сны
Нам не ўцячы з табою:
Дамоклаў меч вайны
Вісіць над галавою!
Нясе нам сонца дзень —

Звон жаўранка нязмоўклы.
Але на сэрцы цень —
Пракляты меч дамоклаў!
Якія ж кавалі
Для нас той меч кавалі?
Хто скажа нам, калі
Яго над намі ўзнялі?
Ці не тады якраз,
Калі ўсе спалі ў свеце?
Няўжо ж ніхто ў той час
З людзей таго не змеціў?
Дзе ж дзеўся нелюдзь той,
Што надзяліў нас трасцай?
Хто знае, у якой
Цяпер ён ходзіць масцы?
Ну, пэўна ж, ён ягнём
Пяе пра мір у свеце,
А сам жа зноў з агнём
Гуляе на планеце!
Пакуль ён ёсць, не мець
Ніколі нам спакою:
Вайны дамоклаў меч
Вісіць над галавою!
1984

* * *

З кожным ударам сэрца мы, жыхары Зямлі,
перамяшчаемся ў сусветнай прасторы
прыкладна на 30 кіламетраў.
(З падлікаў вучоных)

Мы смяёмся і плачам,
Носім бухты і бітвы,
А планета нябачна
Мчыць сваёю арбітаю.

Угінаюцца вербы,
Глуха звоніць калоссе —
Паўз Кентаўры і Вегі

Шар зямны нас праносіць.

О, як пахне бяссонны
Чэрвень вязам і бэзам!
О, як падае сонца
За азёрную бездань!

Мы ляцім і сталеем —
У нябёсах, нябёсах...
Не бядуй, што сатлеюць
З днямі краскі і косы.

Пырснуць новыя ўсходы,
І — з травы ці з азёраў —
Будзем бачыць заўсёды
Мы высокія зоры.

Будуць новыя плыні
Біць аб нас у пагрозе...
Нас нішто не супыніць,
Мы — у вечнай дарозе.
1984

* * *

Не запірайце душу на завалы,
не замыкайце!
Яе вы ў сабе,
нібы ў клетцы якой,
не трымайце!

Душа — гэта сонца,
якое і грэе, і свеціць,
Жыццё наша
ўсмешкамі радасці
квеціць!

Даволі нам хмараў,
панурых, свінцовых.

Душы дайце
слова!

Няхай сабе смела
гаворыць яна,
хай спявае,
Свет, ад варожасці заледзянелы,
няхай растапляе!

Хто на трыбуну там выйшаў
з паперкай-прамовай —
Бетон ды жалеза
замест чалавечага слова?

А дом хто па схеме струхлелай
па сёння штампуе?
Хто рэчку спрамляе?
Крынічку лясную
касуе?

Нашто тое слова,
якое нам сэрца не радуе?
Каму ён патрэбны,
дом гэты, без радугі?

І што нам бяздумная
меліярацыя,
Калі асушаюць душу?
Дзе тут рацыя?

Мо досыць нуды,
безаблічнасці,
шэрасці?
Сунімем у свеце
бяздушнасці шэсце!

Душу расчыняйце шырокую
насцеж,
З усімі дзяліцеся
горам і шчасцем!

Няхай жыве шчырасць!
У дом,
што вы зранку будуеце,
У кволае дрэўца,
            што ў садзе гадуеце,

У рэчы, што дома
альбо на заводзе
вы робіце,
У словы, якія
з трыбунаў ці ў хаце
гаворыце,

Ва ўсё, што ствараеце,—
            не забывайце,—
Бы дрожджы у брагу,
            душу ўсю ўкладайце!

Тады ў цэлым свеце
            душа ваша будзе
Свяціць,
нібы сонца высокае,
людзям!
1984

* * *

Хто хлусіць,
Той вып'е і закусіць,
А хто праўду кажа,
І так спаць ляжа.
            *З народнага*

Ну што ж, хлусі, ну што ж, брашы
З усіх сваіх абмонаў —
Грабі ў кішэні барышы,
Балюй,
            жыві з разгонам!

Што ж да мяне, то хай і так
Я лягу спаць парою,

Але не змусіш аніяк
Мяне
　　　　крывіць душою.

Хлусі, віляй, убок адводзь
Свой зірк, хавай у ночы,
А трэба, у сабакі хоць
Пазыч на хвілю вочы!

А я хачу і жыць, і пець
У лад з душой — што будзе.
І ўсюды, дзе б ні быў, глядзець
Адкрыта ў вочы людзям!
1984

**ВІНА**
**Расказ равесніка**

З вайны ўспамінак:
У «свінню»
На вуліцы, ля плота,
Мы, дзеці,— ці ж упершыню? —
Гулялі без турботаў.

І тут...
Хлапец якісь паўз нас
У фрэнчыку парваным
Прабег, прыгнуўшыся,
І ўраз
Схаваўся за парканам!

Мы не згадалі, як сюды
З-за хат, што з боку гаю —
Навыкат вочы, цяжкі дых —
Падбеглі паліцаі!

— Дзе ён? Сюды ён бег якраз!..—
Да нас яны сярдзіта.—
Ану, хто бачыў, дзеці, з вас
На вуліцы бандыта?

Стаяць бы нам, маўчаць бы нам,
У рот вады набраўшы,
Ды тут маленькі Стась:
— Ён там!..
Што знаў ён, так сказаўшы?

І быў загад:
— Жывым яго!
Ў абход!
Усёю зграяй
Хутчэй лавіць хлапца таго
Пабеглі паліцаі.

А потым бачыла сяло:
Пад дуламі вінтовак
Вялі — і трапіў жа ў сіло! —
Яго пад лес, да рова.

Быў твар яго ў крыві, назад
Яму скруцілі рукі.
На нас ён кінуў свой пагляд
Было ў ім столькі скрухі!

У ясны поўдзень за сялом,
Дзе ліпень плыў высокі,
Мы ўсе пачулі стрэлаў гром -
Аж закрычалі сойкі.

Я помню, як сяло крадком
Хавала партызана.
Ляжаў ён, малады, з чубком,
У фрэнчыку парваным...

А Стась?
Уцяміўшы як след
Усё, уцёк ён з дому,
У пуні нейкай неўпрыкмет
Зашыўся ў салому.

Калі ж знайшлі уцекача,

Заплаканая маці —
Вось дзіва! —
Нават трапкача
Не «пашукала» ў хаце.

Ды горай за любы трапкач
(Хай біла б безупынку!)
Яму быў ціхі матчын плач
Ды словы:
— Сынку, сынку!..

Падрос хлапчук.
У людзі ён
Пайшоў сваёй парою.
Але віну дзіцячых дзён
Панёс і ў свет з сабою.

Не перастаў сябе караць
Ні ўдзень, ні ў ноч глухую:
Ну, чым жа можна апраўдаць
Сабе віну такую?

Яе і ў працы, і ў віне
Ён з году ў год змывае.
Яна ж — жывучая!
Не-не —
Ды і кальне, бывае.

У сэрца самае кальне
Вастрэй любых іголак,
Яго ўздымаючы і ў сне —
Вайны жывы асколак!
1984

**СЦЕЖКА**

Ад ганка да вуліцы —
сцежка паўз вокны.
Цубкая, гладкая —
бачна яна і здалёк мне.

Яе, халаднавую, помняць па сёння
нашы дзіцячыя пяткі
(На кожнай пядзі яе —
тых пятак пячаткі).

Усёю сямейкай
мы сцежачку гэту
дружна тапталі,
Травой-муравой зарасці
не давалі.

Болей мама, даўно ўжо сівая,
топча сцежачку
сёння
(Якія яшчэ мне прывезці
лекі ёй
ад бяссоння?).

Іду я па сцежцы.
Трава з двух бакоў
так да яе й падступае...

Не, хай ніколі
сцежка наша
не зарастае!
1984

**ЗЯЛЁНАЯ ДУБРОВА**

Тут мой стол, пры акне...
Ходзікаў — дзе яны? — ціканне...

Добрым госцем
сонца
заходзіць праз шыбы ў пакой да мяне,
ціхае.

Па дошках падлогі памытай
да драўлянага цягнецца ложка,

дзе так соладка спалі мы калісь,
малыя,

Крадком успаўзае на коўдру,
што ткалі на кроснах
матчыны рукі
(даўно аддяцелі ўжо ў вырай
гады незваротныя тыя).

Тут нават сцены мне памагаюць.
Кожны сучок на іх,
шчылінка кожная

Казку маленства
раскажуць
найгожую.

Тут мой стол, пры акне...
За сценкаю, як і тады,
маці — здароўя ёй толькі б
тупае,

Грукае вілкамі ды чыгункамі,
міскамі бразгае,
рупная.

Тут мой стол, пры акне...
Я ізноўку вярнуўся дадому,
бадзяка.
Госціць сонца цяпер у мяне...
1984

* * *

А вецер зноў раўкамі
Пагнаў лісцё бяроз.
Не, я не наракаю
На згубны лес.

Усё цячэ ў прыродзе —
Накшталт таго лісця.
Ды недарма мы ўсходзім
На небасхіл быцця,

У чорнай бесканечнасці
Мы зыркіх зор бяссонь.
Мы вечны чалавечнасцю,
Што па зямлі нясём.

У нас з табою, дружа,
Задача ёсць з задач:
Жыцця зямнога ружы
Абсыпацца не даць.

Пранесці — хай разводдзі! —
Далей яе ў прасцяг.
Мы ўсе — мільёнагоддзяў
Азораны працяг.
1979

* * *

Мяняецца ўсё ў прыродзе —
Так, як на дрэве лісце.
А. мо я ўжо ўсё-ткі прыходзіў
На гэту зямлю калісьці.

Прыходзіў, ды толькі пра гэта
Зусім я забыўся ўрэшце:
Мінула ж мо безліч летаў
І зімаў з таго прышэсця.

Было ў якой гэта эры?
І дзе? У якім паўшар'і?
Мо ў Таўрыі ці ў Кардыльерах?
Ля Нёмана? У Запаляр'і?

Якім быў я — белым ці чорным?

І кім — у далёкім тым веку?
Ды, зрэшты, мне гэта ўсё роўна,
Галоўнае — быў чалавекам.

Блукаў я пад сонейкам нашым,
Што так жа хадзіла над жытам
Во гэткім жа — не інакшым —
Бясконцым і чыстым блакітам.

Араў я зямлю сахою,
Усю засяваў насеннем.
Пад белай і яснай зарою
Ёй песню спяваў з натхненнем.

Мой след у стагоддзях згубіўся,
Ды толькі на роднай планеце
Увесь я не растварыўся
Дзесь пад рабінавым веццем.

Душа мая — тое, што доля
Дала, нібы дар, чалавеку —
Бялюткаю хмаркаю вольнай
Увысь паплыла над рэкамі.

Не ведаю, колькі па свеце
Яна над зямлёю блукала,
Ды толькі па нейкай прыкмеце
Усё ж мяне адшукала.
1979

* * *

Дзень прапаў у мяне...
А як хораша ён пачынаўся!
Як ён птахам дзівосным увысь узлятаў,
як іскрыўся і ззяў,
калі я прачынаўся!

І не згледзеў,

калі адляцеў і сканаў,
склаўшы — ціха так — крылы
(Толькі стужкай расстайнай зары памахаў
мне з небасхілу).

Дзень прапаў...
У мяне яго ўкралі з-пад носа
(І чапляўся ж ён так за мяне
пальцамі сонечных промняў з нябёсаў!).

Дзень прапаў...
Не пярсцёнак,
не золата,
не каралі —
Дзень укралі ў мяне,
дзень укралі!

Я прыгадваць пачаў,
хто ж украў яго ўсё-такі, дзень мой,
Дзе шукаць яго толькі,
у якіх — мо хто бачыў — зладзеяў?

Так, зладзеі былі!
Вунь ён, злодзей — тралейбус
(Як ён пхнуўся па вуліцы,
турзаўся,
як ён бяздарна людзей вёз!).

Сход — другі са зладзеяў
(Так пакрасамоўнічаць там
хацелася кожнаму!
Гадзіны мо тры таўклі ваду ў ступе,
пералівалі
з пустога ў парожняе!).

Трэці злодзей быў лектар
(«Атрымалася накладка, таварышы,
казаў прафорг, трошкі яшчэ пацярпіце:
Хай сваё аддалдоніць —
і яму ж трэба жыць як!»).

Чацвёртым злодзеем была чарга,
што вілася змяёю ля крамы —
вы даруйце мне, вікінгі,
Я недзе пасля пра вас пачынаю:
          нешта выкінулі!

А яшчэ... Ды ці злічыш зладзеяў усіх,
якія
(мо трэба было трымаць абцугамі?)
Па хвілінах
мой дзень,
як ваўкі, расцягалі!

Дзень прапаў у мяне...
          Дзень гэты доля дала мне,
          спусціўшы на сонечных струнах —
Каб іграў і свяціў...
Які зраўняцца з ім можа
дарунак?

Ён адзіны быў. Гэткага болей не будзе!
І вось у бездань стагоддзяў
(паспрабуй адшукаць цяпер там)
ён кануў.
Як камень.

Дзень прапаў у мяне!
Дзень!
1984

* * *

Так проста, думаеш, браток,
Наш быстры дзень —
з яго званамі,
з вясёлкамі і перунамі,
з багамі, бомбамі, збанамі,
з суддзямі, з пленумамі, з намі —
Схапіць у гэты во радок?

Каб нават праз стагоддзяў морак
У тым радку, што не зманіў,
Ён, дзень наш,
гэтак жа званіў,
і так жа ззяў,
і так жа цвіў,
Ну, словам, так адбіты быў —
Нібы ў маленькай кроплі мора!
1984

**ХАКІМ**
**Маналог вернападданых**

Егіпецкі тыран Хакім з дынастыі Фацімідаў загадаў сваім падданым быць на нагах, працаваць толькі ўночы, а ўдзень — спаць. І так цягнулася 25 гадоў (996—1091).

Усё перавернута ў нас
уверх дном:
Стаў ноччу нам дзень,
ноч — днём.

Адно чарнарызы
заясніцца ўсход
(Мо сонца падходзіць
да небных варот?),

Як граюць нам трубы літыя:
адбой!
І спаць мы ляцім —
кожны ў закутак свой!

Сцямнее — ўстаём мы,
а светла — зноў спім:
У вечную цемру
нас кінуў Хакім.

Нашто? Разважаць
не дазволена нам:

За ўсіх нас, падцаных,
ён думае сам.

Ці трэба нам бачыць,
як правіць Хакім?
Ён знае, што робіць
з народам сваім!

Ну, хіба ж мы кепска
уночы жывём?
Так лоўка ўсе ў цемры
і сеем, і жнём!

Да змроку мы свой
прызвычаілі зрок.
Нам добра ў цямноце:
няхай жыве змрок!

Дармо, што не бачылі
сонца даўно
(Хіба што ў паданнях
нам свеціць яно),

Шчаслівыя, мы
не бядуем па ім:
Найяснае сонца для ўсіх
Хакім!

Навекі пакончыў
ён з сонцам і днём:
У новае заўтра
цяпер мы ідзём.

Мы славім Хакіма,
пяём яму гімн.
Ён выдзеліў ноч нам,
вялікі Хакім!
1979

## ВЯКОЎ

Народы ніколі не зацікаўлены ў тым,
каб знішчаць адзін аднаго. Дзень
падзення дэспатаў будзе першым
днём згоды і міру паміж народамі.
*Адам Міцкевіч, 1832 г*

За вокнамі —
У сонцы ўвесь —
Наш дзень,
З мітусянінай,
З вуркатам матораў.
А тут, між стэлажоў —
І ціш, і цень,
І — паскам залатым —
Прамень з-за штораў.

Архіў дзяржаўны.
Сховішча вякоў.
Мне лашчыць слых
Папер пажоўклых шолах.
Пыл з папкі здзьмухваю
З усіх бакоў
І ціха адхінаю
Часу полаг.

Здалёку чую:
Тупат капытоў...
Гучней, гучней...
Чыіх там конніц хмары?
Жалеза лязгат,
Гулкі звон шчытоў,
І стрэлаў свіст,
І далеч у пажары!..

Ізноў — вайна!
Ізноў у свеце — плач,
Зноў рэкамі па доле —
Кроў людская!
Калі б з вякоў сабраць яе,

Як бач
Зямля ў ёй захлынулася б
Старая.

Настаўніца Гісторыя!
Скажы,
Дзе корань Зла,
Адкуль на свеце Ліха?
Хто смерці сейбітам —
Мне пакажы —
Спрадвек вароты
Адчыняе сціха?

І чую я
Гісторыі адказ:
— Усё — да прымітыву
Проста гэтак:
Дзе спіць народ,
Улады лейцы ўраз
Хапаюць спрытна
Рукі прайдзісветаў!

І на яго, народ,
Што ў сне,
Аброць
Хутчэй накідваюць —
Умела,
З толкам:
Тады на ім,
Нямым,
У пекла хоць
Ты едзь,
Катайся,
Як захочаш толькі!

І ездзілі,
Каталіся,
І ён,
Як вол,
Спрадвек вазіў іх,
Хіжых цмокаў.

Куды толькі яны
У бегу дзён
Не заязджалі
На спіне шырокай!
1985.

* * *

Мне снілася: памяць згубіў я!
О які я стаў вольны!
Гэтакі груз скінуў з сябе!
Гарбець пад ім мне даволі!

Я вольны! Як птушка!
Развязаны рукі!
(Што гэта такое —
маральныя мукі?)

З якой я краіны?
Хто бацька? Хто маці?
Хто сам я ад роду?
Нашто гэта знаць мне!

Я — вольны!
Любоў да радзімы?
Да мовы роднай?
Я ўжо адвязаўся
ад повязяў тых
старамодных!

Я вольны...
Між небам я і зямлёю —
Мяне прышчапляй
да любога падвою!

Што хочаш ляпі з мяне,
быццам бы з воску —
Вала паслухмянага,
ідала,

моську...

Рабі з мяне затычку,
          шрот на суседа,
Калун тупаносы,
мачалку,
тарпеду.

(У шчэпкі свет гэты разнось сабе
          ёю, тарпедай,—
Нічога ж святога ў мяне там.
          Ні следу!)

Пад сцяг кліч любы —
          пабягу я бясслоўна:
Без памяці я —
мне ж усё
усё роўна!

Я вольны!..
Трымайце мяне!
О дзе я згубіў сваю долю?
Пустэча ў душы...
Хто вызваліць можа мяне
ад гэтакай
волі?
1985

## КЛЁН

З гасцінцаў гул матораў
Ляціць і дзень і ноч.
Людзей жывое мора
Бурліць-гамоніць збоч.

А ты за лазняй-сушняй,
Што ўвесь свой век зжыла,
Стаіш сабе нязрушна,
Плячысты, ля сяла.

Учэпістым карэннем,
Што мкне ва ўсе бакі,
З зямлёй сваёю крэўнай
Ты зросся на вякі.

Адсюль ніяк не звадзіш
Цябе — вазьмі скрані
І ўжо не перасадзіш —
Ці ж пусцяць карані?

Не разлучыць з радзімай!
Хіба што разам з ёй
Перасадзіць магчыма
Цябе з тваёй зямлёй.
1985

* * *

Зноў свята ў мяне —
 у руцэ маёй кошык.
Сцяжынка, як ліс —
 між ваўчкоў і валошак!

Дзень добры,
 асмужжа наймілых аколіц,
Што ўдоўж і ўшыркі
 былі сходжаныколісь!

Вярну пад Пагон —
 у расянае ранне.
Ён спіць яшчэ, лес,
 патануўшы ў тумане.

Здалёку пануры, халодны,
 а ўвойдзеш —
Па-свойску сустрэнуць,
 расступяцца хвоі.

Камлі — што калоны,

вяршыні — шаломы.
Нібы ў найраскошныя
трапіў харомы!

І скрозь пад нагамі —
ну чым не ў палацы? —
Імшаных лапекаў зялёных
паласы.

Ды што там палац той!
Лес — дом наш бясцэнны,
Расчынены насцеж,
бясстольны, бясссценны.

Тут сонца і цені
гасцююць ад рана,
Гуляе ў ім вецер,
заходзяць туманы...

Як ціха ў ім сёння!
У поўным спакоі
Пазвешвалі голле
маўчлівыя хвоі.

Па мху толькі й шнырарць
цяперака вочы —
Пад гліцай даследуюць
кожны грудочак!

*

Грыбы... Хто з нас змалку
на кліч іх штолета
На золку не ўскідваўся
з ложкаў нагрэтых?

Мы ў лес нацямку яшчэ
дружна ляцелі —
Ці ж можна ўляжаць
у час гэткі ў пасцелі?

Па мхах-верасах
з кашалямі снавалі:
На баравікоў
о як мы палявалі!

Хадзіць нам не трэба,
малым, было доўга —
Дзе селішчы іх,
мы ўсе ведалі добра.

А распачыналі
сваё паляванне
Мы ў ліпені дзесь —
пад грамоў вуркатанне.

Спачатку ў гушчар
не спяшаліся надта:
На нас больш узлессі
глядзелі панадна.

Ідзеш там, і раптам
між купін сіўцовых —
Аж ёкала сэрца ў нас:
чорнагаловікі!

Далей, пад дубамі,
па лісці іржавым
Яшчэ неспадзеў —
веліканы бялявыя!

З лазовага ж куста —
папробуй падрэж там!—
Цяглі часцяком жаўцякоў мы —
па рэшату.

Крамяных малойцаў
выпорвалі ўмела
Па сцежках, раўках,
каляях утравелых...

Пазней, калі жнівень
    на ўсе свае ўгоддзі,
Як паваў,
    згусцелыя ночы выводзіў,

Калі —
    так прыкметна ўжо скарацелыя
Саломай святлянаю
    дні залацелі,

Пасля ленаватых
    дажджоў-грыбасеяў,
Што, нібы заслона,
    над светам віселі,

Спяшаліся мы ў хвайнякі —
    пад іх шатамі,
Дзе нават у сонечны дзень
    цемнавата,

У просеках цесных —
    глядзі ва ўсе вочы! —
Такіх рыжманоў
    між камлёў мы высочвалі!

*

Здаўна на сялянскім
    стале небагатым
Меў грыб сваё месца —
    і ў будзень, і ў свята.

Быў ён не раскошай,
    не далікатэсам —
Ядою звычайнай,
    грыб з блізкага лесу.

У годы няўроду,
    у мор, у галечу —
Прыроды дарунак —
    як быў ён дарэчы!

А ў часе Айчыннай Бяды
усенароднай
Ён так ратаваў нас
ад смерці галоднай!

Я помню, як мы
у нішчымніцу ласа
Грыб пахкі лавілі
відэльцамі з квасу.

А шчасце якое
было для малечы,
Як маці патраўку з грыбоў
несла з печы!

Яшчэ калі іх —
гэтак рэдка быў скорам!
Акрашвала маці
цыбулькай ды здорам.

Са смакам і смажаны грыб
елі ўсе мы —
На ўласным алеі
з ільнянага семя.

Ды ўсё ж вы сапраўднага
смаку не мелі,
Як з баравічкамі
мачанкі не елі!..

Грыбы ў нас
варылі, сушылі, салілі…
Сто страў — сама меней —
здаўна з іх рабілі.

Але ў нас заўсёды —
вам скажа любы —
Любілі збіраць больш,
чым есці,
грыбы.

Ад вуліц стозыкіх,
ад чэрг шматгалосых
Я ў цішу лясную
уцёк, як ад восаў.

Ні тлуму, ні гаму,
ні масак, ні мумій —
Усё тут наросхліст —
для сэрца, для думак.

У стройбішчах дрэў,
у палеткаў прыволлі
Цябе не падсядзе ніхто,
не падколе.

Хадзі сабе, вольны,—
па сцежках, без сцежак —
Ды слухай душою
зямлі ўсёй бязмежжа.

У добрым суладдзі
прыроды няўвішнай
Заўсёды мне бачыцца
сэнс найвялікшы.

Лад гэты, спакойнае
часу цячэнне —
То мільёнагоддзяў наймудрых
тварэнне.

Вунь цягне мурашка
карынку сухую —
З якой гэта эры
яна тут шчыруе?

А птушка? А звер?
А расліна любая?
З якой даўніны
тут іх доля гуляе?

Мы, людзі, адвеку
тут з імі зжыліся —
У вузел адзіны
пад небам спляліся.

Дык хто гэта сёння
бяздумна так лезе
Той вузел спрадвечны
парушыць жалеззем?

*

Куды ж лепш пусціцца
мне з кошыкам сёння?
Мо ў Пераваловкі —
пад хвой парасоны?

Дзе гоман пчаліны,
дзе верас ліловы...
(Мо неруш чакае там
баравіковы?)

А мо ў Кадаўбы?
Па гаях тых арэхавых
Мо й сёння гуляе
вясны маёй рэха?
Ці зімнікам выйсці
ў бруснічныя Хімры?
Якія бяздонныя
там небасхілы!..

*

Вадзіце ж, кружыце
па свеце барвовым
Мяне, пералескі, гаі,
пацяробы!
Свяціце здалёк
сіняй тайнай смугі мне,
Будзіце ў душы
найвысокія гімны!
1981

## АГОНЬ У КАМІНЕ ДОМА ЛІТАРАТАРА

Яго, як ваўка, мы —
за дзверы, за дзверы! —
Электрыкі пугай
зганялі з кватэраў.
Ён зубы ашчэрваў —
так раптам стаў лішні? —
І бег па далей ад нас,
хвост падтуліўшы.
Здалёк абмінаў —
лепей дождж самы слотны! —
Ён стойбішчы гулкія
гмахаў высотных.
Імчаўся гіалямі
і ў хатах старэчых
Заскакваў, шчаслівы,
ў грубкі ды ў печы.
Яшчэ мо ў турыстаў
альбо ў пастухоў дзе
У сівер і ў золь
ён прыстанак знаходзіў.
А сёння праз гэтулькі сценаў,
аж дзіва,
У светлы палац наш
убег хапатліва.
І во ўжо ў каміне —
глядзі, хто не бачыў! —
Жывы, нерастрачаны,
весела скача.
Той самы, што некалі,
ясны, штовечар
Збіраў нас зімой
ля камінка, малечу.
Той самы, што ў восеньскі дзень
ад напасці
Дажджоў-імжакоў
бараніў нас на пасце...
Вярнуўся да нас ён
і ў зале, на сходзе,
Усіх нас, з кім знаўся калісь,

пазнаходзіў.
Патрэсквае звычна
й паленне з сучкамі
Дрыготкімі ліжа сабе
языкамі.
Як хутка ў палацы
асвоіўся, шустры!
Так пераліваецца
чырванню ў люстры!
Як добра нам з ім
тут сядзець, ля каміна,
Ды грэцца маленства
жывым успамінам!
Дый хай жа не гасне
у сценах ён гэтых,
Дзе ў спрэчках скрыжоўваюць
коп'і паэты.
Здаецца мне, будзе
тут вельмі дарэчы,
Калі і ў радках
ён чыіх затрапеча!
1985

**ТУГАНАВІЧЫ**

Туганавічы...
Бераг цішыні...
У іншы век
Вядзе мяне алея...
Во тыя ліпы,
Тыя камяні
І тая
Лісцяў восеньскіх завея.

Галінку арабіны
Адсланю,
І перад здзіўленым
Маім паглядам
Устане дом той белы
Між агню

Імжой прымружанага
Лістапада.

Што белае мільгнулася
Між дрэў?
Пужлівых веек прамяні...
Марыля!
Не, ясны факел той
Не адгарэў!
Гады былыя
Не адгаварылі!

З вачамі, як азёрамі,
Юнак
Сюды нёс
Сэрца раненага струны.
З нябёс прыплыўшы,
Чуйныя,
Няўзнак
Прычальвалі да ліпаў
Ночы-стругі.

Альтанка.
І — яны.
Свячэнне воч
У цемры —
Як змясціць у слове буру?
— Даруй... Я вінавата...
Гэта ноч...
Цябе я, ведай,
Вечна помніць буду...

У пальцах пальцы тонкія —
Ад іх
Як адарвацца?
Ну, а тут — світае.
І між лісця,
Як ветру ўскалых,
Як светлы промень сонечны:
— Кахаю...

— Кахаю...—
І па сёння тут яно
Бязважка,
Слова вечнае,
Лунае.
Мінуць вякі,
А рэха ўсё адно
Тут перакатваць будзе зноў:
— Кахаю...

Агонь юначы,
Чысты, трапяткі,
Што тут заняўся ў сэрцы
Ў тое лета,
Панеслі ў свет
Крылатыя радкі
Абыдзенага доляю
Паэта.

Змяркаецца...
Плыве за Сэрвач цень
Ад трапяткіх таполяў
Пры алеі:
Пайшоў за небасхіл
Высокі дзень —
Ён стужачкай зары
Здалёк алее.

З-пад хмар дыхнула холадам —
На дождж?
Забудземся на попел
Свар і звадаў...
Да ног хінецца
Лебяда ды хвошч...
Што там,
За спахмурнелым даляглядам?

Калёснаю дарогай травяной —
З якіх яна тут,
выстылая,
Летаў —

Прайду пад вартаю
Узбочных хвой
За сухадол,
Пад Камень філарэтаў.

Тут, у цішы,
Дзе светла ад расы,
Не з небыцця —
З былiннага Далёку
Зноў вернуцца
Жывыя галасы,
I твары юныя
Ўсплывуць са змроку.

Лабады Зан.
Міцкевіч задумёны.
Жывы, рухавы карантыш
Чачот.
Дамейка, Слізень...
Светлы я імёны...
Гарэнне сэрцаў,
Дум высокі лёт.

«Радзіма», «Воля»,
«Роўнасць між людзьмі» -
Гарачыя
Наўкол луналі словы.
За край,
За люд загнаны
Ўстаць грудзьмі
Усе былі,
Найшчырыя,
Гатовы.

Ды быў шчэ модны
Самаўладдзя мур —
Скрані папробуй
Юнымі рукамі
Сцяну глухую,
Што сабе ж —
Чаму?! —

Бяздумна людзі
Ўзносілі вякамі.

Аб грозны маналіт
Сцяны глухой
Разбіліся
Юнацкія лятункі.
Ну, а саміх
Часінаю ліхой
Па свеце размяло —
Ва ўсе кірункі.

Але куды б ні закідала іх,
Душою тут былі —
Дзе сцежкі ў руце...
І сніўся край бяроз
І ліп сівых...
Туганавічы...
Камень той у Куце.
1985

* * *

Я для цябе нішто — цяпер я знаю.
Ды ўсё ж я доляй не абыдзен, не:
Ты не мая, ды ёсць ты у мяне —
Я зноў і зноў кажу табе: «Кахаю...»

У сэрцы — сонца: цокаюць твае
Дзесь чаравічкі тонкія па свеце,
І валасы твае чапае вецер,
Зямля табе сцяжынак петлі ўе.

Як раніца ірдзее у расіне!
Як у ставах стаяць высока дні!
Гатоў я ў леце, поўны дабрыні,
Маліцца мошцы кожнай і расліне.

Як лён цвіце! Як маніць даляў дым!

Мне любы свет — бо ходзіш ты у ім.
1986

## «У РАМКАХ ДЗЕЮЧЫХ СТРУКТУР»

Вось вы сказалі — «народны фронт». А што, хіба мала нам народнай улады? Мы ж можам, і зусім паспяхова, вырашаць нашы праблемы ў рамках дзеючых структур.

*З аднаго інтэрв'ю*

Так, добра зведалі усе мы
На ўласнай скуры, мностве скур,
Як вырашаюцца праблемы
У рамках дзеючых структур!

Хто не дранцвеў з нас — і не трошкі!
Перад сталом, дзе чын, як мур?
Што ж, для яго мы толькі мошкі,
Найнадакучлівыя блошкі
У рамках дзеючых структур.

Мы ўсе ў гульні ягонай — пешкі,
І нас ён, гэткі пампадур,
Як хоча, соўвае без спешкі,
Гуляе намі зноў (ці ж смешкі?)
У рамках дзеючых структур.

У рамках дзеючых структур
Спазналі мы — ці помняць вёскі? —
Разгул крывавы харчразвёрсткі,
Архіпелаг ГУЛАГ найжорсткі,
Лубянкі, Курапатаў вёрсты,
Дзе клалі нас за турам тур
У рамках дзеючых структур.

У рамках дзеючых структур
Ступіць самім нам не давалі.
Нас догмаў путамі вязалі,
Ўсе думкі нашыя кілзалі
Ды рот нам кляпам затыкалі —

Сядзі, бы пад карчом пячкур!

Дык зноў у «рамкі» заганяць нас?
Зноў падганяць усіх пад шнур?
Зноў, бы паддоследных, трымаць нас
У рамках дзеючых структур?
1979

## ЗАПАРОЖЦЫ

Куды ты нас вяла ўрачыста,
«Адзіна верная дарога»?
Я чуў нядаўна ад статыстаў:
Мы ўсе — за беднасці парогам.
У Дом Дастатку, Хорам Шчасця
Мо ўбеглі хіба сцяганосцы.
А ўсім нам як туды дапасці?
Мы — за парогам. Запарожцы!
Няўжо ж мы ўломкі, абібокі?
Калі наш люд цураўся працы?
Ды з мазаля ж яго ў аблокі
Ішлі, свет дзівячы, палацы.
Было ў яго не пуста ў дзежцы,
У госці мог ён сябрука зваць.
Ды толькі лезлі самадзержцы
Як жыць, як жаць яму указваць.
Усіх у рай дубцамі гналі —
Што ім людзей пакуты-мукі?
Інструкцый путамі вязалі
Яму, народу, моцна рукі,
Наш люд, што працаю быў знаны,
Цяпер пад гукі гімнаў гордых
Не працаваў — выконваў планы,
Стаяў на вахце, біў ракорды.
Ён не араў, як скрозь ратаі —
За першынство змагаўся часта,
Не сеяў — біўся за ўраджаі,
Не жаў — ішоў на жыта ў наступ.
Але зямля той грознай мовы
Чамусь зусім не разумела

І змагарам за хлеб часовым
Аддаць яго ўсё ж не хацела.
Ды мы крычалі: перамога!
Трубілі ў горны: пераможцы!
І вось — за беднасці парогам
Стаім цяпер мы, запарожцы...
1981

**ПАГОНЯ**

О Беларусь! Спрадвек
Усе цябе ў нас кралі —
Тваю зару між рэк,
Азёр тваіх каралі.

Народы новых дзён,
Як долю, ты страчала —
Арала, брала лён,
Палола, пела, жала.

Ды зноў чужак, бы цмок
(Дзе лік паганцам-цмокам?),
Цішком цябе здалёк
Высочваў хіжым вокам.

І, падабраўшы міг,
Ужо капыцціў долы.
Як стрэхі хат тваіх
Тады палалі ў полымі!

Сама ж пад стук падкоў
Ты паланянкай нема
Пры сёдлах крыжакоў
Крычала, звала неба.

Той крык сынам тваім
Ірваў душу, бы пешняй.
Сыны па краі ўсім
Сядлалі коней спешна.

І вось той зграі ўслед
Па балатах, па гонях
Не віхар мчаў праз свет —
Крывіцкая пагоня!

Чуў млосць ажно ў касцях
Крыжак, як, заяснелы,
Уваччу ўзвіваўся сцяг
Твой бел-чырвона-белы.

У спіны ж — уцячы б! —
Храплі ўжо коні ў гоне.
Імгненне — і мячы
Скрыжоўваліся ў звоне.

Кіпеў пад небам бой —
І ходкая сякера
Шукала пад бранёй
Ужо крыжацкі чэрап.

Як ворага рады
Пагоні сталь палола,
Не знаў ён ад жуды,
Дзе дзецца ўжо з палонам...

І так спрадвеку ты
Страчала каля гоняў
Навалу свалаты,
Свой бараніла гонар.

А хто ж за гонар твой
Здалее ўстаць сягоння?
Дзе, за якой гарой
Цяпер твая Пагоня?

Як мы не збераглі
Агонь яе праз вёсны?
Як упусціць маглі
Уласнай долі вёслы?

Парою найліхой

Перадалі ў бязволлі
Мы новай сіле злой
Сябе, свой край і долю.

Нам так яе ў той час,
Пагоні, не ставала,
Як ліха з ліха нас
Тугім шнурком вязала,

Як скрозь — што той Нагай!
Пад сцягам найкрывавым
Пайшоў гуляць наган —
Яго закон і права!

Гукаць бы — бойся, гун! —
Пагоню нам і ў час той,
Калі з пятлёй хапун
Па нашых хатах шастаў

Ды нас праз золь-туман
У ямы клаў пластамі,
Каб д'ябальскі свой план
Перавыконваць намі...

Ну, а калі з нябёс
Якісь бандыт чарговы,
Пульнуўшы ў хмару, трос
Нам трасцу на галовы,

На жыта, на гады,
Смяторную, на скроні,
Нам трэба б і тады
Было ўздымаць Пагоню!

Ды хто б яе гукаў!
Мы дома — горш, чым госці:
Залежым ад кіўка
Брывянага чыйгосьці.
1990

# ПАЭМЫ

## ХАТ ВЯЧЫСТЫ ДАР

### I

Усё — замкнёны кабінеты,
Што засланялі нас ад свету!
Гудзе аўтобусік, як жук,—
Хутчэй, хутчэй, спяцы навук!
Хоць адарваць сябе не проста
Вучоным ад сталоў-фарпостаў,
Ад скрэпак, папак, ад папер
І ад высокіх іхніх сфер,
А ўсё ж сядзенні пакрысе
Займаюць.
— Ну, цяпер усе?
Усе? Ніхто з нас не забыты?
Мо хто заспаў? — Усе, нібыта...
Пстрык! — і захлопваюцца дзверы,
Матор вурчыць нязлосным зверам,
І вось плыве ў вір вуліц чоўнам
Аўтобус, фальклары стаў поўны!
Бывай, бывай, наш храм навук!
Даволі цяжкіх творчых мук,
Даволі рад, нарад і сесій,
Даволі сектараў і секцый,
Вучоных пік, саноўных шпаг —
Спявай сваю нам песню, шпак!
Імчымся мы. Пры кожным — клумак
І, пэўна ж, свой клубочак думак.
Паўз нас плывуць дамы, дымы —
У свет зялёны едзем мы.
Там, за палямі, за лясамі,
За рэчак сініх паясамі
Пры паплавах, пры курганах
Схаваны вёскі ў туманах.
А ў вёсках тых — касілак лёскат,
А ў вёсках — бела ад пялёсткаў,
А ў вёсках — сонечныя будні,
А ў вёсках — сеялкі і бубны.
У вёсках — хаты, хаты, хаты,
І ў кожнай хаце — скарб багаты...

Унь бабка — час ёй неўпрыкметку
Твар у маршчыны ўзяў, бы ў сетку.
А ў іх, маршчынах тых глыбокіх,
Жыццця яе і часу крокі,
Усе вятры, усе дажджынкі,
Усе дакопкі і дажынкі,
Усе вяселлі і купаллі,
Што ў памяць да драбніц запалі...
Бяжыць аўтобус пад аблокі,
У сінь надземнай павалокі.
Там недзе ў хатах песня спіць.
Нам трэба песню пабудзіць.

*

Мы едзем роўна, нетаропка:
На карце выбрана ўжо кропка
(Каля яе — дарогі нітка,
Уся ў кружочках сёл, як нізка.
А побач — свет травы і красак? —
Нязнанай рэчкі сіні пасак).
Вірыць асфальт-шаша, грукоча:
Ўсе ціхаходы — да абочын!
Насустрач — плынь ракі машыннай.
Шуршаць, з шашою шэпчуць шыны...
Машыны — то з пяском, то з лёнам,
З жалезам, з мурагом зялёным.
А вунь ажно сцяна з праёмам
Дзвярным плыве, за ёй — паўдома.
Там, за бартом — куды? — паўз гоні
Мільгнуў табун паныла коней...
Пад поўдзень за вясёлым гаем
З асфальту проста ў поле джгаем.
Ды пыл нам не зніжае тонус —
Бяжыць-куляецца аўтобус.
То дзікам шлях пясчаны рые,
То ў гойны гай ныра рыбай.
Па вокнах голле вольх шаргоча,
Як быццам не пусціць нас хоча.
За лесам — зноў прастор адкрыты:
Да небасхілу ходзіць жыта!

А там — ківаемся праз сёлы:
Каменным брукам скачуць колы.
Як мак, дзятва ў пяску за брукам,
У агародах — цёткі крукам.
Мільгаюць студні, бэзу лісце
Ды разьбяроў паэмы — ліштвы...
А во ўказальніка страла
І з назвай «нашага» сяла!
Глядзім маўчком — не чутна жарту:
Што ж тут параіла нам карта?
Куды нас сёння занясло?
Ці хоць «фальклорнае» сяло?

*

Абапал шляху, у даліне
Схаваны хаты ў зеляніне.
Імчым туды і плюшчым вейкі:
Пыл хмарай з вуліцы-гравейкі.
Спярша глядзім, праўленне дзе тут —
Пытаць не трэба нам пра гэта,
Бо знаем (люд жа мы вучоны!):
Шукай яго там, дзе чырвона!
Такой методай вельмі скора
Гуртом знаходзіцца кантора.
Аўтобус робіць разварот
І сцішваецца ля варот,
Клубамі пылу акацыйшы
Будынкі ў бэзавым зацішшы.

Праўленне — дом двухпавярховы,
Цагляны, шматаконны, новы.
Ён — ад падмурка і да латаў —
Зіхціць ад лозунгаў, плакатаў.
Іх аж не месцілі ўжо сцены,
Дык ім паставілі вунь стэнды.
І тут і там — слоў звонкіх веліч
І лічбаў самых розных безліч.
На тых плакатах, дыяграмах
Усё падлічана да грама:
Якога ў годзе тым навару

Калгас чакае ад гектару,
Па колькі ў хлеве парасятак
Мецъ будзе ён ад свінаматак.
«Падбіты» малако і мяса.
І нават сіласная маса.
Вядома нават, што ўжо будзе
Налета ў гаспадынь на блюдзе.
Да лічбаў тых у падмацунак —
На кожным са шчытоў малюнак.
Во кура — знесла кучу яек,
Аж вылезці ёй з іх няма як.
Там, на шчыце — як нейкі кліч,
Свіны, з ружовым ротам лыч.
А унь — шуканняў творчых вынік
На цэлы шчыт кароўе вымя...

Паўз ты я стэнды і плакаты
Ідзём да кіраўнічай хаты.
Ідзём утрох мы — як звычайна,
Спярша Фядосік, наш начальнік,
За ім — шыракаплечы, грузкі
Яго намеснік з папкай — Гурскі
(Фядосік, каб хадзіць улегцы,
Яму даў кіраўніцтва лейцы).
І з імі — я: ў любы «вапрос»
Мне рупіць усадзіць свой нос.

Мы калідорамі грукочам —
Кіруем на таблічкі вочы.
Так, на дзвярах таблічак шмат:
Напэўна, немалы тут штат
Майстроў высокіх ураджаяў,
Што кожны год зямля раджае...
Во дзверы й галавы калгаса —
Сціхаюць тут нашы абцасы.
Бяром за ручку асцярожна
І адчыняем дзверы:
— Можна?
За скрэмзаным сталом шырокім
Стаяў сюды, к дзвярам, паўбокам
З траскучай трубкай тэлефоннай

Мужчына ў тэнісцы з нейлону.
Ён праз плячо зірнуў на нас
І адвярнуўся ў той жа час,
Бо трубку тую шчыра слухаў,
Не адрываючы ад вуха.
І толькі зрэдку дзёўб, як грак:
«Так-так!», «Так-так!» Зноў: «Так-так-так!»
Мы сталі ля стала, стаім,
Мяняем ногі перад ім.
Нарэшце трубка-балбатуха,
Глядзім, адносіцца ад вуха,
І нетаропка гаспадар
К нам паварочвае свой твар.
У пільным позірку няпстрогім
Мільгае водсвет насцярогі:
Хто ж гэта! Што й шчэ за назолы
Яму зваліліся на голаў?
Мо зноў якія штурхачы,
Што шныраць днямі і ўначы?
Так, знаю, шмат ён іх пабачыў —
Ад іх старшыні здаўна плачуць.
Бывае, снег яшчэ на полі,
Марозік раніцаю коле,
А тут па бездаражы ўскач
Ляціць вось гэтакі штурхач:
— Чаму не сееш? Кажаш — гразь!
Дык сей у гразь! Ці з крэсла злазь!
Так і становіцца на глотку:
Яму патрэбна лічба ў зводку!
А вырве — хлоп яе да папкі,
І толькі бліснуць яго пяткі!
Сюды і нос больш не заверне,
Не папытае, як там зерне —
Ці узышло хаця яно?..
Заняты іншым ён даўно!
А старшыня? Зноў чухай цемя,
Звані ў званы — шукай насенне,
Мудруй, кліч люд на разнарадку —
Распачынай усё спачатку.
Таму, каб неяк адчапіцца
Ад папіхайлы-плішчаніцы,

Давалі гэтакаму тыпу
Часамі чысценькую ліпу
І зноў рабілі сваю справу —
Жыты вырошчвалі на славу...
Пра штурхачоў было нямала
Гаворкі ў найвысокіх залах,
Ды хоць з трыбунаў іх клянуць,
Па сёння штурхачы жывуць
І хлеб спакойненька жуюць!..
Каб нам не быць якой загадкай,
Не мучыць старшыню здагадкай,
Адразу кажам, што й к чаму,
І руку ціскаем яму.
А каб было к нам больш даверу,
Фядосік цягне і паперу.
Яе, разважны, нетаропкі,
Чытае старшыня да кропкі.
А прачытаўшы, свой аловак,
Якім вадзіў пад кожным словам,
Прывычным, ледзь прыкметным рухам
Чамусь закладвае за вуха —
(Так — помню я з малой пары —
У нас рабілі цесляры,
Як размяралі бервяно,
Каб роўна легла ў зруб яно)
І са смяшынкаю, ахвоча
На нас скіроўвае ўжо вочы.
З яго прыветлівага твару
Сышла і насцярогі хмара,
Бо ўбачыў:
Не з таго мы складу,
Каго чакае ён, як граду —
Не штурхачы, не рэпарцёры,
Не душадзёры-рэвізоры.
— Вам трэба песні?
Што ж, паможам...
Чым толькі паслужыць вам можам?
(Хаця вучоныя ўсё ж мэты,
Відаць, у песнязборцаў гэтых
І іх няма чаго баяцца,
Ды... лепей паасцерагацца,

Бо ўсё-ткі ж і яны — пісакі,
Якіх пабойваецца ўсякі.
Тым больш старшыні — хто з іх грэху
Не зробіць дзе-небудзь у спеху?)
Вас, значыць, раскватараваць?
Што ж, трэба тут памазгаваць...
«Памазгаваўшы», ключ бярэ ён
І стукае па батарэі.
На гук-сігнал той праз хвіліну
Ў дзвярах вырастае жанчына
І застывае ля парога
Перад даўгім сталом Самога,
Чамусьці ўся, аж да пражылак,
Напяўшыся, нібы спружына.
Ёй старшыня пра нас тлумачыць
І ставіць важную задачу:
Па хатах, у людзей шаноўных
Цяпер жа размясціць вучоных,
— Ну, добра,— нас траіх жанчына
Абводзіць хуткімі вачыма.
Яна папраўдзе рада, бачым,
Рашыць складаную задачу.
І мы ўстаём, ідзём за ёй,
Раскланяўшыся з старшынёй.

*

І вось аўтобус наш лабаты
Памалу ціснецца паўз хаты.
Між нас — жанчына-павадыр,
Важаты наш і правадыр.
Мы ёй, жанчыне той з праўлення,
Ўступаем першае сядзенне —
Каб добра хаты аглядала,
Хутчэй нас раскватаравала.
Ля дома новага, пад вязам
Спыняемся. З жанчынай разам
І мы у двух з Антонам Гурскім
Ідзём дваром зялёным, вузкім.
Насустрач — рада ці не рада —
Ўстае і гаспадыня з градаў

(Што за дваром адразу, з краю),
Падолам рукі выцірае,
Абводзячы нас пільным вокам,
І к нам шыбуе борздым крокам...
— А, на пастой! Са сталаваннем?
Чаму ж ка мне з такім пытаннем?
Ты ж ведаеш сама, Пятроўна,
У полі я дзянёчак поўны!
Дзе ж часу я, скажы, знайду,
Каб гатаваць людзям яду?
Ды што ім вельмі і згатовіш?
Як ты людзям тут унаровіш?
А людзі ж — не абы-якія —
Вучоныя, бач, гарадскія!
Тут гаспадыні мы з Антонам
Адказваем вясёлым тонам,
Што хоць мы ў горадзе жывём,
Ды ўсё вясковае жуём,
Ды і раслі ж мы не ў дамах —
Таксама ў вёсцы, на камах.
Яды асобай нам не трэба —
Абы знайшлася луста хлеба
Ды, можа, скварка з агурком
Ці бульба з кіслым малаком.
Усё, што прынясе нам цётка,
Мы ўмомант падмяцём, як шчотка,
Пасля ж расплоцімся з ахвотай
І за яду, і за турботы.
— Што плата...— тут яна камечыць
Свой сказ:
Ці варта ўсё ж пярэчыць? —
Адзін ёсць толькі непакой:
Каб крыўды не было якой...
— Не будзе крыўды ў нас ніякай —
За ўсё вам скажам толькі дзякуй,—
Спяшаем мы запэўніць цётку —
Хутчэй узятую высотку
Замацаваць.
— Ну, што ж, раз гэтак,
Вазьму дваіх, толькі кабетак:
Хоць будуць лішнія клапоты —

Ці ж начаваць людзям пад плотам?
Мы да аўтобса шыбуем
І там ахвотніц дзвюх вярбуем.
Аднёсшы ў хату чамаданы
Жаночых розных прычындалаў,
Мы зноў пускаемся ў дарогу —
Далей, да новага парогу.
А сустракаюць нас усяк:
Той доўга лоб свой трэ — нібыта
Карову прадае ці быка,
Пасля ж згаджаецца так-сяк.
Другія — тут жа даюць згоду,
А іншыя дык і выгоду
Тут хочуць мець:
— От каб, Пятроўна,
Хоць слоўка за мяне тактоўна
Закінула ты старшыню —
Мне б шыферу на варыўню...
— Ну, што вы, цётка, я б з ахвотай
Ды ён не дасць раскрыць мне й рота..
Я, цётачка, зусім з канторай
Разлічвацца ўжо буду скора.
Мне там выструньвацца абрыдла.
Я даглядаць пайду лепш быдла
Ці буракі палоць у поле —
Там хоць цяжэй, затое — воля...
Памалу, з толкам наш важаты
Ўсіх растасоўвае па хатах.
Ёй, той жанчыне нешматслоўнай,
Мы кажам дзякуй, і Пятроўна
Нам зычыць поспеху ў адказ
І падбадзёрыць хоча нас:
— Вам працаваць тут добра будзе:
Усё ж някепскія ў нас людзі.

## II

Як колісь, будзяць мяне пеўні
У сучкаватых сценах спеўных.
Сюды, без лішняга вагання
Ўзяла нас з Лісам цётка Ганя —

Сівая ціхая жанчына
З надзіва сінімі вачыма.
Жыве у хаце той са скрухай
Яшчэ старэнькая свякруха.
Два ложкі іх каля сцяны
Стаяць за шырмай — два чаўны,
Што праз залеву і кудасу
Плывуць кудысь ракою часу.
Нам цётка адвяла святліцу —
Ўвесь дзень тут сонца залаціцца.
Чысцютка, ясна ў гэтай «зале»
З фіранкамі ды абразамі.
Ля покуці — канапа-ложак,
Цяперашняе наша ложа.
На ім пярыны і — пад вушкі
Нам, нібы воблакі, падушкі,
Тут з Лісам — кожны з нас паўголы
Спім пад багамі, як анёлы.

Я прахапіўся, мусіць, рана —
Шарэе ў шыбе неба цьмяна.
Над вухам дзесь, малы званар,
Звініць на хату ўсю камар.
Гергечуць гусі каля ганку,
Свайго чакаючы сняданку.
За ліштвай галубы буркочуць
Ды крыллем аб сцяну шаргочуць.
Мой зрок спыняецца на куфры —
Там нейкі водсвет скача: з кухні?
А! Гэта паліцца ж у печы —
Унь і ў акне агонь трапеча.
Вада пад накрыўкай сіпіць:
Так, цётка ўжо даўно не спіць.
Зайшла у хату во з двара —
Бразгоча восілкай вядра,
Ляскоча ў місцы лыжкай ёмка,
Стукоча глуха ў печы ёмкай.[1]
А вось — як выбух: на патэльні
Штось зашыпела — цеста, пэўне.

[1] Ёмка (дыялект.) — чапяла

І папаўзла па хаце змейкай
Дымочку сіненькая шлейка.
Пасля ж, як казка даўніны,
Запахлі хораша бліны.
І мне здалося: зноў я ў маці,
У той дзяцінай нашай хаце,
Адкуль за мараю услед
Даўно мы вылецелі ў свет.

*

Хай стол не ломіцца у цёткі
Ад страў няведамых, а ўсё-ткі
Тут можна добра і са смакам
Пад'есці нам, такім бадзякам.
Сярод стала неспадзяванкай —
Яда малечых год — мачанка,
Што на патэльні, як жывая,
Яшчэ унь бурбалкі ўздувае,
Такая пахкая, з дымком
І нават — там-сям — з вугальком
(Ад дроў бярозавых, што ў печы
«Пастрэльвалі» так недарэчы).
Там — міса з бульбаю-разваркай
(На бульбіне жаўтком— прыгарка),
Ад місы белаватай хмарай
У столь, пад бэльку верне пара.
Ля бульбы, трошачкі ўбаку,
На чыстым — з лёну — ручніку
(Даўно адзначыў чуйны нос) —
Бліноў прыпухлых ладны стос.
А побач — і смятанка ў місе...
Ну, што ж, цягні, брат, лыжку, Лісе!
Памалу, быццам нехаця,
Бяромся за яду, хаця
Мы ўжо даўно глыталі сліну —
Чакалі гэтую хвіліну.
— Вы ешце, ешце,— цётка просіць
І малака гладыш падносіць,—
Мо што й не так, ды чым багата,
Як кажуць, тым і рада хата...

Мы гаспадыніны сумненні
Развейваем тут у імгненне,
Налёгшы шчыра, са стараннем
На шчодрае яе сняданне.
За тым сняданкам неўпрыкметку
Распачынаем мы разведку:
Дзе ж тут (як кажуць у сталіцы)
Б'юць песень чыстыя крыніцы?
Ці мо не трэба нам шукаць іх?
Мо ёсць яны і ў «нашай» хаце?
Так, песні ёсць тут, і багата!
Ды... прыбылі мы пазнавата
Па іх.
...Калісьці — на выгодзе,
За прасніцай, у агародзе,
Удзень і ўвечар іх, бывала,
Свякруха цётчына спявала.
Спявала — сэрца расчыняла,
Бяду ды смутак разганяла...
Ды разагнаць вось не змагла:
Бяда ўціскі яе ўзяла
І крукам кінула на ложак,
Адняўшы мову. Хто ж тут можа
Цяпер у бабкі песні ўзяць,
Цудоўны мех той развязаць,
Дзе, звонкія, яны сабраны,
Навек жывымі пахаваны?
Вось так іх, пэўна, бабка ўсе
У іншы свет і аднясе...
А можа, словы і напеў нам
Тых песень цётка дасць? Напэўна,
Ад свекрыві ж пераняла,
У памяці прыберагла?
Так, цётка знала тыя песні,
Ды ўжо не ўспомніць іх, хоць трэсні:
— Мне, дзеткі, не да іх было,—
Хмурнее цётчына чало.

... Ад воч сватоў ды ад маністаў
Свяціўся дзень той прамяніста,
Шалелі коні — ад прыселля

Няслі далей віхор вяселля.
Там, на вазах — не ўседзець! — дружкі
Ішлі у скокі пад частушкі.
Ім памагалі добра бубны
Ды падпявала — вецер буйны.
У віхры там — рука ў руку —
На расфарбованым вазку
Сядзелі ў стужках ды ў вяргінях
Ён і яна — князь і княгіня!
Ён быў яе навечна, любы,
Яго усмешка, вочы, губы!
І тыя коні, тыя песні
Дзяўчыну проста ў шчасце неслі...
Ды па зямлі зеленалістай,
Па кроснах, хвалі каласістай,
Па росах, па шляхах краіны
У тыя ж самыя хвіліны
Паўзла ўжо ў сполаху пажараў
Вайна — крывавая пачвара.
І мары-шчасце маладых
Яна перавярнула ўміг.
Яшчэ не знялі шлюбны ўбор,
А ўжо трубілі трубы збор.
І ноч іх першая на свеце
Была й апошняй. Грозны вецер
Вайны — народнае бяды —
Як падхапіў хлапца тады,
Дык і па сёння, родны, ён
Прыходзіць толькі цётцы ў сон...

Змаўкае цётка тут, вачыма
Нацэліўшыся ў фотаздымак,
Што на сцяне, у рамцы простай:
Ва ўборах шлюбных, напаўросту,
З адкрытым позіркам юначым —
Цяпер мы толькі гэта бачым —
Ён і яна; на кожным твары —
Яшчэ ні ценю страшнай хмары.
А побач — і другая рамка:
У цётчын свет сямейны брамка.
Між здымкаў картачка адна

Нам кінулася: зноў — яна,
А на руках яе — дзіцятка:
З-пад локця — пухленькая пятка.
— Сын. Ад яго ж,— гне цётка голаў
Ніжэй.— Радзіўся ж от на гора...
Так, гора цётцы з ім хапіла!
Пад віскат бомбаў, у бахілах,
У ашкамётках брудных світкі,
Яна, прамоклая да ніткі,
Мо з месяц — дзе і брала сілы?
Дрыгву хлюпоткую мясіла.
Блакада! Ў твань, у буралом
Людзей смерць гнала напралом.
У пекле тым бясконцым маці
Не выпускала з рук дзіцяці.
Хоць у жанчыны ад знямогі
І голаду ўжо млелі ногі,
Але, прысеўшы дзе на грудзе,
Зноў совала дзіцяці грудзі,
Пакуль зусім не апусцелі:
Ледзь дух трымаўся ў яе целе,
Ды людзі, гэткія ж выгнанцы,
Бяздомнікі і абадранцы,
Ёй з дзіцем не далі загінуць.
Хтось удзяліў ёй сахарыну.
Разбавіўшы яго вадой,
Балотнай, бруднаю, рудой,
Рабіла — важны быў дарунак —
З анучкі сыслу-паратунак...
Пасля ў зямлянцы падрыжала,
Пакуль не схлынула навала...
Калі ж з балот дамоў прыйшла,
Не ўбачыла свайго сяла.
Гуляў між печаў толькі вецер,
Ды клён маячыў з чорным веццем.
А дворык з роднай хатай мілай
Для бацькі й маці стаў магілай...
У спадчыну ж ад іх — ці смешкі? —
Ёй дасталіся галавешкі.
Зноў у зямлянку лезь сырую —
Ў магілу гэтую жывую.

Ўзяла к сабе яна таксама
Свякруху, што назвала мамай.
Бо хто ж яе глядзець бы ўзяўся:
Сын, муж, дачкі дзве — ўсіх вайна
Ў яе прыбрала: старана
Тут партызанскаю была ўся.
Сама свякруха толькі цудам
Жыць засталася: тым прыблудам
Напала ў лапы; карнік ботам
У яблык збіў яе. З балета
Яна ўсе ж выпаўзла, хаця
Ужо для мукі, не жыцця.
І цётка колькі год ад ложа
Яе ўжо адысці не можа.
А сын? Жывы. Уберагла —
Ўсё ж маці смерць перамагла.
А пазмагалася нямала!
Гарбом хлеб чорны здабывала:
Касіла, жала, будавала —
Кал гас з руінаў уздымала.
Бывала, і ў ярмо — магла! —
Ўпрагалася замест вала.
Цяпер, як стаў хлапец на ногі,
Гукнулі ў свет яго дарогі.
Забраў ад маці сына горад —
Што ж, хай бы жыў, ды зноў ёй гора
Няладна ў сына штось — запіў,
На хату матчыну забыў.
Вось што чакае, ды дарма:
Штось ні самога, ні пісьма,
Дык ці ж наўме ёй тыя песні?
Іх дні турбот даўно растрэслі...

Што ж да сапа, то там павінны
Бруіць шчэ песень ручаіны...

*

На вуліцы — знаёмы рух:
Брыдуць паважнай чарадою
Каровы з ранак — сырадою

Плыве духмяны пах наўкруг.
Сваіх падласак каля плота
Чакаюць цёткі ўжо, вароты
Парасчыняўшы Ім. Падласкі
Ў двары заходзяць без падказкі.
На іх акруглыя бакі
Глядзяць-любуюцца жанкі
І ў хлеў праводзячы, як паваў,
Штось кажуць да кароў ласкава...

У чысты двор, даўгі таксама,
Мы з Лісам адшчапляем браму.
Тут, як сказала гаспадыня,
Жыве пяюха, Дрозд Аўгіння,
Якая, каб ахвота, скора б
Нам наспявала песень кораб.
Пад хлеў расчынены прастуем
Адразу мы:
Там недзе — чуем —
Аб дно драўлянае даёнкі
Пабрэньквае струменьчык тонкі.
Падпёршы плечукамі хлеў,
Мы ціха слухаем той спеў,
Ласкавы, просты і лагодны,
З малечых дзён знаёмы, родны.
Во спеў змаўкае ўжо, і хутка
Ў дзвярах хлява мільгае хустка.
У гаспадыні — грубы твар,
На твары — як зямля, загар.
Застыўшы ў сполаху, з прахона
Дзвярэй глядзіць на нас здзіўлёна.
Але ўсё ж дыпламат Арсены
— Перш-наперш, цётка, добры дзень!
І проста, хораша, з пашанай
Ён растлумачвае старанна,
Хто мы, адкуль, якія мэты
Нас прывялі ў падворак гэты.
Сцярожкі цётчын твар адразу
Яснее, і замест адказу
Жанчына звыкла ставіць доле
Даёнку з белым сырадоем

І з дапамогаю калена
Хлеў зачыняе свой, паленам
Падпёршы дзверы.
— А якія
Вам трэба песні — веснавыя?
Жніво? Калядныя? Вяселле?
Ці што купальскай ноччу пелі?
Дваровай выбітай сцяжынай
Вядзе пад хату нас жанчына.

...Мы песні розныя збіраем:
Усе ж яны — багацце краю.
У іх -— лятункі-сны людскія,
Народа думы векавыя.
Пустоты ў песнях тых няма:
Яны — гісторыя сама,
Сама зямля, яе прырода,
Душа адкрытая народа.
— Што ж, можна спець, — здымае з плота
Цадзілку цётка,— ды работа
Мяне чакае: сёння наш
Канец і дзе ўвесь на сянаж...
А мо за вёску той парою
Надацца б варта й вам са мною?
Там, як нідзе, маглі б пабачыць
Адразу ўсіх, што ёсць, спявачак...
— Чаму б і не! Ну хто ж не рады
Паслухаць добрае парады?

*

Як пчолы, абляпілі густа
Вяскоўцы бурт: скрозь — шапкі й хусты.
Ледзь паспяваюць самазвалы
Траву падвозіць. Цэлым валам
Яе бульдозеры-хапугі
На бурт унь сунуць без патугі.
Там людзі вал высокі гуртам
Хутчэй разгрэбваюць па бурту.
Пасля, змяніўшы сахары,
Ізноў гуркочуць трактары.

Сваім цяжарам мнагатонным
Яны ўціскаюць бурт зялёны,
Па ім катаючыся усяк —
І ўпоперак, І наўскасяк.
Траву, што спадвае з гары,
Другія ўнізе сахары
Бяруць на зубы-раскіракі
І ўскідваюць назад, пад трак!.

Нам, песнязборцам, дружнай працай
Няёмка збоку любавацца,
І мы здымаем пінжакі,
Плюём ахвоча ў кулак!
І — што ж, няхай жыве работа! —
З рук сахары бяром у цётак.
Такая праца — як бальзам
Заўсёды нам, сяла сынам.
Не толькі — каб тугі быў мускул
Ці сэрцу даць усё ж нагрузку,
А каб душой устрапянуцца.
У паўзабыты свет вярнуцца,
Ці ж не губляем паступова
Мы ў завірусе папяровай
Маленства свет, свае вытокі,
Зямлі бацькоў жывыя ток!?
Ну, а без іх, без гэтых токаў,
Мы — нібы дзерава без сокаў,
Нібы без глебы жалуды
Або як рыба без вады.
Нуль мастаку — без токаў гэтых,
Без іх паэты — не паэты.
Іх верш — душой як ні крыві —
Без токаў тых, як без крыві...
Хоць твары ў нас блішчаць ад поту,
Ды мы не кідаем работу —
З дзядзькамі поруч ды з жанкамі
Працуем спорна сахарамі.
Калі ж на колькі там хвілінак
Надарыцца нам перапынак
(Відаць, у торфе дзесь на лузе
З травой цяжкой машына грузне),

Мы сахары ў зямлю ўтыкаем,
На тронкі стомлена складаем
Крыж-накрыж рук і (часам цёткі
Яшчэ ўскладуць іі падбародкі)
І ўжо — такая завядзёнка —
Няспешнай бавімся гамонкай.
А мова больш за ўсё ідзе
Пра сена для кароў: і дзе
Яго вось нарабіць — загвоздка,
І тым турбуецца ўся вёска.
Ў людзей надзея на атаву:
Яна належыць ім па праву
(Сабраць тут першы ўкос калгасу
Хаця б хапіла сіл і часу),
Ды ўсіх трывога ёсць такая:
— Ці парасце атава тая?
З самой вясны — і што за годы! —
Няма, хоць ты крычы, пагоды.
Як заступілі халады,
Дык і не сходзяць нікуды.
Дасюль яшчэ — хоць лезь на печ —
Куфаек не здымалі з плеч!
Цяпер жа — суш яшчэ ў прыдачу:
Дык як жа думаць тут пра ўдачу?

Ад той атавы паступова
Пасля кіруецца размова
На іншы троп ужо — на жука.
Калгаснікам з ім — проста мука:
Як ні збірай, як ні палі,
А ён ізноў, як з-пад зямлі,
На бульбу сунецца, увішны,
Абсядзе цяўнік той, як вішні.
Не даглядзі, дык — от жа ўдасца! —
Усё падчысціць гэта трасца.
— Каб знаў, хто гэтую заразу
Занёс сюды, здаецца б, зразу,
Як жабу, разадраў таго —
Унь колькі шкоды ад яго!
— Ды што размахваць тут рукамі,
Мянціць дарэмна языкамі,

Дазнацца б, як вайну от весці
З ім, каб са свету пошасць звесці...
— А мо паслухаем вучоных?
Мо ў іх мацнейшы, чым праклёны,
На жука сродак ёсць? — да нас
Пытанне рубам: мы ў адказ
Ляпечам штось пра курапатак,
Пра розных доследаў пачатак
І кажам, што усё ж навука
Управу знойдзе і на жука.
— Ну, а цяпер як быць?
— Цяпер,—
Тут збоку дзядзька не ўцярпеў
(Папыхваў люлькай ён паволі),—
Насып на хвост яму ты солі!..
Лепш у людзей от папытай,
Што робіцца сягоння ў свеце
(Мо знаюць больш, чым е ў газеце?) —
Што там у Чылі, як Кітай?..
Ды наша гутарка-гамонка
Тут абрываецца: «трохтонка»
Ужо да бурта падкаціла,
Абдаўшы нас гарачым пылам.
Хоць рукі трошкі ў нас паслаблі,
Памалу сахары ды граблі
Каля травы зноў захадзілі —
Цяпер вяскоўцам не да Чылі.

*

Над буртам — сонца. Твар свой яркі
На міг схавае ў вэлюм хмаркі
І зноў глядзіць сабе з блакіту
На нас вясёла і адкрыта.
Няўзнак — таго не ўбачыш ходу —
Яно кіруе ўжо к заходу.
Усе мы гэта заўважаем
І бурт патроху ўжо звужаем.
Глядзіш, там будзе і канец —
Работы нашае вянец.
Ды тут выходзіць нечакана

Замінка: покуль мы аддана
З травой змагаліся, прыцыркаў
Сюды з сяла на матацыкле
Хлапчына з чубам пакручастым
(«То заатэхнік наш, начальства!»),
Маўчком бурт абышоў навокал,
Прыкідваючы штось на вока,
І ўзняў руку — увагі знак:
— Не так вы робіце, не так!
Мы разгінаем моўчкі плечы:
Што ж тут зрабілі недарэчы?
— Не трэба ўверсе гэты выгіб! —
І ўсім тлумачыць, колькі выгад
Тут будзе ўсё ж, калі без слова
Перарабіць той верх нанова.
Але «без слова» не выходзіць:
— Калі ты ўзяўся верхаводзіць,
Дык верхаводзь як трэба — дзе
Да гэтакай пары сядзеў?
— Мо га́ру дзе смактаў пад кустам
З хаўруснікамі?
— Замест сусла!
Па хлопцу ўсе адразу цёткі
Тут застрачылі, як трашчоткі.
Ды хлопец не вядзе і вухам —
Відаць, не раз такое слухаў!
Стаіць, грызе сабе травінку —
Чакае на жанок упынку.
Жанчыны ж свой зарад памалу
Губляюць і, хоць без запалу,
Бяруцца выгіб той спраўляць,
Нанова верх перарабляць.
Траву, што ўкладвалі пластамі,
Што трактары тут упляскалі,
Ужо як трэба мы складаем
І к вечару той бурт канчаем —
Цяпер калгасныя цяляты
Мо ў хлебе не аголяць латы?
А што прыйшлося тут патраціць —
Не пераробку лішак працы,
Не страшны гэтыя пралікі —

Усё ж маштаб іх невялікі.

### III

У хату дзверы — грук ды грук:
— Ці можна?
— Просім, просім!
Круг
Жанчына, што ўсё займаюць лавы,—
Што раз цясней: адклаўшы справы,
Ідуць кабеты й маладзіцы
Са светам песняй падзяліцца.
Спявачкі нам ужо знаёмы:
Аўгіння, гаспадыня дома,
Дзе мы прызначылі свой збор
(Для песень, праўда, тут прастор:
У доме ж светлым тым яна
Жыве — з вайны ўдава — адна;
Усе яе — чацвёра — дзеці
Ўжо разляцеліся па свеце;
Цяпер чакай, чакай, жанчына,
Пакуль хто возьме адпачынак
Ды замест тых пансіянатаў
Да роднае заверне хаты).
А во ў дзвярах — сама Графіня,
Пяюха, маці-гераіня:
Хоць дзетвары дом цэлы мае,
Ды спеваў цётка не мінае,
Яна спявала — песню ж цэняць! —
І на сталічнай нават сцэне.
Графіня — гэткае дало
Жанчыне прозвішча сяло.
Жыў граф тут калісь. Ну, а ў графа
Быў нос кручком — нібыта ў грака.
Такі ж во нос, як і той пан,
Займеў сялянскі сын — Сцяпан.
Так стаў ён Графам. Ну, а жонка
Назвалася Графіняй звонка.
Графіня, Граф — іх толькі й звалі.
Як клікаў Мінск яе, казалі:
«Спяваць паехала Графіня,

А Граф мяшанку носіць свінням!»

На сход зайшлі во наш — пачулі! —
Яшчэ пяюхі дзве — бабулі
Ва ўбранні колішнім (іх памяць
Нямала захавала, мабыць».
За імі дзверы адчыняюць
Жанкі шчэ... Ды хай выбачаюць,
Пра іх скажу я неяк потым —
Час прыступаць нам да работы!
Мы ля стала магнітафон
Пакручваем — хаця ж бы ён
Не здрэйфіў! Не, ўсё ж робіць, здэцца!
Аж адлягае ў нас ад сэрца.
— Ну што ж, пачнём?
У хаце ўмомант
Жаночы сцішваецца гоман.
— Пачнём! Але з чаго? З вяснянак?
З каляд? Жніва? Ці, можа, з Яна?
— Пачнём з каляд — каб нам з пачатку
Год абысці ўвесь па парадку.

*

...Зіма. Рукою зухаватай
Мароз нябачны ў абцугі
Узяў, скаваў палі-лугі,
Занёс, закідаў белай катай.
Спіць свет. Знямеў, застылы, змоўк.
І толькі глуха ў голым голлі
Бяроз, што сталі сярод поля,
Завея вые, нібы воўк.
Дзень, як матыль, мільгне, прагляне
На міг, і зноў — як не было:
Зноў шапку цемры на чало
Зямлі насоўвае ноч-паня.
Штораз яе гусцее цень.
Захопніца, з прыходам кожным
У дня адмервае вяльможна
Надзелы — карацее дзень!
Што ж будзе ўжо далей? Што стане,

Як дзень той сыдзе неўпрыкмет?
Ды гэта ж скончыцца так свет!
Жыццё зямное ўсё завяне!
Ды вось — у ладкі бі, народ! —
Сказала сонца ночы: хопіць!
І ноч спыніла ўжо захопы:
Дзень, уставай — цяпер твой ход!
Якая змена! Хто ж не рады?
Святло змагло злых сілаў звод!
Святкуй жа, свет, сонцазварот,
Спявай, гуляй — спраўляй каляды!
— Прыехала каляда ў вазочку
Ды на сівенькім канёчку...
— Прыехала каляда звечара, звечара
Ды прывезла дудак рэшата, рэшата...
— А вы, дудачкі, іграйце, іграйце,
А вы, дзевачкі, гуляйце, гуляйце,
А вы, хлопчыкі, свішчыце, свішчыце,
А вы, бабачкі, скачыце, скачыце!..
У хаце бацькавай бярвеннай
Ад сонцаў-пірагоў праменнай,
Прыбранай, радасна-іскрыстай
Ад каляды, што урачыста
Да нас, чаканая, прыйшла,
Дарункаў безліч прынясла,
Дзятва, пад коўдрамі, у марах,
Мы спім з усмешкамі на тварах.
І сніцца нам: у хвалях мора
І караблі, і белы горад,
Дзе ходзіць сонца па харомах
Ды водзяць віцязі ў шаломах
Ля ўсіх варот, з усім народам
Пад песні й скокі карагоды...
І раптам — дзе тут сон, дзе ява? —
Нас праўда будзіць — звон не звон —
Дзівосны спеў, што ад акон
На хаце ўсёй плыве яскрава!
— Добры вечар, пане гаспадару!..
Адчыні аконца на ўсход сонца!..
— У тваім дварку, як у вянку —
Тры. церамы з прыцяромкамі...

— У адным цераме — ясен месяц,
У другім цераме — красна сонца,
У трэцім цераме — дробны зоркі...
— Ясен месяц — сам гаспадар,
Красна сонца — жонка яго,
Дробны зоркі — дзеткі яго...
Адкуль жа спеў той, поўны ласкі?
З самога неба мо? Ці з казкі?
Глядзім мы ў вокны на ўсе вочы:
Што ж дзеецца там сярод ночы?
Што чыніцца ў снягах зімы?
І дзе там тыя церамы
З дзвярамі ясна-люстранымі
Ды з цуда-ганкамі разнымі?
У шыбах — зорак буйных збор.
А можа, песню нам зямную,
Што гэтак вабіць і чаруе,
Ён і пяе, той зорны хор?
Ды не, здаецца: на падворку
Людскую чуем мы гаворку!
— Масці кладку,
Заві ў хатку!..

...Не спяць ні бацька ўжо, ні маці —
Замітусіліся па хаце.
Во бацька корпаецца ў кноце:
Штось лямпа не гарыць на дроце.
— А каб ты спрахла ўжо! — Але
Жаўтлявы язычок у шкле
Заморгаў, засвяціў, і хутка
Змрок ад святла ўцёк па закутках.
У сенцы бацька йдзе, памалу
Ў дзвярах адсоўвае завалу,
І ў хату лезе — бокам, бокам —
Каза рагатая з падскокам!
А разам з ёю — што за дзіва! —
Ступаюць праз парог імкліва
Якіясь людзі — ці мо чэрці?
Ад страху можна тут памерці!
І мы пад коўдры — нашы сховы! —
Хутчэй засаджваем галовы.

Але ж і глянуць нам цікава,
Што гэта ў хаце за праява!
І з коўдраў мы, як ваўчаняты,
На хату косім вачаняты.
Там, за казою страшнай тою,
Дзед нейкі ходзіць з барадою!
А барада — аж да падлогі!
За ёй не бачны нават ногі!
У нейкіх посцілках за дзедам
Ці не вядзьмаркі скачуць следам?
За імі лезуць ад парогу,
Пусціўшы холад на падлогу,
Яшчэ унь плоймаю шумлівай
Якісь хлопцы нецярпліва!
Тым часам дзед той барадаты
Па хаце кіем сукаватым
Казу калматую кругамі
Ганяе, тупае нагамі.
Каза ж брыкаецца, якоча —
Чамусь не надта бегаць хоча.
Старому дзеду ў дапамогу
Тут гуртам хлопцы ад парогу
На хату ўсю — казе пад нораў —
Ўсчынаюць раптам песню хорам:

— Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра!
Ты расхадзіся,
Развесяліся
Па ўсяму дому
Гаспадарскаму...
Дзе каза ходзіць,
Там жыта родзіць,
Дзе каза хвастом,
Там жыта кустом,
Дзе каза нагою,
Там жыта капою,
Дзе каза рогам,
Там жыта стогам!..

Ад песні, што каля дзвярэй

Так загучала адмыслова,
Каза — што значыць хвалы слова!
Заганарылася мудрэй.
Зусім хадзіць тут перастала!
Пасля глядзім, цішком прыўстала
Ды грук аб зямлю — і ні руху:
Ляжыць, рагатая, без духу!
Бацькам, вядома, непакой
Ад яснай выхадкі такой:
Калі каза тут не паходзіць,
У полі жыта не зародзіць
І маці — не было б няўроду! —
Ў камору лезе і, не ў шкоду,
Брус сала цягне і кілбасы,
Хоць мы і сам! на іх ласы...
— Гаспадыня йдзе,
Каляду нясе...
Каза, угледзеўшы той дар,
Што гаспадыня й гаспадар
Паднеслі механошу разам,
На ногі ўскоквае адразу
І ну хадзіць, і ну скакаць!
Не трэба нават падганяць!
У такт казіным скокам бурным
Загаварылі скрыпка й бубен.
Пайшлі ў скокі і вядзьмаркі
Ў сваім убранні доўгім, яркім...
Панаскакаўшыся да поту,
Напеўшы песень у ахвоту,
Начныя госці адбіваюць
Паклон бацькам і адбываюць.
А «дзед» з дзвярэй на адвітанне
Яшчэ шле баньку пажаданне
Заўсёды дужым быць, здаровым,
Нібы крапак-рыжок баровы,
Ну, а пасля яму, ахвочы,
Пра новы год яшчэ прарочыць:
Каб быў ён з ранняю вясною,
З травой густою, сакаўною
Ды з жытам цяжкім, каласістым,
З адборным зернем ядраністым...

*

І рада маці, бацька рады —
Цяпер за поле ўсё і грады
Яны спакойныя: наўрад
Іх возьме суш ці выб'е град.
Ім сілы ўсе спрыяць павінны:
У меру — сонца, ў меру — ліўні...
Пайшлі каляднікі, панеслі
Далей сялом па ночы песні,
А ў хаце ў нас ад песняў іхніх
Гамонка доўга шчэ не ціхне.
І нам, малым, ніяк не спіцца:
Ну, як жа тут не падзяліцца
З сваімі гэтым дзіўным дзівам,
Што ўбачыць даў нам лёс шчаслівы!
Мы засынаем дзесь пад ранне,
Ды ў нас і ў снах — калядаванне.
А бацьку сёння недзе сніцца
Пад белай хмаркаю пшаніца,
Што, як той бор, шуміць наўкола,
Б'ючыся коласам аб колас,
А ў каласах, як зверaняты,
У цэлых шэсць радоў зярняты!
Вось бацька сцежкаю ў пшаніцу
Заходзіць, быццам бы ў святліцу.
Ідзе між каласоў, якія
Гамоняць з ім, нібы жывыя.
К сабе іх горне ён лагодна,
І тыя, нібы дзеці, згодна
Яму пашоргваюць па твары —
Яго надзеі, яго мары...
Назаўтра, толькі заяснее,
Снег па падворку засінее,
Праз сад пусты, што вымер нібы,
Кіруе бацька за сядзібы.
Там, пад пярынай снегавою,
Спіць рунь яго. Хай па-над ёю
Зіма клубкі мяцеліц круціць,
Зямлю і неба каламуціць.

Хай змерзла тая руні траўка,
Завяла, кволая маляўка,
Ды знае бацька: як здаўна,
Жыве усё-такі яна!
Пакуль нічым яна не значна
і воку простаму не бачна,
Ды за зямлю ўжо каранямі
Ўчапілася, як кіпцюрамі.
Пусціла ў глебу іх. глыбока —
Да жыватворных родных сокаў.
Патроху п'е іх, цягне ў жылы —
Падспудна набірае сілы.
А час праб'е, заграе маем —
І што яе тады ўтрымае?
Устане, вырвецца са сховаў...
Яна сваё шчэ скажа слова!

**IV**

Мароз трымаў яшчэ ва ўціску
Раллю, і рэкі, і бары,
Жучкоў, і вожыка ў нары,
Што ўсё хаваў у поўсці пыску.
А сам, вось так суняўшы рух
Усёй наўкол жывой прыроды,
Далей хадою ваяводы
Ступаў у шалях завірух.
І перад ім, перад тыраиам,
Нямела ўсё. У звоне дзён
Гуляў і, пэўна, думаў ён,
Што век над светам будзе панам.
Ды з поўдня, пасланец цяпла,
Падпольшчыкам — ці хто прыкмеціў?
Зусім нячутна свежы вецер
Прыйшоў пад вечар да сяла.
Заняўшы вуліц скрыжаванні,
Двары, лядовыя масты,
Ён ціха паздымаў пасты
Марозу грознага да рання.
Сарокі тую вестку-дар
Разнеслі ўміг ва ўсе староны:
— Ўставайце,— скінут сёння з трону

Зямлі найлюты валадар!
І ўстрапянуліся бярозы,
Хваіны стрэслі снег з плячэй,
Шляхамі небнымі шпарчэй
Хмар пацягнуліся абозы.

Але яшчэ ў палоне сноў
Маўчала немая зямля ўся
І зрынуты мароз кідаўся
У рукі ўзяць яе ізноў.
У наступ рваўся з новай сілай,
Прыхватваў раніцы, ліхі,
Заблытваючы ўсяк шляхі
Вясне, што блізка дзесь блудзіла.
Каб памагчы ёй адшукаць
Дарогу, ранкам сіняватым
На ўзгорак выбеглі дзяўчаты
Усёй гурмой — вясну гукаць.
— Гу-гу, вясна!
Гу-гу, красна!..
І ўжо ва ўсе бакі зямлі
Шырока песні паплылі.
Вясна за краем неба мглістым
Пачула спеў дзявочы чысты,
Высока крыллем узмахнула,
Цяплом, нявідная, дыхнула
І, ўзняўшы сонца над сабою,
Наўпрост упэўненай ступою —
Ці гай, ці поплаў, ці палянка —
Пайшла насустрач тым вяснянкам,
І тут жа, днямі і начамі
Сваімі звонячы ключамі,
Зямлю ўзялася адмыкаць,
З турмы лядовай выпускаць.
Паўсюль змываючы з угрэваў
Снягі направа і налева —
Аж люба — ручаі рухава
Панесла сонца па канавах.
І ўжо, сваю пачуўшы волю,
У наступ — як тут утрываць! —
Пайшла няўрымслівa трава

Па курганах, лагах ваколіц.
Ля хвой з-пад снегавой цямніцы
Пралескі вылезлі з ігліцы.
І курасле п, і сон, і браткі
Наўкол збіраюцца ў статкі.
І збажына, пачуўшы волю,
Ужо — глядзі — займае поле...
— Нясі, вясна, нясі
На зямліцу — травіцу,
На травіцу — расіцу,
На лясочак — лісточак...

Пяюць жанкі, пяюць ахвоча,
І свецяцца, блішчаць іх вочы,
На ўсё забыліся жанчыны,
І з твараў іх — глядзі — маршчыны
Знікаюць тут усе як ёсць:
Вяртаюць песні маладосць.
Хай непрыглядную, цяжкую,
Але ўсё роўна дарагую!
За песняй вольна песня льецца,
Ды часам спеў іх абарвецца.
— А як далей? Працяг які? —
Пераглядаюцца жанкі
Ды ўсё прыгадваюць па слову
Даўно не петай песні мову.
— От каб сюды Лях Станіславу!
Яна папела б тут на славу!
Зацягне колісь — век бы слухаў:
На ўвесь раён была пяюха!
— Была? А дзе ж цяпер яна?
— Цяпер? — уздых цяжкі.— Вайна...
Тут расказаць пара мне, мусіць,
Пра той найчорны дзень сяла
(Дзён гэтакіх вайна дала,
Не скупячыся, Беларусі!).

*

...Світала. Над зямлёй знямелай
Далёкі неба схіл нясмела,

Бы твар дзяўчыны сарамлівай,
Займаўся чырваннем цнатлівай.
Пра поступ сонца, што нясло
Дзень найцудоўнейшы ў сяло,
Паведаў голасна, з ахвотай,
На радасць, першым певень з плоту.
І, як спрадвеку, як заўсёды,
Забразгалі па хатах вёдры,
На ўсіх падворках песню будняў
Запелі жураўлі ля студняў.
Дзень пачынаўся. Ясны, сіні.
Уходжваліся гаспадыні
Барздзжэй: быў касавіцы час,
і ўсе спяшаліся якраз
На сена — з камінoў у высі
Дымы над хатамі віліся.
Салодка спалі толькі дзеці,
І ў іх — што бачылася ў снах? —
Гулялі ўсмешкі на губах,
Як і ў дзяцей на ўсёй планеце...
І ў гэты самы міг чароўны,
Шпачыных перасвістаў поўны,
Сюды, да ціхага сяла,
Да гэтых мірных хат, прыйшла
Бяда — у рабых маскхалатах,
У чорных касках сядлаватых.
У лес вакольны ад бяды
Не многія ўцяклі тады.
У школу ўсіх сабралі каты —
Ніводнай не мінулі хаты.
Пра тое, як гарэла школа,
Як доўга крык не моўк наўкола,
Як дзеці з маткамі сваімі
Палалі свечкамі жывымі,
Жанкі без слёз, як іх ні гоняць,
Не могуць расказаць і сёння.
У час, калі жахлівы, немы
Крык заціхаць пачаў пад небам,
На конях з лесу нечакана
Сюды прыспелі партызаны.
Бы віхар наляцеў на катаў —

Усіх знайшла іх тут расплата!
Ды ўратаваць з кастра людскога
Тады ўдалося ўжо не многа.
Вуглямі леглі, як адзін,
Вяскоўцы ў некалькі хвілін.
Згарэлі рукі, вочы, твары,
Надзеі іх і песні-мары.

*

Жанок жа, што спяваюць тут,
Збярог, няйначай, толькі цуд.
Як іх круціла ў сваіх спіцах
Вайны ліхая калясніца!
Вялі на допыт іх, згіналі,
Рабынямі ў чужыну гналі,
Яны ў дрыгве, ў вадзе калелі,
Ў агні жахлівейшым гарэлі...
Унь цётка Наста.
У той школе
Была й яна ў агні. Ніколі
Дзіцячы енк ёй не забыць:
Ён у вушах яе й стаіць.
З агню таго глядзяць штоночы
На цётку мацерыны вочы,.
Што сталі попелам сівым
На горкім печышчы нямым.
Згарэла, родная. Ад маткі
Адны ёй засталіся спадкі —
Яе ўсе песні: цётка іх
Запомніла з гадоў малых,
І, нібы скарб бясцэнны, любы,
У сэрцы беражэ ад згубы...
Ля цёткі Насты — хоць старая,
Уся ў маршчынах, ды жывая,
З хітрынкамі ў вачах вясёлых
І дробная (але не з кволых)
Сядзіць Марылька — кліча гэтак
Яе ў сяле стары й палетак.
Прайшла й яна праз вір вайны.
У першы ж год ужо сыны,

У лес падаўшыся са зброяй,
Забралі і яе з сабою.
Там справу і яна знайшла:
Ля партызанскага катла
Круцілася і ўдзень, і ўвечар —
Кухарка там была дарэчы.
Праз дні даўгія ліхалецця
Быў дом яе — бярозаў вецце.
Спазнала шмат яна з брыгадай:
І халады, і жах блакады,
Спеў куляў, дальнія паходы,
і гразь, і град — усе нягоды...

За спінамі спявачак, збоку,
Пры печы, не навідавоку,
Дзве маладыя, у «балонях»,
Жанчынкі — бачны мне — на ўслоне
Стуліліся, негаманкія —
Як кроплі дзве вады, такія
Падобныя. Зірнеш — сабою
На выгляд гожыя абое.
Ды. толькі што яны з-пад веек
Вачамі водзяць дзіўна неяк?..
Пасля пра іхні лес. нязвычны
Пачулі мы расказ трагічны.

...Была ў Ядвігі і Рыгора
(Жылі яны на ўскрайку бору)
У хаце радасць: тры сынкі —
Тры несціханыя званкі —
Ды дзве дачушкі-шчабятушкі:
Па тварах — крапінкі-вяснушкі...
І вось вайна... Да іх дварка
Звярнула неяк з бальшака
Машына раптам з чужакамі:
Прыблуды грубымі рукамі
Дзяцей ад маткі адарвалі
І ў кузаў кінулі без жалю!
Як маці ўслед за дзецьмі бегла!
Як галасіла ў свеце белым!
Але дарэмна: не вярнулі

Дзяцей гестапаўцы матулі.
У лазарэт аддалі — катам
З каменным сэрцам пад халатам,
З арыйскім іх нутром паганым
Пад гучным тытулам гуманным.
Да кроплі ў чорнай той бальніцы
Кроў выпілі ў дзяцей іх шпрыцы.
Навек, бы аганькі жывыя,
Дачушка й тры сынкі малыя
Пагаслі там — на майскай вішні
Завялі кветкі, не расцвіўшы.
Адна ўцалела з іх Галінка —
Яе сляза, яе крывінка
(У час разбойнага налёту
Была стаілася ля плоту).
Але бяда адна не ходзіць —
Другую за сабою водзіць.
Аднойчы да Ядвігі — «Немцы!» —
Крык даляцеў ад вёскі немы.
Дзіця схапіўшы ў спеху, маці
Лазовым хмызам, па ламаччы
У лес пусцілася — гулі
Абапал кулі, як чмялі.
Адна ўсё ж — на руках у маці! —
У сэрца трапіла дзіцяці.
Умомант дзеўчынка абвяла.
Ды маці й верыць не жадала
У гора гэткае: ці ж мог
Дзе дапусціць такое Бог?
Два дні шчэ на руках малую
Дачку насіла нежывую...
Як жыць цяпер было на свеце
Ёй, маці? Мо пайсці за дзецьмі?
Ад слёз, што дзень і ноч ліла,
Ядвіня слепнуць пачала.
З вайны прыйшоў Рыгор тым часам.
Лягчэй ёй стала трохі разам
З ім пераносіць гора глыбу.
Надумалі: яшчэ раз скібу
Жыцця перавярнуць набок —
Мо шчасце дасць цяпер ім Бог?

Дзіця чакала ўжо Ядвіня,
Але пакуль хадзіла ім,
Аслепла, пэўна, назусім —
Свет перад ёй закрыўся сіні.
Радзіла ўсё ж.
І як на тое —
Адразу не адно, а двое!
Ды толькі не для шчасця маткі:
Амаль не бачылі й блізняткі...

Выпрабаванняў тых, пакут
Не вынесла Ядвіня тут.
А хутка раны й тое гора
Звялі ў магілу і Рыгора.
Малых дзяўчынак узяла
К сабе Куліна: ўскрай сяла
Пад дзічкаю, як сіраціна
Яе хавалася хаціна.
Ў яе, ўдавы франтавіка,
Свая загінула дачка:
Не зберагла тады, вайною —
Жыла з тых дзён адна адною.
Куліна іх, дзяцей чужых,
Глядзела, быццам бы сваіх.
Начэй не спала, гадавала
І ў людзі вывела памалу.
І вось цяпер у адпачынак
Прыехалі дамоў. Куліна
На песні водгалас да нас
Сюды з «дзяцьмі» й прыйшла якраз:
Калісьці ж і яна слыла
Спявачкай між дзяўчат сяла...

У хаце мы сярод спявачак
І нашу гаспадыню бачым.
У гурце і яна нямала
Забытых песень прыгадала.
Ізноў гучаць яны — нібыта
Ускрэслі, даўнія, з нябыту...

*

...У гудзе пчол, у шале кветак
Ідзе па днях-прыступках лета.
Зямля, абласканая сонцам,
Такім старанным і бяссонным
(Унь як гарыць яно ў зеніце!),
Ад шчасця расцвіла — зірніце,
Як раскашуюць яе лозы,
Яе чарэмшыны, бярозы,
Як зіхацяць яе лугі,
Яе рачулак берагі!
Ні бы жывое, пад блакітам
У полі гойдаецца жыта.
Час налівання — важкі колас
Патроху ўжо схіляе голаў.
За жытам і ячмень вусаты
Напоўніў малаком зярняты.
А па садах, між лісцяў вабных,
Яснее вішня, спее яблык.
Плады свае раскрыўшы, ціха
Ляжыць зямля, як парадзіха.
Усё народжанае ёю
У рост ідзе само сабою,
У трубкі круціцца, буяе,
Насенне сокам налівае...
Дык як не славіць момант гэты,
Пару красы зямной, пік лета!

Сягоння ўранку — шмат хто бачыў!
Над лесу грабянцом зубатым,
Ледзь выплыўшы — такое дзіва! —
Гуляла сонца зіхатліва!
Ад залатой яго кароны,
Адняўшыся, ва ўсе староны
Ішлі, скакалі агнявыя
Кругі чырвоныя, жывыя!
Гуляла сонца, абвяшчала
Пра свята светлае — Купала!
Дзяўчаты з раніцы ў прыселле
Гурмой вясёлай беглі ў зелле.

Даўно манілі іх купалкі,
Што расцвілі пад сонцам палкім.
Мядункі, сонцы, васількі —
Усё ўпляталася ў вянкі.
А як дадому паўз дуброву
Ішлі са спевам, на галовах
Цвілі ў вянках дзявочых зёлкі
Усімі фарбамі вясёлкі.
— А на Йвана сонца грала,
Ой рана на Йвана...

Адгаманіў, як год, вялікі
Дзень неснядайны, ясналікі.
Пашчыраваўшы, споўз за вербы
Чырвоны сонца круг ля грэблі.
І вось на горцы, у прыволлі —
Яму на змену — па-над полем
Смалой абмазанае кола
На жэрдцы ўспыхнула, наўкола
Змрок разганяючы начыста.
Міг незабыўны, урачысты!
Дзяўчаты, хлопцы дружным строем
Усе ў святочных, лепшых строях —
Вакол агню пад песень гукі
Пайшлі, пабраўшыся за рукі,
У шчыры свой танок з падскокам,
Б'ючы у ладкі ненарокам,
Штораз барзджэй, штораз жвавей,
Штораз шчаслівей і жывей.
Калі б хто глянуць мог з-пад высяў
Сюды во, на зямлю, здзівіўся б:
На ёй яшчэ адно вясёла
Круцілася жывое кола!
Ноч на Купалу невялічка —
Што птушка хуткая, ноч-знічка:
Адна зара не ўспее згаснуць,
А ўжо другая неба ясніць.
Так, хоць малая ночка гэта,
Ды ў песень безлічы апета:
Яна ж — так лічыцца між люду —
Ноч незвычайная, ноч цудаў!

У гэту ноч, што мчыцца хутка,
З карчэўя, з нор, з усіх закуткаў
Вылазяць ведзьмаў плоймы сціха.
І борзда — хто на чапяле,
Хто на круку, на памяле —
Ляцяць да сёл: чакайце ліха!
А ліха ведзьмам трэба многа
Зрабіць людзям: без ліха тога
Пражыць не могуць яны й тыдня —
Такая ўжо натура ў злыдня!
Другая — шчурам ці тхарком —
У хлеў прасочыцца цішком
І там такога ўжо натворыць —
Ніхто нічым не загаворыць!
Часцей — падкраўшыся са схову,
Так высее вымя у каровы,
Што малака з яе, хоць лопні,
Ужо не выдбаеш і кроплі.
А то, бывае, апаўночы
У жыта, збродлівая, ўскочыць
Ды ўтворыць свой ліхі залом,
Звязаўшы каласы вузлом.
А ад яго, таго залома,
Бяды ўжо не мінеш — ці дома,
Ці тут, у полі, з ураджаем,
Якога ўсе штогод чакаем!
Таму, каб не пусціць у шкоду
Злы дух вядзьмарскі, перашкоду
Яму здаўна прыдумваў тут —
Абараніцца б толькі — люд.
Больш адганялі ліха тое
Ад хат пякучай крапівою,
Якой вароты ўсе й парканы
Заўжды былі паабтыканы
У ноч купальскую: не вельмі
Тады маглі пралезлі ведзьмы!
А іншы раз — не мецць бы гора —
Сяло з палеткамі разорай
Апераэаць, нібы папругай,
Рашалі: свежую, з-пад плуга
Раллю — падвох, напэўна, нечыйсць!

Пераступаць не смела нечысць.
Чынілі ведзьмам перашкоды
І тыя песні, карагоды,
Агонь купальскі, тое кола,
Што ў неба ўспыхвала вясёла...

У ноч купальскую у лесе,
Дзе з хвояў мох бароды звесіў,
Дзе елкі — воіны ў шаломах —
Цара пушчанскага харомы
(Пра іх паслухай казкі-былі)
Маўклівай вартай абступілі,
Дзе між камлёў, нямых, нязветлых,
Блішчаць зайчыных сцежак петлі
І ў цемрыве — казы ці воўка? —
З-пад вываратня свеціць вока,
Дзе каля пнёў пасталі войскі
Грыбоў чашуйчатых, нясвойскіх,
А па баках, як летуценні,
Істот нязнаных ходзяць цені,
Дзе сонна ўздрыгвае лаза,
Дол аплятае дзераза,
У гушчары, глухім, далёкім,
Куды не глянуць і аблокі,
На нейкі міг, кароткі самы,
Над казяльцом, над верасамі,
Над дзмухаўцовым сном нясмелым,
Свет азараючы знямелы,
Ўся распускаецца, без сведкаў.
Як сонца, папараці кветка.
Пра кветку-папараць стагоддзі
Жылі лятункі-сны ў народзе.
Каму, казалі, між завалаў
Знайсці б яе пашанцавала,
Ў таго б уміг — такія чары —
Збыліся ўсе надзеі-мары!
Зямля — о момант незвычайны! —
Яму б усе раскрыла тайны.
Пачуў бы ў свеце, вечна новым,
Ён зор, і дрэў, і птушак мову.
Пазбыўшы слёзы, ўсе пакуты,

Глухіх вякоў цяжкія путы,
У шчасця мілую краіну
Знайшоў бы ўрэшце ён сцяжыну.
Сцяжына ў шчасце! Спраку веку —
У хлюпату, у дождж, у спеку,
У золь, у люты вецер сцюжны —
Шукаў яе наш люд лапцюжны.
Да шчасця, знай, дарогі лёгкай
Няма — сякерай ды рыдлёўкай
Ён церабіў свой шлях круты
Праз бураломы, чараты.
Яго, яго ён вёў-праторваў,
Той шлях, калі ірваў-разорваў
Сахой-крывуляй, зноў і зноў,
Мур скамянелы дзірваноў,
Калі ў зямлю, якую ў пальцах
Усю да крошкі перамацаў,
Не скупячыся, што ні год,
Упарты, нёс і кроў і пот.
Ды на яго шляху заўсёды
Свае завалы-перашкоды
Стаўляў, выходзячы на ловы,
Цмок ненажэрны шматгаловы.
Вякамі з ім, звыродным цмокам,
Што краю сілы ўсе высмоктваў,
Народ вайну вёў: о, як яра
У схватках-сечах з той пачварай
Змагаліся — хай смерць, хай згуба —
Яго асілкі-вернідубы!
Ці бачыў, люд, ты ў гэтым цмоку
Гайню вяльможных крывасмокаў,
Што над табою стаўбунамі
Спрадвек стаялі з бізунамі,
Што край укралі твой, а з краем,
З зямлёй і волю ў цябе ўкралі?
Бы цацкаю, табой вярцелі
Уладакрады, як хацелі.
Ты быў для іх падрубай, глінай,
Нямой рабочаю скацінай.
Каб быў пакорным ты, ціхмяным,
Хадзіў у іх валом слухмяным,

Табе з амбонаў дні і ночы
Яны хлуснёй кадзілі ў вочы.
Так, як маглі, цябе цямрылі,
Пасля ж з тваёй цямноты й кпілі.
Як з «хама-мужыка» ў палацах
Умела панства пасмяяцца!
Як твае думы, тваё слова
У гразь таптала адмыслова!
Ды, зубы сцісну́ўшы, ты й далей
Тарыў сваю дарогу удалеч.
Не складваў рук, бо знаў, бо верыў:
Твае расчыняцца ўсё ж дзверы!
Не ты, дык сын, унук ці праўнук,
А ўрэшце ўсё ж здабудзе праўду!
Сахой ды граблямі, зацяты,
Сваю гісторыю пісаў ты.
А час прыйшоў, і з светам цэлым,
Атросшы сон стагоддзяў, смела
Загаварыў ты — не гаротны! —
Купалы голасам грымотным...

О кветка-папараць! О казка
Зямлі чароўнай, шчасця краска!
У час юначы, светлы час,
Хоць і не верылася ў дзівы,
1 мы шукаць яе хадзілі
У пушчу цёмную не раз.
Было: хлапчына светлачубы
З той, найдарожшай, што галубіў
Даўно ў найсветлых самых снах,
Цяпер — звіні ў душы, вясна! —
Рука ў руку, зусім не ў мроях,
Зямлёй прыціхлай пад зарою
Ішоў па росах, без дарогі —
Вялі абодвух самі ногі.
Ўвесь свет зіхоткі, як дарунак,
Ляжаў прад імі ў ціхіх рунах.
Як слаліся да ног ім зёлкі,
Туман клубкі разматваў, золкі!
Як конікаў аркестры ім
Жыцця ігралі вечны гімн!..

Праз ноч усю — адны ў сусвеце —
Блукалі так у спелым леце,
У хмелю траў, і шчасця кветку
Усё ж знаходзілі нярэдка!
Малую ночку на Купалле
Дзяўчаты й хлопцы год чакалі.
Варожбы, песні, шал гулянак,
Што не змаўкалі да заранак.
Ім аж да иовае вясны
Яшчэ вярталіся у сны.

V

Узгор'ем, долам, мройным лугам —
Прастор і воля! — беглі цугам,
У буйнатраўі па калені
Дні — хутканогія алені.
Штодзень — званчэлі далягляды,
Яснелі воблакі-панады
У сінізне: ішло згары
Дыханне іншае пары.
Ўначы над хатамі ў пакоры
Віселі, нібы слівы, зоры.
А ранкам гулкім за аблогай
Перад нязведанай дарогай
Шпачкоў-сяголетак чародкі
Ужо збіраліся на сходкі...
І ніва, што ўсё лета млела
Ў абдымках сонца, гэткіх хмельных,
Дажджы іліўні прагавіта
П'ючы карэньчыкамі жыта,
Стамлёная, ўжо ледзь трымала
Ўраджаю ўласнага навалу.
З сяла сцяжынкай травяною
Прайдзі пад вечар у жытное —
Пад белай зоркаю нямой
Там у трывожным шматгалоссі
Жывога, ройнага калосся
Пачуеш спеў зямлі самой...
Паспела жыта. Каласы,
Да долу звесіўшы вусы,
Угнуўшы дугамі сцябліны,

Сярпа чакаюць штохвіліны.
І ўсё настойлівей, ахвоча
Руплівых жней і ўдзень і ўночы —
Не перастояць жыту б толькі —
У поле клічуць перапёлкі.
Жаць, жаць! Жаць, жаць!
Якое ж сэрца
На гэты клік не адгукнецца?

Сягоння маці яшчэ з рана
Падлогу вымыла старанна,
Прыбрала ў хаце і ўрачыста
Заслала стол абрусам чыстым.
Зажынкі — гэта свята з святаў
Ужо даўно чакала хата.
А больш дзятва: шчэ з дзён вясновых
Салодка хлеб нам сніўся новы.
Прыйшоў, прыйшоў той светлы дзень!
Ужо да шафы маці йдзе,
Паважна дастае са сховы
Убор свой лепшы, паркалёвы,
Прыбралася — глядзіць шчасліва,
Пасля з паліцы беражліва
Бярэ у чысценькую хусту
Клін сыру, соль ды хлеба лусту,
Што дзесь з ранейшага прыпасу
Была прыхована да часу,
Кладзе на плечы звычна серп
І хоць паўдня шчэ[1], ды — няўсцерп! —
Кіруе ў поле. Каля нівы,
Ля віру каласоў шумлівых
Спыніўшыся — такі закон,—
Яе вітае і паклон
Ёй адбівае, ніве роднай,
Заўжды спагаднай, шчодрай, плоднай.
Сказаўшы ёй падзякі словы,
Свой серп назублены сталёвы
Здымае з плеч — і жыта спела

[1] Звычайна на зажынкі ішлі ў суботу надвячоркам, каб закончыць работу — нажаць цэлую бабку жыта — пасля заходу сонца.

Пад ім ужо зашаргацела.
Аж люба — з мацерыных рук,
Святляныя, за пукам пук
На перавясла каласы
Кладуцца — поля галасы...
Пасля, накінуўшы сноп-шапку
На светлую — «што слонца» — бабку,
З хусціны маці дастае
Прыпасы сціплыя свае
І йдзе ўжо да суседак-жнеек:
Зажон адзначыць трэба ж неяк!
А вечар — першы сноп нажаты
Нясе, шчаслівая, дахаты.
У кут чырвоны ганаровы
Стаўляе гэты сноп жытнёвы,
Які ў народзе — нівы дар —
Ад даўна клічуць — «гаспадар».
Так, гаспадар. Не ў сне, не ў мары,
А ў хаце хлеб хай гаспадарыць!
Яму ўсе ў нас, без прынады,
Служыць былі заўсёды рады.
Абы не кідаў нас і зроду
Каб не было яму тут зводу.

*

Як хлебадар, пад небам ясным,
Падперазаны перавяслам
(Звісалі гроны каласоў
Замест украсы-кутасоў),
Па бальшаках, па светлай ніве
Ішоў-званіў руплівы жнівень.
І гэты звон шматструнны жніўня
(Ад малку чуецца ён з ніў мне!)
Глушыў спеў птушак, гук касы,
Усёй прыроды галасы.
Жніво, жніво...
І песні нават
Прымоўклі ўсе. Наўкол яскрава
Адных сярпоў гучала мова:
Яны свае казалі слова

Ў руках у жней.
Хацеў бы я
Прапець тут гімн табе, жняя.
Ты, колькі свет іскрыцца гэты,
На постаці сваёй — праз леты —
З цямна ў нясцерпны самы сквар
(Аж залівала потам твар!)
Стаяла крукам. Цераз рукі
Твае, жняя,— што ў іх за рухі! —
Прашалясцелі, праплылі
Жыты ўсіх эпох зямлі.
Ты кожны колас, што раджала
Зямля, ў руках сваіх трымала.
Ды хоць ля жытняе сцяны
Не разгінала ты спіны,
Хоць несла кожны дзень дадому
Цяжкую, нібы камень, стому,
Хоць сонца жар круты цярпела
На ржэўніку, ўсё роўна пела
Душа: твой труд, твой пот салоны
Пярэсціў бабкамі загоны,
Свяціла золатам жытцо —
Твая трывога, сны, жыццё!
І вось — выпраствайце, жанчыны,
Свае натруджаныя спіны —
Апошняя палоса зжата!
Хіба ж для жней малое свята?
На ніве голай гурт жанок
Малы калосся астравок
(Хто ў вёсцы «барады» не знае?)
Вясёлым колам абступае.
Верх «барады» — такая звычка —
Абвязваюць чырвонай жычкай,
Пяюць ёй песні і, каб ніва
Зноў каласілаея шумліва,
У «бараду» хлеб-соль з пашанай
Кладуць. І, калі ўжо аддана
Найшчодрай ніве чэсць, дадому
Ідуць жанкі й з сабой — вядома ж!
Нясуць вянок са спарышоў —
Шчаслівых самых каласоў.

Надзенуць той вянок вясёла
Жанкі гаспадару на голаў
Са спевамі, і гаспадар —
Калі ён не з апошніх скнар —
У самым лепшым месцы хаты
За свой накрыты стол багаты
Пасадзіць жнеек, павіншуе
І ўсіх як трэба пачастуе.
Ідуць жанкі, ідуць дарогай,
Пускаюць голас свой дубровай.
Хай гулкі голас галасуе,
Хай свет увесь навокал чуе,
Як жнеі поле зваявалі,
Як мора жыта ўтаймавалі...
Ноч. А жанкі ўсё нам спяваюць —
Зямлі гісторыю гартаюць.
Ад працы ўгрэўся наш «Рамантык»
Хоць падстаўляй яго пад кран ты.
Але яму і на хвіліну
Мы з Лісам не даём спачыну:
Ці ж можна з песні, штораз новай,
Нам прапусціць адно хоць слова?
Бяжыць, віецца змейкай стужка —
За песняй песню «піша» служка.
Усё, як ёсць, магнітафон
Бярэ — і галасы, і фон.
Цяпер мы ведаем: у Лету
Не кануць песень самацветы.
Праз многа год, ужо без нас,
Вось гэту стужку — добры спадак! —
Кране ўключальнікам нашчадак,
І ажыве аджылы час.
З яго лясамі, галасамі,
З расой палёў, з яго слязамі,
З яго праклёнамі і смехам,
З бязглуздых войнаў горкім рэхам,
З трубой літой яго парадаў,
З яго і крыўдаю і праўдай!

*

Спіць вёска ў свеце. Тонуць хаты
У змроку — цьмяныя квадраты.
Заснуў і вецер пасля дня
Бадзяння. Зорак мільгатня.
Спяць людзі, спяць — нам жыць без спешкі
Падворкі іхнія і сцежкі.
Іх студні, лаўкі іх ля вясніц,
Бэз перад вокнамі і песні.
Адзін у ліпе салавей
Ніяк не ўспіць — яшчэ жвавей
Навокал сыпле на прысады
Свае высокія рулады.
Лавіць бы, слухаць іх да рана,
Як спраку веку, закаханым,
Ды толькі ў цені ліп густых
Мы не страчаем штосьці іх.
Нідзе не рыпне і гармонік —
Нядаўняй вёскі неўгамоннік.
Яго ад гэтых ліп, ад зорак
З сабою моладзь знесла ў горад.
Ну, што ж, ну, што ж, юнацтва крылы
Няслі і нас за небасхілы.
У небывалыя ясноты
Нам адчыняліся вароты.
Вось толькі там, у яснай далі,
Ці ўсё знайшлі мы, што шукалі?..
А дома, на сваёй зямлі,
На той, на той, дзе мы раслі,
Дзе ўсе пачаткі, ўсе крыніцы,
З якіх нам піць і не напіцца,
Дзе ў рэдкіх ценях хвой застылых
Дзядоў і прадзедаў магілы,
Як і жылі, жывуць па сёння
Ў заведзеным з вякоў законе,
Бацькі — зямлю штогод аруць,
Гной растрасаюць, сеюць, жнуць.
У роўным ланцугу бясконцым
Ратаяў, змалку дружных з сонцам,
Яны — адно звяно жывое,

Навек спаянае з зямлёю.
А мы? Што з дому нас звяло?
Куды ты, наша пакаленне?
Ад тога хлебаробаў племя
Мы — адарванае звяно.
Шуміць, гамоніць наша крона
Усё далей у вышыні.
Ды засталіся карані
У глыбіні зямлі замглёнай.
Не аслабела б толькі ніць
Між каранямі й кронай гэтай:
Бацькоў высокі свет, сагрэты
У сэрцах, чым нам замяніць?..
Тут ручаёк жывы гаворкі
Мы з Лісам — хай маўчаць падворкі —
На тое зводзім, што бліжэй,
Што, як-ніяк, нам даражэй:
На наша пісьменства, што свету
Вядома, на сяброў-паэтаў,
Што — праз паэму, верш, аповесць —
З зямлёю ўсё ж мацуюць повязь.
Як нас, пасляваенны вырай,
Дзяцей палёў з душою шчырай,
Што ў Мінск, бы птушкі ад шпакоўняў,
Зляцеліся ад хат, ад ёўняў,
Якісьці крытык незнарок —
Хоць, можа, быў ён і з сумленнем —
Філалагічным пакаленнем
Па блізарукасці парок.
Нас, на каго з гарматных жэрлаў
Глядзела смерць не раз,
Нас, нас,
Чыё маленства — светлы час —
Вайна ў жалезнай пашчы зжэрла.
«Канвой», «гестапа», «краты», «штых»,
«Блакада», «голад», «ачапленне» —
Не, гэтых клятых слоў значэнне
Пазналі мы зусім не з кніг.
Паласавалі свет ракеты...
Лес партызанскі, чараццё,
Канцлагеры з сірэн выццём

Былі ў нас за ўніверсітэты.
Ад куль, ад шомпалаў, ад мін
На целе мы рубцы ды шрамы
Ды раны ў сэрцах гэтаксама
З прасёлкаў ціхіх неслі ў Мінск.
Былі равеснікі малыя
Не ўсе між нас. Як многа іх
Пад жвір лягло ў кастрах людскіх —
Па іх і сёння сэрца ные...
Прынеслі ў горад мы з сабой
Найгоркі плач па блізкіх стратах,
Сум воч сірочых, слёзы матак,
Па растаптаных душах боль...
Не ціхне боль бяссонны гэты
У нас ні ў якую пару.
Жывы, ён зноў і зноў пяру
Дыктуе тэмы і сюжэты...
Ды часам меціць збіць убок
Нас крытык-праведнік вучоны,
Што зазубрыў усе каноны,
Усе законы назубок.
Той-сёй, бывае, на хвіліну
Паддасца нуднай траскатні
І даўняй злыбядзе — хлусні —
Ужо, глядзіць, нясе даніну.
А ёй, Хлусні, не многа корму
І трэба (хто тут знае норму?):
Там — дробязь нейкую, там — крошку,
Так назбіраецца патрошку
І зноў жыве сабе, круглее
Ды раздуваецца, шалее,
І не згадаеш, як, малая
Раней, хлусня ліхая тая
Перарасце — к таму вяду —
У найвялікшую бяду,
З якой — нікога не пагладзіць! —
Ужо не проста будзе зладзіць...
Спіць вёска. Спіць сабе, не чуе,
Што мы тут пра яе такуем.
Спіць, як дзіця, і мо не знае,
Што ў новым дні яе чакае...

— Ты кажаш, што яна адпела
Сваё, у песнях адзвінела?
І век цяпер свой дажывае,
Людзей карміцелька старая?
Мо раптам можна й без яе
Нам абысціся будзе скора?
Ну, а зямлю, што — возьме горад
У рукі ўладныя свае?
Яе размеціць, расплануе,
Абмерае, распаласуе
І ўчасткі згодна пастаноў
Да прадпрыемстваў і ўстаноў,
Як неабходную нагрузку
(Мець хочаш на стале закуску?),
Бестэрмінова прымацуе —
Каму каторы пашанцуе.
Той будзе выдзелены ўчастак
ТЭЦ-3?
А гэты — «Тэрмапласту»?
Той — Мінскпіўпрому? Той — БелАЗу?
Ці Белсаўпрофу? Галоўгазу?
Той — атэлье? А той — спортклубу?
Той — Дому мод? Той — Дому шлюбу?..
Далей уявім, днём вясновым
Начальству проста на галовы
Чарговы запыт громам з неба
Зляціць з палёў падшэфных: трэба
Людскія рукі для калгаса —
Сяўба ўжо там распачалася!

...— Ну, хто з вас на сельгасработу
Паехаць выкажа ахвоту?
Каго нам вызваліць ад спраў
На час? — загадчык установы
Адной даследча-навуковай
Свой персанал увесь сабраў
У кабінет і вось без шалу,
Бы нож, пытанне персаналу
Без агаворак выстаўляе.—
Дык што — ніхто з вас не жадае?

У кабінеце шэфа — ціша:
Замерлі ўсе, ніхто не дыша.
— Што ж, раз ахвотнікаў няма,
Тады, як селі, па парадку
І распачнём тут разнарадку —
Што валаводзіцца дарма!..
Пачнём з цябе мы спіс, Цярохін...
Што? Бюлетэнь?.. Тады — Панчохін!
І ты не можаш? Гаймарыт?
Не? Што ж тады? Радыкуліт?!.
Ну, а ў цябе што, Карпушкова?
— Ды я... Заўсёды я гатова,
Паехаць рада б я — чаму ж,
Але ў камандзіроўцы муж,
Дзіця ж са мной: хіба ў прыполе
Я павязу яго на поле?
— То мо паедзе Каспуровіч?
Дзіцё таксама? А Курловіч?
Яе хлапец даўно ж у школе —
Насіць не трэба мо ў прыполе?
Што-што? Не можа без бацькоў?
Баіцца ў хаце ён ваўкоў?
— А Кухаронак?
Кухаронак
Ад воч начальства ў застаронак
Улезла б, хоць віны яе
Няма: экзамены ж здае!
— Тады запісваю Зацірку!
— Заціркам зноў хацелі б дзірку
Заткнуць? Не ўдасца: во даведка —
Майго рэўматузоса сведка!
Чарга тут даць Лялькову слова,
Ды абмінае шэф Лялькова:
Таго ізноў уберагла —
Яго надзейны шчыт — кіла.
Ён пра яе даўно — ці ж дробязь? —
Разнёс усім, нібы пра доблесць...
Вядзе далей шэф наступленне,
Ды, як ні б'е ён на сумленне,
Ніхто свае для поля рукі
Адняць не хоча ад навукі.

— Дык, можа, мне самому ехаць? —
Шэф выцірае пот на плеху...
Усё ж знаходзіць навукоўцаў
Траіх — жанчыну і двух хлопцаў.
Жанчына — сталая, няўломак
І адарваць сябе ад дома
Сама дала начальству згоду:
Выкручвацца не ўмела зроду.
Ну, а хлапцы? Калісьці мамы
Сваіх дзяцей (найлепшых самых!),
Займеўшы там дзе трэба «руку»,
Сілком упхнулі у навуку.
Ды тыя ў ёй — ні бэ ні мя:
Чаго няма, таго няма!
Пра гэткіх людзі не без смеху
Гавораць так: што ўбіў, што ўехаў
Ці: ні ў салдаты, ні ў матросы,
А толькі загваздка ў калёсы.
Але жывуць, не знаюць мукі —
Прыгрэліся каля навукі.
Навука ж церпіць, бач, такіх —
Ці мо патрэбу мае ў іх?
Ну, хоць бы імі ад калгаса
Як-небудзь адчапіцца часам?
Як кажуць часта: на, нябожа,
Табе, што нам самім не гожа!

Якой жа можна ў полі працы
Ад пасланцоў тых дачакацца?
Мо будуць надта шчыраваць?
Душу калгасу аддаваць?
Як трэба агарод засеюць?
Зямлю дагледзяць, абнадзеюць?..

Так, не стаіць наш час нязменна —
Нясецца ўперад вокамгненна!
Перарабляецца нанова
Зямля людзей.
Век перуновы!
Ужо — глядзі — ракетнай сталлю
Мы неба зорнага дасталі...

Ды толькі вось пад гром авацый
Ці ж ад зямлі нам адрывацца?
Зямля — ці ж толькі касмадром?
Калыска родная, наш дом,
Асноў аснова, поле, паша,
Радзіма ўсім нам, маці наша,
І на яе глядзець звысоку?
Палеткі абрабляць з наскоку?
Не, не гасцей тых мімалётных
Зямля чакае ў дзень самотны.
Не прыхадзень, не птах зпаднебны —
Ёй гаспадар, зямлі, патрэбны.
Па ім, па ім зямля сумуе,
Яго, яго штодня пільнуе,
Яго з туманаў выглядае —
Нібы нявеста маладая
Свайго найлюбага з далёкай
Дарогі, доўгай і нялёгкай.
Ён, толькі ён адзін здалее
К ёй падабраць усе ключы.
Яе так будзе берагчы!
Яе атуліць, абагрэе,
Душу ўсю ёй аддасць і сэрца,
І ажыве, устрапянецца
Зямля. І скарбы ўсе, якія
Хавала, з радасцю раскрые...

Спіць вёска. А над ёй, над вёскай,
Ужо ружовая палоска,
Гляджу, ледзь бачная, нясмела
На небакраі заяснела.
І пакрысе ўстаюць з цямноты
Кляны за вуліцай, вароты,
Бэз ля акон, трава ў расе...
Што ж, што ён, новы дзень, нясе?

**VI**

Ізноў па вулачцы пясчанай
Пыляць дзве пары ног аддана.
Мы песень новыя слаі
Ўздымаць — хто скарб жывы стаіў? —

Шыбуем паўз платы і брамкі,
Ад клямкі і да новай клямкі:
Мо нам адкрыюцца глыбіні
Жыцця у просценькай хаціне?..
Ды тут на паўдарозе нас
Аўтобус заспяе якраз.
Ён, крута пылам нас абдаўшы,
Спыняецца. Ды гэта ж нашы!
Унь ціснуць важна з дзверцаў вузкіх
Фядосік, Грынблат, Малаш, Гурскі...
А з імі й Цішчанка шумлівы
Прастуе ўзбуджаны, шчаслівы:
Ён быў у горадзе заграз —
Здаваў чарговы том якраз
Фальклору нашага да друку,
Цяпер дагнаў нас, цягне руку.
Вітаемся, сустрэчы рады.
Так сярод вуліцы нарада
Ўзнікае імправізавана:
Увесь жа сектар тут сабраны!
— Дык як ідзе ў нас песнязбор?
І ці багаты тут фальклор?..
Спярша расказвае Фядосік
Пра свой узятак: удалося
Яму адкрыць — хоць цісні ў звязак!
Сапраўдныя паклады казак
На хутарку. Там пад клянамі,
Пад хмаркамі, пад перунамі,
На сонечнай палянцы-грудзе,
Між кветак, у пчаліным гудзе,
Пры маладым беразняку,
У звонкім, хоць старым, дамку
Знайшоў дзядулю ён сівога,
Вясёлага ды гаваркога,
Што ў памяці ўхаваў ад даўніх
Гадоў зямлі сваёй паданні.
Вядома ж, не губляў тут час
І Грынблат — найстарэйшы з нас:
Легенды, прыказкі, замовы,
Загадкі, песні, проста словы —
Па вёсцы гроб ён усё чыста.

У мех шырокі фалькларыста.
А Гурскі больш шукаў па сховах
Хоць што з калядак ды шчадровак:
Ён разрабляў сваю дзялянку
Ў навуцы, і цяпер ад ганку
Да ганку — ўсё ёсць паміж люду! —
Цягаў магнітафон-няўклюду.
Дарма і Малаш не хадзіла
Сялом: натрапіла на жылу
Вясельных песень; бабкі іх
Па памяці з гадоў былых,
Нібы па нітачцы якой,
Адну цягнулі за адной.
І Скідан быў таксама рады:
Знайшоў у вёсцы ён балады...
— Што ж, неблагі мы плён сабралі.
Цяпер у новыя мо далі
Пусціцца нам?
Ды Грынблат слова
Бярэ хутчэй:
— Ёсць прапанова
Яшчэ нам на дзянёк астацца,
Для кожнага тут будзе праца:
Сягоння цэлаю капэлай
Нас запрашаюць на вяселле!

Ці ж на такую прапанову
Даць можа фалькларыст адмову?

*

Каля вясельнай хаты — вір:
Сустрэчу маладых пабачыць
Сышлася вёска ўся, няйначай —
Ля весніц топча гравер-жвір.
Ды штосьці ўжо занадта доўга
Не чуць дружыны маладога.
Унь маці тупае: не тоіць
Сваёй трывогі-неспакою.
У двор раз-пораз выглядае
З-пад вэлюма і маладая.

Мо перадумаў малады?
Мо не прыедзе ўжо сюды?
Бывала ж так: жаніх другую
Знаходзіў раптам маладую...
Але дарэмныя трывогі:
Матораў гул плыве з дарогі!
І вёскай — трэба ўсім жа ведаць —
Ляцяць малыя:
— Едуць, едуць!
Ад хат, гародчыкаў сваіх —
Не прапусціць бы важны міг! —
З усіх бакоў на крыкі тыя
Бягуць і дзеці, і старыя...
І вось па вуліцы, што ў рух
Прыйшла ўся, урачысты цуг
Машын імчыцца — аб бакі іх
Шары пашлёгваюць тугія
Ды ўюцца побач — клопат дружак —
Вясёлкі радасныя стужак.
Ужо к нявесціным варотам
Вяселле блізіцца. Ды што там?
Дзяўчаты, хлопцы — што за мода! —
Дарогу нейкаю калодай
Перагароджваюць са смехам,
За ёю строячыся спехам!
Што ж зробіш тут: перад заслонам
Машын спыняецца калона.
І ўжо ад першай, зухаваты,
Шыбуе важна сват вусаты.
Усе тут знаюць яго мэту:
Яму б зняць перашкоду гэту!
І перад сватам, гаманкая,
Яшчэ шчыльней — сцяна людская.
Ды той пужаецца не надта:
Ачысціць шлях ёсць сродкі ў свата!
Пускаць жа ў ход іх не спяшае —
Язык пацешыць свой спярша ён!
— Што тут за шум? Што за праява?
Дарогу даць нам — жыва-брава!..
Ды голас свата ваяўнічы
У дружных крыках тоне зычных:

— Вас знаць не знаем! Хто такія?
— Мо то разбойнікі якія?
— Не, не прапусцім — хоць чалом бі!
— Назад вярні свае аглоблі!..
Ад шуму-гаму, што аж глушыць,
Сват затыкае шчыльна вушы.
І да баярак і хлапцоў:
— Мы — людзі добрыя, з купцоў!
Да вас з двароў-харомаў ясных
Купляць тавар мы едзем красны!..
Ад напамінку аб тавары
У маладзіц яснеюць твары:
— Не трацьце лепей час свой марна:
Не па кішэні вам тавар наш!..
За словам слова — каля свата
Торг разгараецца заўзята.
Ды ўрэшце сціхае той гул
З жывою вадкасцю баул,
Што сват прыносіць пераможна:
Усё цяпер дружыне можна!
Сустрэчы міг!
З сваёй дружынай
У двор вясельны ад машыны
Сам малады кіруе, горды,
І дружнай музыкі акорды
Яму насустрач урачыста
Ляцяць з-пад пальцаў баяністаў.
Пяюць, пяюць, пяюць баяны —
Вяселля покліч найжаданы.
І ў двор шырокі пад іх голас
Плыве рака гасцей вясёла.
Там, як спрадвеку, маладога
Ужо страчаюць ля парога.
— Выйдзі, мамачка, на ганачак —
Паглядзі,
Ці харошага табе зяця прывязлі...
Струн чуйных сэрца ўладары,
Ваўсю стараюцца музыкі,
І гімнаў радасныя зыкі
Ужо не месяцца ў двары.
І галасісцей, і гусцей

Ільюцца — хораша, суладна.
І так выказваюць дакладна
Усё, што на душы ў гасцей!
...— Вітайся, братачка, вітайся,
Пра здароўечка пытайся:
Ці так здарова, як зямля,
Ці так дужа, як вада...

*

Ад галасоў — такое свята! —
Гудзе, як вулей ройны, хата.
А гэтым гудам, люду рад,
Як маг, кіруе хвацка сват.
Апаясаны ручнікамі,
Устаў, паводзячы вусамі;
З хітрынкай слухае хвіліну
Людской гамонкі мешаніну
І — ўлады знак — кій з булавою
Ускідвае ўраз над галавою:
— Прашу увагі — злева, справа!
Наліць кілішкі — жыва-брава!..
І нейкі міг адзін чуцён
Навокал шкла найтонкі звон:
Прыходзіць час іскрыстых тостаў,
Што ўсе ідуць ад сэрца проста!..

У гамане, у чарак звоне,
У шчырых позіркаў палоне —
Яны, шчаслівыя такія,
Выбранцы долі — Маладыя.
Іх зорны час! Для іх — цудоўны
Дзень гэты, ўсмешак цёплых поўны.
Для іх — душ блізкіх парыванні,
Усе і песні, і вітанні,
Для іх, для іх, для іх, буяны,
Грымяць і бубны і баяны,
Што да нябёс узносяць сёння
Іх, Маладых, на шчасця троне:
Хай шчодрасць сэрцаў у дарогу
Сваю ад светлага парогу

Нясуць з сабой праз золь, туман,
Як лепшы дар, як талісман.
Яны ж — пачатак новых дзеяў,
Жыцця зара, зямлі надзея...

Пакуль з вінам слоў рэчка льецца,
Сват паслабляе трохі лейцы.
І шум суняты — паступова
Тут наплывае хваляй новай...

Сярод людзей, іх воч іскрыстых
І мы ў застоллі, фалькларысты.
Жарт, песня, прымаўка, выслоўе —
Усё, усё мы прагна ловім,
Усё ўбіраем мы душою,
Зачараваныя красою
Вячыстай мовы нашай роднай,
Напеўнай, шчырай і лагоднай...

Каб не ўпусціць чаго выпадкам,
На лаве ўключваем мы ўкрадкам,
З дазволу, свой магнітафон —
Ці ж можа тут прастойваць ён?
Няхай вясельную гамонку
Усю бярэ жыўцом на плёнку!
Ды Грынблат, фалькларыст стары,
На хітрай тэхнікі дары
Не любіць надта пакладацца:
Цішком — ці ж трэба выстаўляцца? —
Маленькі свой блакнот-паўмерак
Ушчэмлівае між талерак
І неўпрыкметку ўжо алоўкам
Нясе туды за слоўкам слоўка.
Ў сваю стыхію трапіў тут
І Цішчанка: вяселля гуд
Яго настроіў з Жыва-Бравам
(Празвалі свата так яскрава)
Ўступіць — хто на язык больш востры? —
У слоўнае адзінаборства.
І вось скрыжоўваюцца шпагі!
Смех, воплескі! Але на вагі

Тут не кладуць чыюсьці вартасць:
Любым вяселле рада жартам...

Як макаў цвет — і ад чаго б так? —
Заружавелі шчокі ў цётак.
Больш не сядзіцца маладзіцам —
Хіба ж у жылах іх вадзіца?
— Мае ножкі шчыкочуць —
Пагуляннейка хочуць...
Той спеў хлапец з віхром агняным
Уміг падхватвае баянам,
На хату йдзе, такі рыжман,
І у руках жывой вужакай
Віецца, бліскаючы лакам,
Збудзіўшы гукі ўсе, баян.
І быццам вецер — рукі ў бокі —
Ляцяць жанкі з застолля ў скокі:
— Дайце круг, дайце круг,
Дайце толькі топнуць!
Ці ж у хаце ў Міхаліны
Падваліны лопнуць?
І ўжо — ці бачыў гэта браце? —
Мяце мяцеліца па хаце!
— А Лявоніху Лявон палюбіў —
Лявонісе чаравічкі купіў...
На хату сваццця вылятае —
Нагамі петлі выплятае:
— А Лявоніха — душа ласкавая —
Чаравічкамі палясківае...
У скокі йдуць малы й стары,
І табурэткі, і сталы.
Ірвецца бабка ў круг сівая —
А гаварыла ж, што слабая!
Мажная цётка на скаку
Хлапца хапае пад руку:
— Дзевяратка мой мілюсенькі,
Вядзі мяне памалюсеньку.
Не вядзі мяне па межачцы,
А вядзі мяне па сцежачцы.
Па межачцы мае ножкі не ідуць,
А па сцежачцы яны самі бягуць...

Тачыў даўно й прыданку верад —
Унь прабіваецца наперад.
Дарогу торыць лакаткамі,
Сячэ чачотку чабаткамі:
— Шэры боб, шэры боб,
Тры гарошынкі.
А хто мяне пацалуе —
Той харошанькі!
А баяніст па хаце ходзіць —
Ва ўсе бакі мяхамі водзіць!
Вакол жа —
Вось дык заваруха! —
Вірыць жывая завіруха.
Мо хто прыйшоў сюды з хмурынай —
Яе развейвае ў хвіліну!
Усё, усё цяпер забыта,
Чым галава была забіта.
Вяселле шал! Скачы, скачы!
Не скачуць толькі тут сычы!
І хто асудзіць, хто аблае?
Усё набок — душа гуляе!..

*

Аб шорсткі жвір шаргочуць шыны:
Праз каласоў жытнёвых строй
Жывы, праз сонцавы настой
Тарфянікаў, праз грай шпачыны
Бяжыць аўтобус наш. За ім,
За пылу полагам сівым,
Сяло вачмі акон на нас
Глядзіць услед апошні раз.
Хоць пабылі тут мы ўсё ж мала,
Ды, як сваё, сяло нам стала.
І мы вязём адсюль з сабою
Яго турботы ўсе і болі,
Ды галасы, воч цеплыню,
Адкрытых сэрцаў дабрыню...
Шаргочуць шыны. Нейкі час
Маўчым мы — што чакае нас
У новых далях? Толькі знаем

Адно мы: там, за небакраем,
У вёсках, у камбайнаў гудзе,
Жывуць — таксама ж нашы — людзі.
З зямлёй, з святлом дуброў і рэк
Яны заручаны навек.
У словы іх, дзяцей узлескаў,
Гаёў, дзядоўскіх жаўтапескаў,
Услухайцеся без прынукі:
Чуваць у іх — стагоддзяў згукі,
Сны навальніц, гул крыгаходаў,
Кліч жніўня, горны сонцаўсходаў,
Спеў зім, палёў вячорны звон,
Вятроў кастрычніцкіх разгон...
Там кожны дзядзька, дзед, любая
Бабулька — гэта сказы краю,
Яго агні, дарогі, вёсны,
Жыцця шматзвонны гімн узнёслы...

Бяжыць аўтобус наш. Насустрач —
Слупы, аблокі, плёсаў люстры...
За той смугой — зноў хаты, хаты,
І ў кожнай хаце — скарб багаты.
Там недзе ў хатах песня спіць:
Нам трэба песню ў лёт пусціць.
1977—1980

## ДЗЕ ДУБ З БЯРОЗАЙ ЗВІЎСЯ

### I

Яго падняў прамень, што скрозь самкнёных
Бяроз ды грабаў паднавес зялёны
Прашыўся, сонца ранняга пасол,
І ў гушчыні травы, што ўкрыла дол,
Шчаку салдата адшукаў знянацку.
Салдат, што спаў зусім не па-юнацку,
Аж сцяўся ўвесь ад дотыку таго:
Хто ж мог і тут дапільнаваць яго?
Калі ж уцяміў, хто, на ўгрэтым голаў
Зноў прымасціў, ды спаць не даў больш холад,
Які ўсяго праняў за ноч. Салдат,
Што ўжо зубамі малаціў не ў лад,
На ногі ўстаў, ад холаду плячамі
Павёў — худы, з упалымі вачамі,
З забінтаванай леваю рукой,
У рванай гімнасцёрцы, на якой
Свяцілі куль аўтографы, цямнелі
Сляды жывыя вогненнай мяцелі.

Ён не марудзіў тут: зноў клікаў шлях.

Па сонцы шлях ён вызначаў, па пнях.
Ішоў лясамі ціхімі, балотам,
Мясіў дрыгву густую цяжкім ботам.
Ішоў, ішоў. Без сцежак, нацянькі,
Мінаючы жытло — што звер які...
Між дрэў бы пасвятлела. Азярко?
Ці неба схон? Туману малако
Бялелася ў лагчыне за лістотай.
Ён адхінуў лазовы куст употай:
Згінаючыся ўперадзе дугой,
Цягнуўся луг палосаю даўгой
Між лесу векавога, што так гожа
Стаяў паўзбоч жывою агароджай.
Ды гэта ж Шыі! Як жа не пазнаць
Было іх — вёскі роднай сенажаць?
Сюды ж не раз і ён з касой прыходзіў —
Да цёмначы званіў тут, на выгодзе...

Луг быў яшчэ ў цяні, хоць сонца лес
На тым баку ўжо асвяціла спрэс
(Здавалася, пагрэўся б там). Ад лесу
Да ног салдата — у расе бялесай,
У цішыні — ішоў сцяной густой
Не крануты касою травастой.
Тут, на грудку, бліжэй да хвой смалловых
Быў дол увесь у купінках сіўцовых,
На выгляд — мяккіх, ды касіць сівец
Зусім не ўсякі возьмецца касец:
Каса — паўзверх, паўзверх — ад купін коўзкіх
Так і адскокваць будзе, што ад косткі.
Яго ўзяць можна хіба што з расой,
Як брытва, адкляпанаю касой.
Крыху ніжэй, дзе трохі больш вільготна,
Сваё ўжо месца уступаў ахвотна
Сухі сівец асочцы лугавой,
Яшчэ не пацвярдзелай, сакаўной.
З травінкамі шаўковымі асочкі
Мяшаліся маркоўнік, хвошч, званочкі,
Там-сям свяціў злыселы дзьмухавец,
Рыжэлі метлюкі, жаўцеў званец
Каробачкамі-кветкамі, бялелі
Галоўкі дзятлавіны, што здалелі
Прабіцца з той гушчэчы... Эх, касу б
Цяпер сюды, у гэтую красу!
Ён да травы б яе прыклаў спачатку,
Прымерыўся б, націснуўшы на пятку,
Адвёў бы ўбок — ці ж гэта ўпершыню? —
І ў росную пусціў бы гушчыню.
Мурог-мяшанец, сцяты вострым жалам,
Так і лажыўся б тут пракосам-валам...

Але салдат, хоць не адразу й змог,
Ступіць тут мусіў ботам на мурог
І вось па ім — ці ўзнімецца? — сцяжыну
Павёў — ну й варвар! — праз усю лагчыну:
Дайсці, дайсці — адно яго вяло
Жаданне ўперад, іншых не было.

Цяпер з закрытымі вачамі нават

Ісці ён мог бы: кожная канава,
Сцяжынка кожная, паплоўчык, груд
З малых гадоў былі знаёмы тут.
Вунь белы мох між хвой, што паасобку
Стаяць, чырванастволыя, на ўзлобку.
У гэтым мху пад восень, па дажджах,
Растуць баравікі што на дражджах.
Як добра пахадзіць парой грыбною
Было цямком тут з лубкаю-сяўнёю!
Аж сэрца ёкала ў яго, калі
Ён неруш дзе знаходзіў пры камлі...
А во кусты арэшніку, ля дуба —
Да іх было калісьці гэтак люба
Сцяжынкай затравелай забрысці
Ды лузанцоў намацаць у лісці.
Хоць заглушыў кусты бярэзнік гонкі,
Там спелі і цяпер арэхаў гронкі...
Во роў, зарослы лазняком, ставок.
За ім — палянка... Гэта ж ён, Станок.
Дзе здаўна ў тым унь астраўку альховым
На стан дуброўцы ставілі каровы...
Што ж трэснула цяпер там? То ж ізноў
Былі яны! Сюды ад аваднёў
Зашыліся. Як колісь... Колісь? Дзіва:
Мо з месяц і прайшло ад той жахлівай
Мяжы, што раптам аддзяліла ўсіх
Ад мірных дзён, ад клопатаў былых,
А ўсё, што ні было перад вайною,
Здавалася такою .даўніною!..

Ля хмызняку пастух хадзіў і — так,
Без дай прычыны — пугай наўскасяк
Па лісцях сцёбаў. Да яго ўцвярдзелай
Палянкай-ялавінай, што рыжэла
Ад метлюкоў, папраставаў салдат,
Сустрэчы блізкае з вяскоўцам рад.
Ужо гукнуў яму, не вельмі й ціха,
Ды той не абярнуўся. Што за ліха?
І тут пазнаў салдат: то ж быў Сымон!
Равеснік і сусед амаль што. Ён
Калісь малым, упаўшы з печы, гоцнуў

Спіною аб падлогу, ды так моцна,
Што, небарака, добра з дня таго
Недачуваў. Калі салдат яго
Даклікаўся, вяскоўца не адразу
Пазнаў Сымон: — Алесь?!
З яго расказу
Алесь — так звацьму ўжо салдата й я —
Дазнаўся: ціха ў вёсцы, і сям'я
Ягоная і жыва і здарова...

Ён лес мінуў, і вот ужо Дуброва
Адкрылася пагляду — стрэхі хат
Шарэлі ў буйнай зелені прысад.
Вунь і яго сядзіба — дзве старыя
Каля палосы ліпы межавыя
(У спёку там, на халадку травы,
Такі цянёк-прытулак для дзятвы).
Самой жа хаты ён пакуль не ўгледзеў:
За вуліцай яна стаяла недзе...
Калі ўжо ён ступіў на свой загон,
Што бульбаю кусціўся, калі ён,
Не верачы ўсё, сон гэта ці ява,
Ішоў разорай-сцежкай халаднавай,
Што сам жа плугам выструніў вясной —
Так, так, яшчэ тады, перад вайной,—
Ад вуліцы па бульбе, па капуснай
Градзе маланкаю ляцеў насустрач,
Раз-пораз падаючы неўзнарок,
Хлапчук у зрэбных портачках.
— Сынок!..
Як бег, так к бацьку й кінуўся, нялоўка
У грудзі торкнуўшыся галоўкай.
— ...Пятруська!

Сына тулячы рукой,
Ішоў Алесь да хаты, ля якой
Ганулля тупала (здалёк убачыў):
Аб ім яна не ведала, няйначай.
І толькі як варотцы адшчапіў,
Як — з сынам на плячы — у двор ступіў,
Угледзела Алеся нечакана.

Аж войкнула ад неспадзеўкі Ганна,
Збан выпусціўшы з рук... Расказу ніць
Я перарву на момант, бо ўявіць
Тут можна й так, якое шчасце стрэцца
Пасля нягод разлучаным двум сэрцам,
А бацьку дома зноў абняць сваіх
Дзяцей малых — было ж чацвёра іх.
Рукам яго былі прывычны толькі
З малых гадоў каса ды плуга тронкі,
Сявенька-лубка, вілы, цупкі цэп...
Ён зноў адно: рабіць у свеце хлеб.
Ды іншая яго чакала доля...

Ужо ступаў той завірушны час,
Калі зямлі ўсёй ліха з нор на волю
Патайна выпаўзала на папас.
І на людзей, на белы дзень, на мары,
На гарады, гады, на цішыню,
Рвучы нябёсаў сінь, ляцеў з-пад хмары
Шалёны шквал металу і агню.
Хто выпусціў вайны ліхога д'ябла?
За грэх які ўсхадзіўся ліхадзей?
А мо гэта расплата за нядбаласць,
За легкавер'е, слепату людзей?
Далі сябе прыспаць уладакрадам
(О як грымелі ў свеце іх званы!),
Галовы затлумілі іхнім чадам,
У павуцінне трапілі маны.
І вось на чарапы — жалеза касак:
Раўняйся!
Па калонах!
Марш, марш, марш!
І людзі ўжо — не людзі. Проста маса —
О колькі зведала зямля тых мас!
І гэту масу — крок які чаканны! —
Па нівах ціхіх — хто раскрые рот? —
Вар'ят са свастыкай пад барабаны
Пакіраваў на ўсход, на ўсход, на ўсход!
Вайны пажар! І хлебароб адкінуў
Убок свой плуг. Узяў замест яго
У рукі зброю — бараніць краіну

Ад злыбяды. Агнём гасіць агонь...

Алесь прызваны быў тады, як хмары
Згушчаліся шчэ толькі над абшарам.
Хадзіў ён на «Заходнюю» — братам
Руку падмогі працягнуць: каб там
Узнесці сцяг, чырвоны... З Беларусі
Пасля на поўнач ён падацца мусіў —
На фінскую, бязглузднейшую... Шмат
Дарог ён змераў вогненных, салдат.
Не ўспеў ён адысці душою дома
Ад паху дыму і крыві, ад грому
Гармат, не ўспеў надыхацца як след
Паветрам гоняў родных, як зноў свет
Скрозь зашугаў пажарамі...

Зноў:
— Рота!
Не адставаць! Жвавей, жвавей, пяхота!
У свеце ўзроеным пад небасхіл
Каціўся шляхам ботаў стук ды пыл,
Што даль заслаў. У пыле тым сівым
Былі ў салдат падсумкі, гімнасцёркі —
Блішчалі толькі на пілотках зоркі
Ва ўсіх агнём рубінавым сваім.
З-пад выцвілых — таксама ў пыле — броваў
Глядзелі вочы ўдалячынь сурова:
Ад грукату, што далятаў здаля,
Нібы жывая, ўздрыгвала зямля.

— Жвавей, жвавей!
Хаця сышлі ўсе потам,
Прывалу не даваў байцам камроты:
Заняць жа абарону — быў загад —
І каб адтуль ні кроку ўжо назад...
Ды раптам там — на новым рубяжы тым,
Ля пералеску рэдкага, за жытам —
Чужая зброя бліснула, і ўміг
Па стомленых байцах, па зорках іх
Град паласнуў свінцовы...

Быў няроўны —
У чыстым полі — гэты бой раптоўны:
На грай агню — нямоўчная сцяна! —
Былі вінтовачкі — на двух адна,
Яшчэ граната мо ў каго — на ўдачу,
Кінжала сталь ды злосць хіба ў прыдачу.
Але здавацца ўсё ж ніхто з салдат
Не думаў тут.
— За мной! — На куляў град
Рвануліся байцы...
Яшчэ ніколі
Не ведала жніва такога поле:
Не каласы — галовы навакол,
Падкошаныя, падалі на дол
Ад куль варожых тых... На рэштку роты,
Што там была залегла, танкі потым
Палезлі раптам...

Што далей было,
Алесь не знаў: як мячык, узняло
І Выбуховай хваляй нечакана
Закінула ў бяспамяць...

Калі ранак
Ступіў сюды назаўтра — з халадком
Расы жывой, з адвечным жаўруком —
Алесь ачнуўся. Ад зямлі, якою
Ён быў закіданы — чыёй рукою? —
Атросся, вочы ад пяску працёр
І, калі глянуў навакол, абмёр:
Нібы снапы, ляжалі скрозь па полі
Байцы-сябры, якім не ўзняцца болей...
Алесь, з магілы выбраўшыся той,
Кантужаны, з параненай рукой,
Куды ісці, не ведаў. Да якойсьці
Дадыбаў вёскі. Толькі што за госці
Хадзілі там? Здалёк пазнаў ён іх,
Гасцей няпрошаных, чужынцаў тых,
Што чуліся ўжо тут гаспадарамі...
Што ж аднаму рабіць было? Ярамі
Падаўся прэч. Ды колькі ні блукаў,

Ён анідзе сваіх не адшукаў...
Цяпер была ў яго адна дарога:
Дабрыць як-небудзь да свайго парога...

*

І сёння — праз гадоў заслону — ён,
Той Дзень, зіхціць мне зоркаю між дзён.
Вярнуўся гэта! Гэтакага свята
Ужо даўно ў нас не бывала. Та-та!..
Як абляпілі мы яго ўсе ўраз!
Як гладзіў ён рукой здаровай нас!
А як свяцілася, як ззяла маці,
Разгубленая нейкая, па хаце
Мітусячыся, снуючы — туд-сюд.
Стол накрывала, несла ў красны кут
Кілішкі-шклянкі, з шафы даставала
Вясёлкі-ручнікі, што прыхавала...
Але назаўтра бацька раптам злёг —
Гарэў, штораз кідаўся на ложку,
Крычаў у сне аб нечым, нават трошку
Тут сцішыцца, у цішыні, не мог.
І маці знемаглася ўся: нязменна
Пры ім сядзела — днямі і ўначы.
Ішлі вяскоўцы — як тут памагчы?
І слова сэрцы рвала нам — «гангрэна».
Зноў зацягнула неба нашых мар,
Зноў ноч бяззора глянула ў аконцы.
І ўсё ж праз колькі дзён, даўгіх, бясконцых,
Надзеі промень бліснуў нам між хмар:
Да памяці вярнуўся бацька, ціха
Загаварыў, аслаблены, да нас,
Ды хоць устаў ён, яшчэ доўгі час
Яго не адпускала тое ліха.,.

*

— Скажы, суседзе, як далей тут быць,
У тыле, мне, салдату? Што рабіць? —
Пытаўся бацька ў Юзіка крывога,
Што ведаў, пэўна ж, як і сам, нямнога.
— А што ты зробіш? Ды яшчэ з такой

Усохлаю, як той карчук, рукой?
Хоць бы й прасіў, цябе на фронт, вядома ж,
Ніхто б не ўзяў: сядзі й не знайся дома...
Дый дзе той фронт цяперака? Чутно,
Ён за Смаленскам недзе ўжо даўно...
Але няхай агнёвым гэтым валам
Далёка пакацілася навала,
Ёй будзе ўсё-такі канец, павер —
Як кажуць, не цяпер, дык у чацвер!
І рыхтаваць яго мы ўсе павінны.
Як? Час пакажа! Ты не чуў навіны?
На немца ўжо — хай знае ягамосць! —
У лесе, кажуць, партызаны ёсць!
Што ж нам цяпер, пытаешся ты, дзеяць?
Пакуль адно: араць зямельку, сеяць!
Калі пасеем, пэўна ж, і сажнём.
Раз будзем жыць, то й нечысць мы зжывём!

## II

Нямое поле, лес непадалёку
З сябе здымалі ўжо заслону змроку.
Над цішынёй — спяшай жа, дзень, у лёт!
Увесь у золаце, гарэў усход.
За плугам макраватай баразною,
Што пахла гэтак хораша зямлёю,
Ішоў Алесь. Кабылка галавой
Махала звычна ў такт хадзе цяжкой,
Пафыркваючы зрэдчас — ад аблогі
Адслойваў плуг палоску. Да дарогі
І зноў назад, пад лес — за кругам круг
Рабіў тут, на зямлі, нястомны плуг.
І з кожным кругам, з плуга паваротам
Усё шырэй была раллі чарнота.
Алесь спыняўся, з любасцю глядзеў
На свой, у свежых скібінах, надзел.
Сюды, ледзь ранак гляне сінізною,
Ён заўтра прыйдзе, рупны, з бараною.
Скакаць-круціцца будзе тут яна
Па гэтых скібах-грудах, барана.
Іх разаб'е зуб'ём, расшкуматае —

І поле стане, што пярына тая.
Тады зраўнянай пухкаю раллёй
Ужо ён ступіць, хлебароб, з сяўнёй.
У пух пададны той — за жменяй жменя
Раўнютка будзе класціся насенне.
Пасля — хай сняцца залатыя сны —
Яго загорне зуб'е бараны.
Ды толькі спаць тут не дадуць зярнятам
Праменні сонца ды грамоў раскаты...

Араў Алесь. У прозалаці дня
Пабліскваў плуг. Такая цішыня!
А мо ўжо сціхла і ў вялікім свеце?
Мо ўжо во з гэтай сонечнай зямлі,
Адумаўшыся, людзі ўшчэнт змялі
Усіх вар'ятаў з бомбамі, як смецце?
І можна будзе смела людзям жыць,
Зямлю араць, страчаць зару, любіць?..

Ды думкі тыя, хлебароба мроі
У міг адзін крыж-накрыж перакроіў
Са свастыкаю чорнай самалёт:
Ён кіраваў туды, туды — на ўсход...

Алесь, глыбей пусціўшы плуг у глебу,
Суняў кабылку.
Скамянела ў неба
Глядзеў.
Сачыў, як меншыўся штоміг
Ён, самалёт, між воблачкаў нямых.
Пасля растаў зусім за хмаркай белай.
А ён, Алесь, усё стаяў здранцвела...
Ды толькі што рабіць яму было?
Ізноў за плуг узяўся. Хоць пякло
Ўжо ў плечы сонца, дааракць палосу
Усё ж хацеў. Ізноў ступаў ён, босы,
Па халадку разоры. Роўна плуг
У глебе шаргацеў, слухмяны друг.
Часамі ён то чыркаў дзе аб камень,
То купіну чапляў — Алесь рукамі
Яе, спыняючыся, адкідаў

Ды плуг ізноў у глебу запускаў.

Але араў ён сёння без ахвоты:
Рой думак неспакойных ад работы
Яго адводзіў, рукі паслабляў —
Рабіць так, як патрэбна, не даваў.
Нарэшце круг апошні. Бы чаўнок,
Плуг выслізнуў з зямлі. Яго на бок
Алесь паклаў, Паслабіў трохі лейцы,
І за кабылкай весялей улегцы
Плуг паскакаў па грудах. Ля раўка
Да пырніку — зялёнага чубка —
Падбегшы нават трошачкі, прыпала
Аюта (так сям'я кабылку звала).
Алесь, таксама ўтомлены, прылёг
На ялавіну, на зязюльчын мох.
Над галавой у небе, чыстым, ясным,
Кружыў — маленькай кропачкаю — ястраб.
Ляталі стайкамі — то там, то тут —
Шпакі, штоміг мяняючы маршрут.
Збіраліся ў адлёт... Усё як трэба
Пад гэтым вечным, пад блакітным небам...
Так, добра тут, у гэтым во кутку...
Ды як жа жыць ад свету у баку
У час, калі чужак усю краіну
Пайшоў таптаць, ёй ладзіць дамавіну?
Мо перабыць пад немцам час, як мыш
Пад венікам, стаіўшыся — не чмыш?
Чакаць, пакуль — а ліха ходзіць хутка!
Цябе не выцяглі з таго закутка
І, штых прыставіўшы да лба твайго,
Не папыталіся:
— Ты за каго?
Ану хутчэй паказвай, чым ты дышаш?
Каго чакаеш тут, у гэтай цішы?
Ні за каго ты?
Як так можа быць,
Калі ўвесь свет, нібы ў катле, кіпіць?..
Не, аднаму тут нельга ратавацца!
Дый як жа можна ў халадку хавацца?
А што, калі ўсе ў норы ўлезуць так?

Змагацца трэба! Але толькі як?
І вось рашылася. Калі дадому
Вяртаўся ён па зімніку глухому,
Што ўвесь карэнні хмызу аплялі,
Перад калёсамі, бы з-пад зямлі,
Раптоўна вырас чалавек. Аюта
Убок рванулася ў спалоху крута.
Ды тут жа стала: незнаёмец той
Трымаў намёртва ўчэпістай рукой
Яе ўжо за аброць. Вачэй бялкамі
Вадзіла толькі. Ды жывот рыўкамі
Хадзіў задыхана. Алесь з калёс
Саскочыў: і каго тут чорт прынёс?
Сустрэчны быў хаця і нізкаваты,
Ды ладна збіты, моцны, жылаваты.
Немітуслівы, ўпэўнены пагляд.
З пляча звісаў нямецкі аўтамат.

Не ўспеў Алесь сказаць што, як з-пад куста
Яшчэ адзін устаў яму насустрач.
У гімнасцёрцы, праз плячо — рамень.
З фуражкі бліснуў зорачкі прамень!
Мажны, сутулы, з круглым тварам поўным.
Чакай, чакай! Дык гэта ж, мусіць...
— Доўнар?!
Так, гэта праўда Доўнар быў, нядаўні
(Год з пяць прайшло?) дуброўскі іх настаўнік.
Яны раднёю нават дзесь былі —
«Дзесятая вада на кісялі».
Ды мала зналіся паміж сабой —
Быў шлях у свеце ў кожнага з іх свой.
Пакінуўшы настаўніцтва і вёску,
Ён, Доўнар, потым апынуўся ў войску.
І вось цяпер ізноўку тут, у лесе.
Як свой свайму, руку падаў Алесю.
— Даўно хацеў сустрэць цябе, браток,—
Казаў ён, ведучы Алеся ў бок
Ад зімніка таго — пад маладыя
Сярод алешніку дубкі густыя
На колішняй палянцы. І калі
Яны прыселі на таўстым камлі

Сасны, што бура вывернула, Доўнар
Яму паведаў без прад'мовы доўгай,
Што ён зусім невыпадкова тут
І недарма прысланы ў гэты кут.
Падняць людзей на барацьбу з навалай
Фашысцкай, што зямля яшчэ не знала,
Уратаваць айчыну ад бяды,
Ад рабства, ад палону, ад жуды —
Такая сёння ставіцца задача:
Свабода або смерць — і не іначай!
Ён тут, у гэтых месцах, распачаць
Павінен партызанку — каб не даць
Жыцця фашысту ў нашым родным краі.
Мы самі тут гаспадары.
Хай знае:
Хаця ён сілай нас заняць і змог,
Ды Беларусь усё ж не перамог!..
— Табе, Алесь, заданне ёсць таксама,
І небяспечнае, скажу я прама.
Ды ўсё ж ты справішся, я веру, з ім:
Быць у Дуброве нашым сувязным.
Быць сувязным — а гэта, браце, значыць:
Усё, што немец робіць, чуць і бачыць.
І тут жа нам дакладваць. Ну, а як,
Дамовімся — усё ж ты мой сваяк.
Ну і яшчэ. Зямлю не запускайце —
Як абраблялі, так і абрабляйце.
Зямля — наш грунт. Адно сачыць, каб плён
Яе не трапіў немцу. Тут варон
Лавіць зусім нам нельга, браце. Трэба
З-пад ног у ворага ўсю вырваць глебу.
Алесь дадому ехаў акрылёны:
Ад дня сягонняшняга заручоны
Ўжо з барацьбой вялікай будзе й ён —
Такіх, напэўна ж, не адзін мільён.
У строй змаганцаў стаў Алесь самохаць —
Здавалася, ён адчуваў іх локаць.
Хай небяспечна на шляху такім,
Хай лёгка скласці галаву на ім,
Але другога шляху ён не бачыў,
І жыць Алесь не, не хацеў іначай!

### III

Дні караценлі ўжо. Паблякла сінь
Паміж аблок, што ўсё кудысь ляцелі.
За гумнамі ад холаду трымцелі
Галіны пасінелыя асін.
Часамі вецер знекуль, бестурботнік,
На прыгуменне раптам прылятаў,
Кідаўся між будынкаў, шкуматаў
Страху гумна, заскакваў на дрывотнік
І, закруціўшыся ваўчком — віхор! —
Па-над зямлёй, вясёлы забіяка,
Імчаўся — прэч з дарогі, разявака! —
На чарнапуст сядзібаў, у прастор.
Дзе ён гуляў, хто ведае, той вецер,
Але праз дзень, вярнуўшыся, з нябёс
Ён снегу хмары белыя прынёс,
Рассыпаўшы яго па цэлым свеце.
Зіма...
Снег белізной укрыў раллю,
Густую рунь, іржэўнік неўзараны,
Лугі з ракітнікам, лясы, паляны,
Усю, вятрам адкрытую, зямлю...
У бель снягоў прыбраўшыся — абнова! —
Прыціхла між снягоў нямых Дуброва.
Над хатамі ўставалі з каміноў
Дымы слупамі — як спакон вякоў.
Парыпвалі вароты, сенцаў дзверы,
Ляцеў — з чыйго падворка? — стук сякеры...
Бы й не было вайны, але яна —
Не, не — нідзе не згінула, вайна.
Аб ёй ніяк забыцца не давалі
Назолы-немцы з недалёкіх Галіч.
Там, на паўстанку, быў іх гарнізон,
І пад «апеку» ўзяў Дуброву ён.

*

— У дровы з'езджу,— так сказаў ён Ганне,
Ускінуў цёплы кажушок на плечы

І, холаду пусціўшы праз парог,
У ранак белы дзверы расчыніў.
Аюта ў стайні бы яго й чакала —
Заржала, радая, яму насустрач.
Калі ж, зайшоўшы, ён уздзеў аброць,
Ахвотна ў двор патупала за ім.
І вось па снезе сыпкім нібы самі
Пабеглі лёгка сані за Аютай.
Беразаку ды вольхаў мог Алесь
І ля Пагона наваляць як бач,
Ды ён мінуў Пагон, мінуў Альхоўку
І скіраваў кабылку аж пад Хімры —
Лес, што казённым звалі ў нас яшчэ,
Бясконцы лес мяшаны. Ён цяпер
Маўчаў, закіданы найчыстым снегам.
І толькі дзяцел недзе нетаропка
Абстукваў сухадрэвіну ды з хвой,
Што паўз дарогу сталі з двух бакоў,—
Трашчала зрэдчас шустрая сарока,
Па голлі скачучы: так ёй цікава
Было зірнуць, хто ўздумаў завітаць
У гэта царства белае яе,
Ды мо хоць трошкі папужаць. Алесь Ж а
І не зважаў на той сарочы строкат,
Далей у лес кабылку паганяў —
Быў, балазе, шчэ не глыбокі снег.
Ля Луга ў хмызе прыпыніў Аюту,
Да хвоі навязаў, ахапак сена,
З саней узяўшы, кінуў перад ёй
(Яна адразу ж занялася ім)
І з тапаром пайшоў сабе выглядваць
Бярэзіну гладчэйшую. А доўга
Шукаць яму не трэба тут было:
Унь колькі скрозь іх, харашунь-бяроз!
Ды перш чым секчы з іх адну, пастукаў
Ён па камлі абухам з усей сілы
Аж здрыганулася бярэзіна,
Сыпнуўшы снегу за каўнер з галля.
Счакаўшы, зноў Алесь вось так пастукаў,
А потым, у далоні папляваўшы,
Пайшоў гасіць па дрэве тапаром —

Аж трэскі паляцелі наўкруга.

— То мо пара суняцца ўжо! — Няспешна
Алесь на голас гэты распраміўся,
Сякеру апусціўшы: ля яго
Стаяў з усмешкай Доўнар — як жа ён
Так падышоў нячутна? — Ну, дзень добры! —
Паціснуў ён руку Алесю моцна.
Прыселі на бярозу, што спусціў
Алесь быў толькі што, і павялі
Гаворку дзелавую пра заданне,
Якое дадзена было Алесю:
Разведаць пра чыгунку ўсё, пра рух
Ля Галіч цягнікоў, ахову іх.
Алесь усё, што ўведаць удалося,
Тут выклаў Доўнару — ва ўсіх дэталях.
Давольны Доўнар быў:
— Ты нам, браток,
Усю як ёсць карціну праясніў...
Цяпер папробуем даць фрыцам перцу —
Хай знаюць, што й на іх ёсць тут управа.
І людзі нашы ведаюць няхай,
Што не скарылася прышэльцу Беларусь...

Пад палазамі снег парыпваў хрусткі,—
Хоць цяжкі воз быў, ды ішла Аюта
І йшла, натужваючыся. Алесь,
Накінуўшы на дровы лейцы, збоч
Ступаў, пры возе. Дзень быў ясны, з сонцам.
Яно між дрэў ішло,— то прападала
За хвоямі, то выплывала зноў,
Свяціла хораша ў беразаку.
Каля Альхоўкі, на дарозе проста,
Алесь раптоўна ўбачыў чалавека.
У шапцы чорнай — форменка, ці што? —
У світцы, за папругаю тапор.
Стаяў — відаць, чакаючы Алеся:
Хто ж мог яшчэ быць у глухім бязмоўі?
і тут пазнаў Алесь: ды гэта ж ён,
Дуброўскі стараста — Стахноўскі. Не, Алесь
З ім не хацеў бы ўсё ж тут сустракацца...

Ды ці ж яго тут абмінеш, аб'едзеш?

Стахноўскі! Ды адно яго імя
У дрыжыкі кідала ў вёсцы ўсіх.
Служыў ён лесніком раней. Пануры,
Заўсёды злы, са сцятымі губамі.
Глядзеў звычайна спадылба ён. І ніхто
Не бачыў, каб смяяўся ён калі.
І як ён у сям'і жыў? Ён жа бацькам
Быў пяцярых дзяцей — дзяўчынак, хлопца.
У трыццаць сёмым быў занятак ён
Займеў — страчыць паклёпы на людзей.
Хто перайшоў калі яму дарогу,
Не гэтак глянуў, зачапіў дзе словам —
Усіх, прышыўшы нейкі свой ярлык,
Рабіў народа ворагамі ён.
Сапхнуў быў нават старшыню калгаса —
Гаспадара, якіх нямнога знойдзеш,—
І сам на месца тое заступіў:
Камандаваць хацелася людзьмі.
А немцы вось прыйшлі, Стахноўскі неяк
Падпоўз, як вуж той, і да іх таксама,
Прымазаўся, выслужвацца пачаў —
Што ж можна ад яго чакаць цяпер?

— Дык гэта ты? Далёка так — у дровы?
Вядома, тыя дровы — толькі прыклеп.
Напраўду ж — ездзіў ты да партызан!
Маленькую нараду правялі...
Ага, ты ўвесь збялеў! Ну, ну — не бойся!
Не выдам я — хай будзе шыта-крыта!
— Што ты вярзеш, Стахноўскі? Пра якіх
Ты кажаш партызан? Што за яны?
— Ну, не прыкідвайся! Кажу пра тых,
Што ў Хімрах!
— Мо і бачыў ты, а я
Пра іх во першы раз, дальбог жа, чую!
Ты на мяне не ўзводзь дарэмна гэта...
— Ну, я пажартаваў...— Тут першы раз
Алесь усмешку ўбачыў на яго
Скуластым твары. Толькі як Стахноўскі

Пайшоў далей пружыністай паходкай,
Адчуў Алесь, як раптам па спіне
Пабеглі дрыжыкі: няўжо ж такі
Пранюхаў праўда? Не, ён так купляе
Яго, Алеся, толькі. Быць не можа,
Каб што ён бачыў. Ну, а ўсё ж, а ўсё ж...
І гэта «ўсё ж» было — што ў сэрца нож.

*

Пра клопат бацькі, пра трывогі тыя
Што ведаць мы тады маглі, малыя?
Адно вядома нам было ў той час:
Раз тата ёсць, бяды не будзе ў нас.

Нам добра так гулялася зімою,
Што свет укрыла чыстай белізною.
Яна нас звала з санкамі — у снег,
У безліч іскраў сонечных, у смех.
На прыгуменні — там такія гурбы! —
Былі ўсе нашы — да змяркання — гульбы.
А ў зімнія даўгія вечары
Было і ў хаце добра дзетвары.
Цясніліся мы болей пры камінку,
Дзе смалякі гарэлі безупынку.
Падкладваць іх, каб там агонь не згас —
Была работа гэтакая ў нас.
Глядзець тады нам так было цікава,
Як полымя сухі смаляк той жвава
Вясёлай плоймай яркіх языкоў
Лізала, прагнае, з усіх бакоў.
Ад іх, тых языкоў, па хаце цені
Скакалі, кідаліся, як хацелі.
Каля камінка — гонкі спіцаў лёт —
Гуў мацерын вясёлы калаўрот.
Бліжэй к агню падсунуўшыся, маці
(Цень ад яе пагойдаўся па хаце)
У пальцы брала лёгкі касмылёк
Кудзелі з прасніцы, і хутка цёк,
Расцягваючыся ўвачавідкі,
З іх ручаёк найтоненечкі ніткі.

Сачылі доўга мы за ніткай той —
Здавалася, яна сама сабой
Раўнютка бегла, весела, з ахвотай
З рук матчыных да шпулі калаўрота...

Сядзеў і бацька блізка ля стала —
Ці досыць там было яму святла?
Ён збрую ладзіў.
З шылам, спічакамі
Над ёй карпеў не раз так вечарамі.
Ён, бацька — прызнаваўся ў гэтым мне,—
Ўжо рыхтаваўся к будучай вясне.

Хай за акном мароз, няхай завея
(Унь аб сцяну яе так хвошчуць шлеі!),
Хай свет занесла белай кумільгой,
Увесь ён там быў, у вясне сваёй.
Ішоў у поле выстылае ў мроях —
Араў, скародзіў, сеяў яравое.
Ён што ні дзень у думках там бываў,
Дзе сеяць што, даўно распланаваў...
Тут, на Сядзібах, пад ляском, на грудзе
У бацькі жыта налівацца будзе.
У Кадаўбах свой вузкі шнур-загон
Прысадзістым ячменем зойме ён.
Каля Станка, на чарназёме, буйна
Кусціцца будзе — рад пры радзе — бульба.
У Самшыне ж далёкім, між дубоў
(Прыстанак даўні дзікіх галубоў)
Мяцёлкамі пад аблачынак ватай
Авёс засерабрыцца сіваваты.
А грэчку на Раз'ездзе, за ляском,
На той няўдобіцы — пясок пяском —
Пасее бацька:
Як пагода ўгодзіць,
То грэчка й на пясочку тым уродзіць.
Хай будзе і куртатай на пагляд —
Ды кожны кусцік добра дасць зярнят!
А на ўрадлівай жа зямлі, бывае,
Хоць вырасце, ды без зярнят — збуяе.
У Качарзе ж у бацькі будзе лён —

Як там галоўкамі зазвоніць ён!
За ўрочышчам «Дзе дуб з бярозай звіўся»
(Там я і сёння, пэўна б, заблудзіўся)
На пасеках, на галінцы лясной
Устане проса сценкаю густой...
О светлыя ратая думы-сны!
О хлебароба велічныя дзеі!
Жывіце ж вечна ў свеце, хлебасеі,
Пракляты будзьце, сейбіты вайны!

**IV**

Кульгавы Юзік, хоць быў позны час,
Не увайшоў, а ўляцеў да нас:
— Ці чуў, Алесь, хоць навіну! Ля Галіч
Цягнік уночы сёння падарвалі!
Паўнюткі немцаў быў той эталон —
І на хаду ўвесь разляцеўся ён!
Што, кажуць, нарабілася там кашы!
То партызаны!.. Пачынаюць нашы!..
Ну, а назаўтра маці, дзверы ў сенцах
Не зачыніўшы, уляцела:
— Немцы!
У голасе, ў акругленых вачах
Такі перапалох, такі быў жах,
Што мы, дзятва (якраз гулялі доле),
Хутчэй на печ кульнуліся міжволі.
А бацька (на калодцы ён тады
Штось майстраваў-мастачыў, як заўжды),
Як і не чуў — спакойны быў, здаецца:
Ну дзе ж яму было у час той дзецца?
Прышэльцы ж, што вось гэтак нечакана
З'явілся (было ж зусім шчэ рана),
Ішлі ўжо вуліцай. І — жах! — сюды
Два скіравалі. (Куры — хто куды!)
У шынялях, у шапках з казыркамі.
К варотцам падышлі. Іх нагцакамі
Умомант высадзіўшы, па двары
Пайшлі ўразвалку. Бы гаспадары.
І вось загрукаталі ў дзверы. Маці —
Што зробіш тут? — пабегла адчыняць ім.

Ледзь прыгінаючыся у дзвярах,
Ступілі ў хату. Нібы на цвіках,
На печы, сцішыўшыся, мы сядзелі,
Малыя, і з-за коміна глядзелі,
Чакаючы, што ж гэта будзе тут!
А немцы, аглядзеўшы кожны кут,
На нас пагляды затрымаўшы штосьці,
Да бацькі ўжо, няпрошаныя госці,
Загергетаўшы нешта, падышлі
І апранацца — знак яму далі.

Наш плач быў гэтакі пераканаўчы!
Ды не, нічога ён не перайначыў.
Забралі бацьку, павялі, як бач,
Пад матчын енк, пад наш дзіцячы плач.

Праз вокны бачылі мы: і з Другіх
Двароў выводзілі мужчын і ўсіх
Па вуліцы вялі.
За вёску недзе!
Былі з таго канца тут і суседзі.
Вунь, бачыў я, ішоў Каваль — здавён
Так звалі ў нас Дразда, бо й праўда ён
Быў кавалём: нялёгкі той занятак
Яму ад бацькі перайшоў у спадак
(А той, казалі, зноў-такі яго
У даўні час ад бацькі ўзяў свайго...).

Да Каваля мы ў кузню, што стаяла
На ўскрайку вёскі, пры ляску, бывала,
Усёй гурмой заглядвалі не раз,
І ён не праганяў ніколі нас.
Нам гэтак паглядзець было цікава,
Як прэнт агняны на кавадла жвава
Нёс у цісках і молатам цяжкім
З размаху гахаў ён па прэнце тым,
А з-пад яго, што вогненныя восы,
Па кузні ўсёй ляцелі іскры ўроссып.
І ў іскрах тых Каваль, што біў наўзмах,
Быў нам у чорным фартуху, як маг.

Маўклівы быў ён нейкі, рэдка слова
Мы чулі ад яго, але талкова
Усё рабіў.
Даваў ён часцяком
І нам па прэнце стукнуць малатком,
Раздзьмуць яму агонь у горне мехам
Альбо паднесці жалязяку спехам...
За Кавалём у одуме цяжкім
Ступаў вунь дзядзька Чорны; нам, малым
Быў ён цікавы тым, што ведаў многа
Усякіх баек — імі, быццам з рога,
Ён сыпаў перад намі кожны раз,
Калі страчаў хоць каго-небудзь з нас.
Любіў расказваць асабліва дзядзька
Аб мікалаеўскай вайне — як хвацка
Ён біўся з немцамі,
Як часта ён
Іх браў, ваяк Вільгельма, у палон.
Было: пачне рабіць што, ды якога
Угледзіць слухача, хоць і малога,
Кідае ўсё, на дол садзіцца дзе
І зноў пра даўні бой расказ вядзе,
Аж покуль жонка з трапкачом, Дарота,
З вайны не верне дзядзьку да работы...

Мільгнуў і Асановіч ля вакон —
Схудалы, тонкі.
Яшчэ летам ён
Прыйшоў з палону — пад Бабруйскам недзе
Яго за дротам з нашых нехта ўгледзеў
І жонцы расказаў.
Яна тады
І выбавіла ўсё ж яго з бяды!
Быў ён як цень, ледзь дух трымаўся ў целе,
Ды акрыяў вось дома, у пасцелі...

Вялі за вёску і Галавача —
З таго канца — музыку-скрыпача.
Я помню міг, як, сеўшы на калодку,
Ён скрыпку браў, прыладжваў к падбародку
І, да яе схіляючыся вухам,

Смыком кранаўся струн няўлоўным рухам.
І ўжо — адкуль, не ведаю, мо з высяў? —
Такія гукі дзіўныя ліліся,
Мяне ў салодкі беручы палон:
Ці ява гэта ўсё было, ці сон?..
Цяпер ішоў пануры ён, у світцы
(Ці можа граць яшчэ хто так на скрыпцы?..),
Ішоў пад дуламі вінтовак. Побач з ім
Ступаў падлетак — сын яго — Максім...

Як аднаго, вялі мужчын-вяскоўцаў,
І больш за ўсё — такіх во юных хлопцаў.

*

І іх паставілі пры лесе ў рад —
Паддзёўкі, кажухі, насовы, світы...
Як звеку, сонца — хто яму не рад? —
Ішло па небе ўласнаю арбітай.
Сінічка недзе цінькала ў сасне,
Пастукваў звычна дзяцел за спіною.
І так іскрыўся першародны снег
Навокал нечапанай белізною!..
Няўжо канец?
Няўжо астатні раз
Яны глядзяць на свет во гэты белы?
Няўжо вунь тое ў хмарках сонца ўраз
Чужацкія навек патушаць стрэлы?
Так, дачакаліся сваёй пары!
Вось як цішком адседжвацца па хатах!
Цяпер усіх — што скажаш немчуры? —
Уміг прыстрэляць тут, як кацянят тых!..
Як упусцілі ў дом свой чужака?
Як аддалі забойцу кола ўлады?
Вяршыць свой суд разбойная рука —
Ці ж ад яе чакаць цяпер спагады?
Перад вачмі ў Алеся праплыло
За міг жыццё, якое тут во стрэціў...
Ды ці ж яно яшчэ ў яго было?
Ён жыць збіраўся яшчэ толькі ў свеце.
Хацеў ён поле пры ляску араць,

Раўняць, з сяўнёй ісці у час вясенні
І прад сабой, як веер, распускаць
Насустрач сонцу золата насення.
Ён спаў і бачыў толькі свой надзел,
Што тут, пад небам, доля даравала,
Пра хлеб ён думаў, хлебароб, штодзень...
Ды гэтага о як было ўсё ж мала!
Як можна ў век грымотны ў бегу дзён
У шкарлупіне ўласнай зачыняцца?
На нейчы розум — хай наймудры ён —
З нядбаласцю дзіцячай пакладацца?
Даверыць лес камусь?
Не дбаць аб ім?
Дайсці, каб іншы хтось рукой чужацкай
Тваёю доляю, жыццём тваім,
Як толькі захацеў, вярцеў, бы цацкай?..
Тым часам немцы — зразумець як іх? —
Намер свой страшны адмянілі ўміг,
Дамоў усім вяртацца загадалі —
Жыццё ізноўку людзям даравалі?
Так, даравалі!
Распусцілі ўсіх
Па катухах — сядзіце ды чакайце,
Пакуль вас зноў не выпаруць: канчайце
Вылежвацца па закутках глухіх!
Вы ўласнасць фюрэра, яго вы рэчы,
І ён здалее выкарыстаць вас —
Як затычку якую (будзе час!)
Ці гліну, што спатрэбіцца дарэчы!
Прыгорбленыя, вуліцай ішлі
Маўчком вяскоўцы з выгану: няслі
Дахаты думак ношы найцяжкія.
І к аднаму усе іх думкі тыя
Сыходзіліся: час настаў рашаць,
Ці глінай быць ім (каб мог кожны мяць),
Ці зброю ў рукі браць (дрыжаць даволі!)
І стаць гаспадарамі ўласнай долі,
Свой лёс у даланях сваіх трымаць.
1979—1985

## ДОМА

### I

З бярозы ліст ляціць
У белы свет, як позва.
Я зноў душу лячыць
Прыйшоў да гэтых пожняў.

Ні сходаў, ні хлусні,
Ні мітусні, ні ліха.
Плывуць, бы лодкі, дні
Мае пад небам ціха.

Зноў у руках — каса,
Зноў, як калісь, ля Ставу
У вал, пакуль раса,
Сцялю, спялю атаву.

Прастор. Зары клінок
Між хмар.
У барве ўзлесак.
Паслаўся туманок
Ля ног асін, бялесы.

Бацькоўскі свет... Дзядоў
Зямля...
Хай мне даруе
Чытач,
Што сёння зноў
Яе ў свой верш цягну я —
Мой лёс, мой боль, мой сон,
Забітых вёснаў рэха...

*

Тут сонца дні здавён
Віло —
Зямлі на ўцеху.

Між грабаў ды рабін —

Не, ў цемры свет не згіне! —
Усход, нібы рубін,
Гарэў
Пад птушак гімны.

А спагадзя крыху —
Ты чуў той гуд над долам? —
Спяшалі
На круху —
Ізноў іх свята —
Пчолы...

Сюды, у ціхі свет
Бяроз ляных і шчаўя,—
Было — ў лапцях мой дзед
Прыйшоў калісь
Па шчасце.

Дрымотны дзікі кут...
Глухіх карчэўяў тайны...
Адвеку з небам тут
Лес гаманіў бяскрайны.

Ён тут людской ступні
Не знаў ніколі нават.
Сядзіба камарні
Густой.
Ваўкоў дзяржава.

І вось на лес
Сякер
Упаў тут стук нярэдкі.
І скалануўся верх
У хвоі-двухсотлеткі.

Змятаючы суччо —
Прэч, хто там у ламаччы! —
У чарнату карчоў
Ляцелі хвоі-мачты.

Адвечны каравул

Заканчвалі:
Камлялі —
Аб долі,
І доўга гул
Ішоў-гуляў гаямі.

І хутка
(Тут піла
Як след пашчыравала!)
Лясны гушчар
Страла
Дарогі
Пранізала.

Стралой раўнюткай той
Па каляях сталёвых
Паплыў у свет ракой
Стозвонны лес мясцовы...

І дзед мой, хлебароб —
На гора ці на ўцеху? —
Прыдбаў той пацяроб,
Увесь у пнях, бы ў плехах.

Усё ж — «зямля»!
Аб ёй
Ён толькі й сніў,
Занята
Ёй трызніў, той зямлёй,
Бяздомнік-арандатар.

Службовец панскі, раб
З цяжкім ярмом на шыі,
Даўно ён марыў,
З лап
Вяльможных
Уцячы як.

Ну й што ж, што навакол
Тут непралазь глухая,
У бураломе дол

Ды заедзь найліхая,
Яму было відно
Скрозь пні ды хмыз той стылы
Ўжо залатое дно
І ў сонцы —
Бераг мілы.

*

Як карчавалі пні,
Як спіны ў поце гнулі
Дзяды,
Я ў нашы дні
Не раз чуў ад бабулі.

У доказ мукаў тых
Яна —
Глядзіце, ўнукі! —
Паказвала
Ў крутых
Рубцах мазольных
Рукі.

Зямлю, што дзед прыдбаў,
Што ў пальцах перамацаў,
Ён дзецям перадаў —
Шануйце, нібы маці!..

**2**

Я — дома. Устаю
Ізноў пад голас пеўняў.
Ізноў дасхочу п'ю
Настоі раніц спеўных.

Тут воля, тут мае
Найсветлыя прычалы.
Увосень высь пяе
Жураўлімі ключамі.

Тут, дзе туман з лагоў,

У нашай ціхай хаце
Пад лікамі багоў
Мяне радзіла маці.

Гула ў равах вясна,
Грачыным грала граем...
Была ў той час яна
Такая маладая!

Яе быў свет наўкол.
На ўгрэве гэтак сон цвіў!
Тут з краскамі ў прыпол
Яна збірала сонца.

Дзень, нібы горан, гас
Між стрэх і сліў купчастых.
Тут у высокі час
Сваё спаткала шчасце...

*

Ён, бацька мой —
Быў сын
Зямлі рабіннай гэтай,
Дажджоў касых, расы,
Жытоў і яснацвету.

У спадчыну, як дар,
Надзел узяў ён дзедаў.
Тут змалку жніва сквар
І цвердзь касільна
Зведаў.

Тут рукі аж гулі,
Калі ішоў ён з луга.
Прывычныя былі
Яны да цэпа й плуга.

...Ён сёння ўстаў цямком —
Вылежвацца даволі!
Ранюткім жаўруком

Яго ўжо звала поле.

Пад сівізной нябёс
(Дзе ён, вяшчун вясёлы?)
У прыцемку
Калёс
Затахкацелі колы.

Пад лесам, дзе між хвой
Дубок выглядваў зграбны,
Зраўнянаю раллёй
Чарнеў палетак вабна.

Мой бацька уздзяваў —
Паважна так —
Сявеньку
І на раллю ступаў:
Час сеяць памаленьку.

І вось
Хадзе у такт
З рукі —
Прымай жа, ніва,—
Рой залаты зярнят
Ляцеў немітусліва.

*

Ды толькі ў свеце час
Быў не для працы ціхай.
Сваю сяўбу якраз
Ужо ўсчынала ліха.

Не жытам, не аўсом,
Не ячмянём, не просам —
Жалезам ды свінцом
Зямлю ўсявала ўдосталь.

Ад д'ябальскай сяўбы
Ў палях,
На жвіры плёсаў

Раслі, нібы грыбы,
Узрывы да нябёсаў...

Ад любых стрэх,
Ад ліп,
Ад араллі,
Ад пашаў,
Нібыта з дрэва ліст,
Гвалтоўна адарваўшы,

У свой шалёны вір
Вайна
Пад свіст завеяў
Навекі — не заві! —
Ўкруціла
Хлебасея...

### 3

За вёску, без сцяжын,
Праз луг, туману поўны,
Далёкі успамін
Мяне павёў у поле.

Во той дубок, той лес —
Нахмураны, маўклівы,
Во — той? — наперарэз
Ляціць каршук лянівы.

А во і бацькаў груд!
След каляі калёснай...
Яго, ратая, тут
І леты ўсе, і вёсны.

Зямлю — ці золь, ці дождж
Араў сваёй парой ён.
Упоперак і ўдоўж
Абхаджваў з бараною.

Апеты быў з вясны
Ён птушак галасамі.

Тут бацькавыя сны
Ўставалі каласамі...

І вось — недаараў
Палетак, недасеяў.
Самога дол забраў
Яго, душу адвеяў...

Цяпер сама вазьмі
Плуг, удава, абеируч...
Найшчодрымі слязьмі
Паліт ён, груд, без меры!..

Той паваенны час
Мне не забыць ніколі,
Як на сабе не раз
Аралі ўдовы поле.

За плуг, такі цяжкі,
Мяне — кіруй, хлапчына! —
Знямоглыя жанкі
Стаўлялі — як мужчыну.

А самі, пот з вачэй
Змахнуўшы, сцёршы з твараў,
Прыладжалі лаўчэй
К грудзям жардзіну-барак.

— Ну, паганяй! — так мне,
Жартуючы, казалі.
І ўжо — штораз мацней —
Пастромкі напіналі.

Хоць я ледзь дастаываў
Яшчэ да плуга ў час той,
Хоць моцна прыставаў
І з ног збіваўся часта,

Ды плуг, як ні пацеў,
Не выпускаў усё-ткі —
Так памагчы хацеў

Жанкам засеяць соткі.

Маёй падмогі той
Было не шмат, вядома.
— Бяжы гуляй з дзятвой,—
У рэшце рэшт, малому,

Казалі мне жанкі —
Ласкава, са спагадай,
І бег я напраслкі
Гуляць з сябрамі, рады.

Я цешыўся гульнёй —
На вуліцы і ў хаце,
Хоць знаў, якой цаной
Хлеб здабывала маці.

Заўсёды, як удоў
Я долю ўспамінаю.
Хоць шмат прайшло гадоў,
Ізноў сябе караю,

Што неяк памагчы
Я ім усё ж не здолеў,
Не змог — хоць як, хоць чым
Я іх аблегчыць долю...

*

Што ж сёння бачу тут?
Дзе поле? Як жа гэта?
Удзірванеў той груд!
Пустуе сярод лета!

Мо рукі не дайшлі?
Ці ўжо ён нам не трэба?
Мо лішнія палі?
Наеліся ўжо хлеба?

Не, хоць яго й стае
Ва ўсіх нас — еж уволю,

Ды толькі на стале
Не лішні хлеб ніколі.

Дык хто ж палетак мог
Аддаць сіўцам нязводным?
Чаму ж ён сёння лёг
Аблогаю бясплоднай?

Пра гэта ў іншы час
Спытаў я ў брыгадзіра.
— Рук не стае,— ў адказ
Пачуў.— І ўсё тут дзіва!

Рук не хапае, рук...
Іх, хлебаробаў рукі,
Шукайце там, дзе брук,
Дзе джаза перагукі...

Зямля... Чыя ж віна,
Што мачыхай сягоння
Нам сталася яна,
Што сірацеюць гоні?

Як так, што ў час цяжкі
Зямлю пад крыкі кані
Узорвалі жанкі —
Ўсю! — голымі рукамі,

А сёння й з талакой
Падшэфнаю — ці ж гожа?
Пры тэхніцы такой
Мы абрабіць не можам?

**4**

Ляціць з бярозы ліст...
Як пацішэла ў свеце!
Зрыжэлы, нібы ліс,
Лясок з-за шляху свеціць.

Усюды — лісця рух...

Агонь свой восень сее...
...Нас з маткаю на луг
Назвала сёння сена.

Скрозь у пракосах лог.
А во й мае, пры грабе.
Ля іх — спрыяй нам Бог —
З плячэй здымаем граблі.

Хвіліну пастаяць
Нам пад смугой нябёсаў.
І вось — пайшлі гуляць
Грабелькі па пакосах.

Адказны сена час!
Адно — за лавай лаву —
Качай тут ды качай
Шархоткую атаву...

Свой дзённы круг прайшло
Ужо сонца над абшарам —
Чыёсь у вёсцы шкло
Гарыць ім, нібы жарам.

Ужо вунь — след у след —
Ідуць каровы з луга.
За імі наш сусед —
Іван — пляцецца з пугай.

Але, хоць і цячэ
З нас пот салоны градам,
Па лузе ўсё яшчэ
Шчыруюць нашы граблі...

*

Сялянскай працы свет...
Пад небам, дзе аблокі,
Жыў ёю ў змене лет
Мой продак найдалёкі.

Красу мазольных рук
Мы славілі ўсё ж мала —
Ад іх зямля наўкруг
Святляна красавала.

Ці будзе далей так?
Мо я апошні з роду,
Хто знаў той працы смак,
Утомы асалоду.

Хто чуў душой, як рунь
У рост ідзе наўкола,
Як з росамі зару
П'е за сядзібай колас?..

Цяпер і я даўно
Ад поля ўсё ж далёка.
Тут, у сябе, адно
Бываю — так! — наскокам...

Што ж, не сунімеш час!
Ды хлынуць дум лавіны:
Хто ж прыйдзе пасля нас
У светлы край дзяцінны?

Ці скажа хто «люблю»
Яму?
У часу плыні
Мы на каго зямлю
Дзядоў,
Наш свет
Пакінем?
1980—1986

**ЗМЕСТ**

Рыгор Барадулін. «Каб араллёю пахлі аблокі»

**ВЕРШЫ**

Ліпень
Лесавы хмель
Журавы
«Нават дзень, скажы, пражыць мне як...»
Золата Джэтыгары ...
Палатка
Двое ў стэпе
Хлеб
Такія сэрцы ў нас
«Табе, сяброўка...»
«Павуціны беленькая нітка...»
Казка
Мяцеліца
Лодачкі
«Вы, пэўна, бачылі ў верасні...»
Пціч
«Не сцерці мне з памяці дзень той...»
Сонца
«У пору бусловых прылётаў...»
Мёд і яд
«Не раз я хадзіў тут на золку, да дня...»
Пачатак дарогі
Перлы роднай зямлі
«На той зямлі, дзе ў зорны час...»
Чорная скіба
«Ужо і зіма — убок...»
«Сёння спаць не пайду, не пайду...»
Чатыры вятры
«Ёсць на свеце краіна...»
«Усё мінаецца, мяняецца...»
Гімн чарпакам
Пешкі
«Я праўду шукаў...» .
«Калі над горадам усходжваецца непагода...»
Зямлі патрэбны паэты
Цацерукова мова
Сабакі
«Мова зямлі маёй! Мова бацькаўшчыны!..»
«Зноў вярнуўся я ў бацькаў свет палявы...»

Сцежкі маленства
Я з той краіны
«Мы б'ёмся над рыфмай...»
Думкі
«Замятае, лісцем замятае...»
Жураўліныя ягады
«Як анямеўшы...»
«Аднекуль з-пад воблачка...»
«Скрозь вуліц і двароў хістрасспляценні...»
«Далека ад азяродаў...»
Герцэн
Каліноўскі — апошняе слова
«Так кожнаму наканавала...»
«Усё паўтараецца з веку ў век...»
Мурашка
«Мае землякі...»
«Былі тады — ноч...»
Закон вады
«У мяне ёсць мара глыбінная...»
Я прыйшоў да вас
«Ты пакрывіў душой...»
«Ідзём мы проста...»
Інтэрнат
На пенсію
Хадыка
Песня партызана
«Згубіў цябе. Куды ж пайсці?..»
Санцаход
Лісце
Ода одам
«Вось ізноў — праз безліч гадоў!..»
Першы крык
Сіта
«Бываем мы часам...»
Пра майстэрства
Саксаул
Дзядзька Адам
«Гапон» В. Дуніна-Марцінкевіча ў Мінскай кнігарні, 1855 год
Дзекабрысты
«І рыбе ёсць што сказаць, і рыба...»
«Не, не кажыце мне — вайна...»
«Ты мне казала...»
Легенда пра Вулляну
Дарогі
«Памёр чалавек...»

«Пакуль мае сэрца замкнёна было…»
«Рассыпала ноч алмазы…»
«І дабрата, і прыгажосць…»
«Хто месяца жарыну…»
Казімір Лышчынскі
«Каташкі на вольхах, каташкі…»
«Ізноў я прачынаюся на сене…»
Рыжкі
Васількі
«Зграбаем сена…»
«Жыву каля рэха…»
Балада пра маці
«На тое ж у нас…»
«О дай мне, доля…»
«Лодку долі сваей…»
«Калі на голаў чарада няўдач…»
«Зноў — сівец, і хвойкі, і дымок…»
«На падмурку хлусні…»
«Няхай табе даўно за сорак…»
Старадарожскі раён
Францыск, Скарынін сын
Кветкі Чарнышэўскаму
Пра старую Адэлю
Іслач
«Гляджу…»
«Радзіма…»
Яцвягі
«Ці ж ведаў хлапчук…»
Трасе, трасе планету праз гады…»
«Зары запозненай каснік...»
«Палессе…»
«Не шкадуйце добрых слоў жанчыне…»
«Жыцця нястрымны ход…»
«А ўсё-такі Розум...»
«Такую падзею…»
Спадчына
«З вёскі далёкай лясной...»
Жывая памяць
«Мы ўжо не аром, гараджане…»
Каменныя бабы
Перадзім'е
Пачатак года (З календара хлебароба)
«І мне б заблудзіцца…»
«Ледзь толькі раніца…»
«Шкадую тых, хто не бачыў…»

«Баюся тых, хто не знае...»
Я сею жыта
«Як сон, азярко далёкае…»
«Зноў забралі цябе шляхі…»
У Ялце
Мост дружбы
Спартак
Прывыкаем
Дамоклаў меч
«Мы смяёмся і плачам…»
«Не запірайце душу на завалы…»
«Ну што ж, хлусі, ну што ж, брашы…»
Віна (Расказ равесніка)
Сцежка
Зялёная Дуброва
«А вецер зноў раўкамі…»
«Мяняецца ўсё ў прыродзе…»
«Дзень прапаў у мяне…»
«Так проста, думаеш, браток...»
Хакім (Маналог вернападданых)
З вякоў
«Мне снілася: памяць згубіў я!..»
Клён
«Зноў свята ў мяне…»
Агонь у каміне Дома літаратара
Туганавічы
«Я для цябе нішто — цяпер я знаю…»
«У рамках дзеючых структур»
Запарожцы
Пагоня

**ПАЭМЫ**

Хат вячысты дар
Дзе дуб з бярозай звіўся
Дома

Цвірка К.

Бацькаў свет палявы: Выбр. вершы і паэмы / Прадм. Р. Барадуліна.— Мн.: Маст. літ., 1994.— 286 с., [1] л. партр.

ISBN 5-340-0135425.

У кнізе Кастуся Цвіркі (нар. у 1934 г.) чытач знойдзе нямала прачулых радкоў пра светлае пачуццё кахання, пра зорныя парывы маладосці, пра тое, што хвалюе неспакойнага, неабыякавага чалавека. Апрача вершаў у кнігу ўвайшлі паэмы «Хат вячысты дар», «Дзе дуб з бярозай звіўся» і «Дома».

ББК 84 ( 4 Беи ) 6

*Літаратурна-мастацкае выданне*

ЦВІРКА КАСТУСЬ
(Канстанцін Аляксеевіч)
БАЦЬКАЎ СВЕТ ПАЛЯВЫ

Выбраныя вершы і паэмы

Рэдактар Г. В. Роліч
Мастак Н. У. Сустава
Мастацкі рэдактар А. І. Дрозд
Тэхнічны рэдактар Г. П. Тарасевіч
Карэктар А. Т. Глушчанка

Здадзена ў набор 17.06.93. Падп. да друку 11.07.94. Фармат 84X108 1/32. Папера друк. № 1. Гарнітура тып Таймс. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 15,12+0,11 укл. Ум. фарб.-адб. 15,28. Ул.-выд. арк. 14,52. Тыраж 1500 экз. Зак. 366.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 3. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя. Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.